КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 21 (1251) 21 мая 2016 г.

Музейная восень — у Магілёве

Міністр культуры краіны Барыс Святлоў падпісаў загад аб правядзенні III Нацыянальнага форуму "Музеі Беларусі". Зладзіць маштабную музейную акцыю запланавана ў Магілёве з 30 верасня па 2 кастрычніка 2016-га.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Асноўнымі мэтамі Нацыянальнага форуму, які ладзіцца ў Беларусі раз на два гады, з'яўляюцца адраджэнне, развіццё ды папулярызацыя традыцый і дасягненняў нацыянальнай і сусветнай культуры, далучэнне да яе шырокіх слаёў грамадства, паказ і папулярызацыя дзейнасці музеяў, вопыту культурна-асветніцкай работы, павышэнне прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў форуму, а таксама развіццё і ўмацаванне міжнародных культурных сувязяў.

У Магілёве адбудуцца прэзентацыі экспазіцый форуму, конкурсы сярод музеяў, навукова-практычныя семінары, "круглыя сталы" ды іншыя акцыі. Нагадаем, у мінулым форуме, што прайшоў у верасні 2014-га ў Гомелі, прынялі ўдзел каля 100 музеяў Беларусі, якія прадставілі на імпрэзе больш за 150 праектаў.

Галоўную інтрыгу створыць конкурс, па выніках якога вызначацца лепшыя ўстановы краіны па намінацыях: "За лепшае прадстаўленне музея на экспазіцыі форуму", "За навацыі ў музейнай дзейнасці", "За лепшы музейны праект", "За лепшую культурна-адукацыйную праграму" і "За лепшае музейнае выданне". Пераможцы ў кожнай з намінацый будуць узнагароджаны дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў і грашовымі прэміямі: за першае месца — 50 базавых велічынь, за другое месца — 40 базавых велічынь, за трэцяе месца — 30. Для ўдзелу патрэбна да 1 верасня накіраваць у Міністэрства культуры заяўку з пазнакай: "На конкурс". У заяўцы ўказваецца намінацыя, у якой музей жадае прымаць удзел, бягучы (разліковы) рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў (калі такі маецца), адрас, тэлефон, прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку кіраўніка музея-ўдзельніка.

Да заяўкі прыкладаюцца матэрыялы: канцэпцыі, творчыя праекты, праграмы, відэа- і фотаматэрыялы, навуковыя публікацыі, рэцэнзіі, водгукі ды іншыя матэрыялы, неабходныя для прэзентацыі ў намінацыі. Конкурсныя матэрыялы прадстаўляюцца на беларускай або рускай мове ў запячатаным выглядзе. Пры ўдзеле ў некалькіх намінацыях конкурсныя матэрыялы падаюцца па кожнай намінацыі асобна. Варта зазначыць, што матэрыялы прадстаўляюцца па выніках дзейнасці ўдзельнікаў за два гады, што папярэднічаюць даце пачатку конкурсу.

На сёння зацверджаны склад аргкамітэта III Нацыянальнага форуму "Музеі Беларусі". У яго ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі, супрацоўнікі ўпраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў краіны, кіраўнікі некаторых буйных музеяў ды іншыя прадстаўнічыя асобы.

НАШЫ АБРАЗЫ Ў ВАТЫКАНЕ

Учора і сёння — афіцыйны візіт Кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Італію. Сярод мэт паездкі беларускага Лідара — перамовы з Прэзідэнтам Італьянскай Рэспублікі Серджыа Матарэлай і Папам Рымскім Францыскам.

А 18 мая ў Ватыкане адкрылася выстава 31 абраза беларускіх іканапісцаў і 2 чаканных акладаў. "Іканапіс Беларусі XVII — XXI стагоддзяў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь". Праект знаёміць італьянскіх спецыялістаў і турыстаў з усяго свету з унікальнымі ўзорамі нашай сакральнай культуры.

"Сашэсце Святога Духа". Сярэдзіна XVIII ст. "Цалаванне Якіма і Ганны. Дабравесце Ганне". 1640 — 1650 гг.

Крытычная маса

Ад яблычка да Цмока

Чарговы Міжнародны фестываль тэатраў лялек прапанаваў публіцы найцікавейшыя пастаноўкі з 6 краін свету, тэатральнай жа грамадзе даў магчымасць пабачыць кірункі, у якіх рухаецца сучаснае лялечнае мастацтва, і "навесці масты" з лепшымі прадстаўнікамі гэтай прафесіі. Журналістам і крытыкам даў падставу не толькі аналізаваць тэатральныя падзеі, але і пачуць на штодзённых абмеркаваннях развагі тых, хто непасрэдна ствараў спектаклі. У любым выпадку для ўсіх гэты фестываль, як сказаў хтосьці з удзельнікаў, быў цудам. І шчасце, што цуд, нягледзячы ні на якія абставіны, адбыўся ў Мінску ўжо дзявятым разам.

Настасся ПАНКРАТАВА

Спектаклі "гучныя"

Пяць дзён сістэматызавалі карціну лялечнага свету ў азначаныя плыні і выявілі мацерыкі праблем, аднолькавых для рознамоўных труп. Пачну з плыняў, узяўшы на ўзбраенне тэрміналогію галоўнага рэжысёра Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Аляксея Ляляўскага. У час абмеркаванняў у "Secret room" ("Сакрэтным пакоі") тэатра-гаспадара, Аляксей Анатольевіч умоўна падзяліў пастаноўкі для дзяцей на "гучныя" і "ціхія".

Сапраўды, з'явіўся пласт спектакляў, бліжэйшых да шоу-праграм. На форуме ўздзейнічаў на ўспрыняцце багаццем і відовішчасцю спектакль Краснадарскага краявога тэатра лялек "Трысняговая шапка". Пастаноўка заслужанага дзеяча мастацтваў Кубані Канстанціна Мохава была настолькі маштабнай, што змагла змясціцца толькі на сцэне сталічнага Тэатра юнага гледача. Узяўшы старую п'есу Юрыя Сідарава і Ірыны Уваравай, створаную па матывах еўрапейскіх казак і легенд з упляценнем шэкспіраўскіх тэкстаў, тэатр і ігру акцёраў шырокімі мазкамі паказаў, і шыкоўныя касцюмы акцёраў, і цікавыя лялькі, і кібітку ў натуральны памер, і шмат дыму ды снегу на сцэне, і звышгучную фанаграму, каб уразіць гледача напавал. Мне думалася хутчэй пра небяспеку за гэтай шумлівасцю і бляскам згубіць, услед за арыгінальнай назвай п'есы, саму соль гісторыі… Мо так для гледача і здарылася.

На першых хвілінах грымеў і "Вялікі змей" Гродзенскага абласнога тэатра лялек. Але, у адрозненне ад папярэдняй гульні ўсур'ёз, Алег Жугжда зрабіў казку-вар'етэ ў іранічным ключы. Таму пасля бурлівага пачатку з гуллівымі мізансцэнамі спектакль паступова перайшоў да шчырай размовы пра непаўторнасць і ўнікальнасць кожнага з нас. Словы ж песні "Пачуйце магію ў сабе" ўвогуле можна рабіць дэвізам фестывалю.

Адступленне першае. Моўнае

Перадаць сэнсавыя нюансы жартоўнага тэксту польскага аўтара Марты Гуснёўскай гродзенцам дапамог шыкоўны пераклад на беларускую мову Сяргея Кавалёва. У пастаноўцы ж "Спакуса" Беларускага тэатра "Лялька" з Віцебска паводле апавядання Антона Чэхава "Чорны манах" рэжысёр Віктар Клімчук першапачаткова канцэнтруе ўвагу на тэксце. Нават выведзена азначэнне "дыялогі". Але "тэатральны" пераклад, падаецца, не да канца падтрымаў інтрыгу, закладзеную ў назве з афішы… Так што "смак" мовы са сцэны — справа з самых істотных.

Спектаклі "ціхія"

На фестывалі хапала "ціхіх", але не менш выразных пастановак для дзяцей. Замест буяння фарбаў яны прапанавалі багатыя на нюансы і адценні развагі пра спрадвечнае. Цікава, што ў праграму нават у адзін фестывальны дзень патрапілі два праекты з розных краін, створаныя паводле аднаго і таго ж літаратурнага матэрыялу — кнігі амерыканскага аўтара Шэлдана Сільверстайна "Шчодрае дрэва". Ізраільскі тэатр "Кеу" прапанаваў бясслоўную пастаноўку "Калі ўсё было зялёным", пабудаваную на якаснай анімацыі персанажаў вельмі выразных лялек. Аўтары інсцэніроўкі Дзікла Кац і Аві Зліха ставілі за мэту скласці аповед пра адносіны чалавецтва і прыроды, таму нават для вырабу аб'ектаў і дэкарацый выкарысталі старыя выданні. У варыяцыі тэатра "Кеу" чалавек павінен разумець, што за кожны свой выбар ён будзе несці адказнасць, але і пасля лёсавызначальных памылак у яго заўсёды застанецца надзея на выратаванне.

Каўнаскі дзяржаўны тэатр лялек аказаўся "бліжэй да тэксту", пакінуўшы біблейскія алюзіі пра самаахвярнасць, любоў і страты.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 9.**

"Лічбавы" падыход

Герцагіня мае рацыю

Па-мойму, "адбіць" грошы на той ці іншы фестываль, хай сабе раённага ці абласнога маштабу, — годная справа. Але як гэта зрабіць у час сусветных эканамічных пературбацый, зніжэння ўзроўню даходаў насельніцтва ды пры наяўнай канкурэнцыі летніх акцый, якія ладзяцца цяпер па ўсёй краіне?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Вось, скажам, сёння ў Ашмянскім раёне ў сёмы раз прымуць гасцей з Беларусі і з краін блізкага замежжа на фестывалі "Гальшанскі замак—2016". Як кажа метадыст мясцовага раённага Цэнтра культуры Сяргей Жылік, на імпрэзе аматары ваеннай тэматыкі змогуць зануцца ў атмасферу сярэднявечнага рыцарскага стану, паглядзець конны турнір, а таксама спаборніцтвы лучнікаў. Упершыню на фэсце выступіць Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі са спектаклем "Адвечная песня", у "Горадзе майстроў" усіх ахвотных навучаць чаканіць манеты і хадзіць на хадулях, а яшчэ ў Гальшанах 21 мая кожны зможа паўдзельнічаць у майстар-класах па старадаўніх танцах. Учора ў Ашмянах прайшлі сёмыя па ліку "Гальшанскія чытанні". І тое, натуральна, толькі частка таго, чым арганізатары зацікаўлівалі аматараў старасветчыны і турыстаў падчас двух фестывальных дзён.

Але гэта, так бы мовіць, адзін бок медаля. Мяне ж у гэтай справе цікавіла іншае: ці плануюць мясцовыя культработнікі зарабіць хоць якую капейчыну на імпрэзе? Як адзначыла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Людміла Каханоўская, пэўныя даходы ад правядзення фэсту, натуральна, запланаваны. Так, білет на імпрэзу для дарослых будзе каштаваць 100 тысяч рублёў, дзіцячы — удвая таннейшы.

Ды прадказаць колькасць наведвальнікаў фестывалю не бярэцца ніхто. І калі на папярэдні "Гальшанскі замак" прыехала прыкладна паўтары тысячы гасцей (пры кошце дарослага білета ў 70 тысяч рублёў), дык сёлета лічба можа стаць недасяжнай. "Шмат залежыць ад надвор'я, — растлумачыла "К" дырэктар Ашмянскага раённага цэнтра культуры Вольга Кузьміцкая, — а таксама ад таго, ці паедуць да нас турысты з іншых рэгіёнаў. Мы прыклалі для гэтага ўсе намаганні: рэкламу дасылалі ў турфірмы, а тыя, хто прывязе да нас гасцей арганізаванымі групамі колькасцю больш за 30 чалавек, атрымаюць зніжку на білеты ў памеры 20 %".

Заканчэнне чытайце **на старонцы 4.**

Віншаванне

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з Міжнародным днём музеяў!

Ваша руплівая і плённая праца заслугоўвае глыбокай павагі і служыць прыкладам высокага прафесіяналізму і любові да абранай справы.

Дзякуючы вашаму таленту і творчаму падыходу, глыбокім ведам, вернасці і шчырай адданасці місіі захавальнікаў гістарычнай і культурнай спадчыны Бацькаўшчыны тысячы наведвальнікаў штодзень спасцігаюць унікальную культуру Беларусі. Сёння беларускі музей — спалучэнне лепшых традыцый музейнай справы з найноўшымі інфармацыйнымі тэхналогіямі.

У сучасным свеце музей з'яўляецца важным фактарам у справе захавання, вывучэння і папулярызацыі нашай гісторыі і культуры, фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, з'яўляецца адным са сродкаў наладжвання міжнароднага дыялогу.

Музейныя скарбы Беларусі, прадстаўленыя ў экспазіцыях і на выстаўках, а таксама ў інфармацыйнай прасторы, адкрываюць духоўнае багацце нацыі як суайчыннікам, так і шматлікім гасцям з далёкага і блізкага замежжа, спрыяюць таму, каб беларуская культура, гісторыя сталі шырока вядомыя ў свеце. Шматлікія міжнародныя праекты адкрываюць свету Беларусь, а таксама даюць магчымасць беларусам пазнаёміцца з шэдэўрамі сусветнай культуры.

І за кожнай сустрэчай з музеем, за кожным адкрыццём — ваша адданая праца, вашы талент і натхненне!

Шчасця і радасці, творчай энергіі, аптымізму, здароўя і дабрабыту вам і вашым блізкім.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

Праекты з Сербіяй

У Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь 18 мая адбылася сустрэча міністра культуры нашай краіны Барыса Святлова з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Сербіі Велькам Кавачавічам, падчас якой абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва краін у сферы культуры, а таксама былі вызначаны кірункі дзейнасці, якія неабходна развіваць краінам.

Пасол уручыў Барысу Святлову ліст міністра культуры і інфармавання Рэспублікі Сербія спадара Івана Тасаўца, у якім была выказана гатоўнасць сербскага боку актыўна супрацоўнічаць у сферы культуры. Прыкладам такога супрацоўніцтва спадар Тасавец лічыць узаемадзеянне нацыянальных тэатраў Сербіі і Беларусі.

Міністр культуры Сербіі паведаміў, што Народная бібліятэка яго краіны з задавальненнем прадаставіць арыгінальныя выданні са свайго фонду ў сувязі з правядзеннем выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі "Францыск Скарына і яго эпоха" ў гонар 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Барыс Святлоў выказаў словы падзякі за прадастаўленне арыгінальных выданняў Францыска Скарыны і анансаваў выпуск факсіміле з іх да 2017 года. Кнігі ў якасці падарунка накіруюць у Народную бібліятэку Сербіі.

Падчас сустрэчы міністр культуры Беларусі заявіў, што падтрымлівае ўсебаковае супрацоўніцтва паміж краінамі ў культурным плане. Прыкладам супрацоўніцтва можна лічыць узаемадзеянне нацыянальных тэатраў (нашага Вялікага тэатра оперы і балета і Нацыянальнага тэатра Сербіі) і нацыянальных бібліятэк, удзел у міжнародных кніжных выставах, наладжванне кантактаў з сербскімі ўстановамі культуры.

Летась парламенцкая дэлегацыя Сербіі на чале са старшынёй Народнай Скупшчыны Маяй Гайковіч наведала Беларускую дзяржаўную харэаграфічную гімназію-каледж. Да ўсяго, Сербія ўдзельнічае ў беларускіх культурных мерапрыемствах. Напрыклад, падчас правядзення "Славянскага базару ў Віцебску" адбылося пасяджэнне Савета дырэктараў Сусветнай асацыяцыі фестываляў з удзелам прадстаўніка Сербіі Мілана Гніпа, дырэктара Міжнароднага дзіцячага музычнага фестывалю "Маленькія ракавінкі". Па выніках Сербія ўвайшла ў склад кіраўнічага органа асацыяцыі. У чэрвені 2014 года ў Мінску адбыліся Дні сербскага кіно, а ў лістападзе — Дні беларускага кіно ў Сербіі. Міністэрства культуры нашай краіны выступіла з прапановамі правесці Дні культуры Беларусі ў Сербіі ў 2017 годзе, а Дзён культуры Сербіі ў Беларусі яшчэ праз год.

Велька Кавачавіч падкрэсліў, што цёплыя адносіны паміж краінамі з'яўляюцца прыкладам для іншых еўрапейскіх краін, і супрацоўніцтва павінна развівацца па ўсіх напрамках, галоўным з якіх з'яўляецца культура.

Каментарыі з нагоды

Фотаздымкі з чалавечымі касцямі, узнятымі на дзённае святло каўшом экскаватара, абляцелі на мінулым тыдні ці не ўсе беларускія СМІ. Вядома, многія былі шакаваныя, убачыўшы такое ў наш час, ды яшчэ і непадалёк ад цэнтра Мінска. Работы на месцы колішніх Лютэранскіх могілак былі прыпынены, актывісты ў справе аховы спадчыны напісалі заяву ў пракуратуру з патрабаваннем прыцягнуць вінаватых да адказнасці. Як у выніку вырашыцца гэтая сітуацыя, прагназаваць пакуль рана. Але ўжо цяпер яна выклікае адразу некалькі важных пытанняў.

Ілья СВІРЫН

Лютаранскі сквер на інтэрнэт-карце.

Каб нябожчыкаў не патрывожыць

Чаму ж так здарылася? Зразумела ж, прыходу будаўнікоў на аб'ект заўсёды папярэднічае планаванне і праектная работа. Адпаведна, былі ўсе магчымасці прадухіліць жахлівую сітуацыю. Няўжо нехта свядома прыняў рашэнне капаць на могілках?

Як патлумачыў намеснік старшыні Беларускага бюро ICOMOS Цімафей Акудовіч, сітуацыя ў дадзеным выпадку склалася супярэчлівая. З аднаго боку, лакалізацыя тых могілак заўсёды была вядомая — прычым не толькі некрапалістам, але і проста аматарам гісторыі Мінска. Урэшце, гэтае месца недарэмна называецца Лютэранскім скверам — прычым назва, заўважым, афіцыйная. З іншага боку, ніякага ахоўнага статусу тая тэрыторыя не мае. Што, зрэшты, таксама вытлумачальна, бо пра мінулае там не нагадвае літаральна нічога.

— Адпаведна, на стадыі планавання работ заканадаўства, хутчэй за ўсё, фармальна не было парушана, — лічыць Цімафей Акудовіч, цалкам дапускаючы, што адказныя асобы маглі проста не ведаць пра гісторыю таго скверыка.

Аптымальным спосабам вырашэння гэтай сітуацыі ў будучыні адмыслоўца лічыць стварэнне базы дадзеных усіх пахаванняў (у тым ліку, і ўтоеных глыбока ў зямлі) і ўвядзенне адпаведнага нарматыўнага дакумента, які рэгламентаваў бы адносіны да іх. Але пакуль да гэтага дойдзе справа (а дойдзе яна, відавочна, няхутка), варта звярнуць асаблівую ўвагу на такі фактар, як асвета.

І сапраўды, каб у Лютэранскім скверы быў усталяваны інфармацыйны шчыт, які распавядаў бы пра багатую мінуўшчыну непрыкметнай сёння часткі гарадскога ландшафту, падобная сітуацыя, магчыма, і не здарылася б. Аднак такі просты і танны спосаб папулярызацыі "невідавочнай" цяпер гісторыі горада ў Мінску чамусьці па-ранейшаму не практыкуецца.

Разам з тым, варта адразу ўлічыць і наступнае. Якой поўнай ні выглядала б гіпатэтычная пакуль база даных усіх пахаванняў, яна будзе папаўняцца — прычым нярэдка менавіта намаганнямі экскаватаршчыкаў. Цімафей Акудовіч перакананы, што невядомых, забытых, таемных магіл у беларускай зямлі яшчэ вельмі шмат.

— І таму важна, каб пры іх выяўленні тыя ж будаўнікі неадкладна пра гэта паведамлялі, — дадае ён. — Куды звяртацца? Думаецца, тут логіка простая: тэлефануй у міліцыю. А там ужо разбяруцца.

У дадзеным выпадку, нагадаем, грамадскі неспакой з-за ўстрывожаных парэшткаў стварылі не тыя, хто патурбаваў іх спакой, а, па сутнасці, "выпадковыя мінакі". Не выключана, што менавіта гэтая акалічнасць стане вырашальнай пры ацэнцы сітуацыі з боку праваахоўных органаў.

К

У адной з сацыяльных сетак з'явілася эмацыянальнае паведамленне, што Гомельскі гарадскі маладзёжны тэатр застаўся напярэдадні прэм'еры без афішы. Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама, маўляў, не прыняў візуальнае рашэнне афішы да спектакля "Дзе адступаецца каханне…", палічыўшы прапанаваны варыянт занадта змрочным. Інтэрнэт-хваля ўзняла на паверхню праблему, з якой не ўпершыню сутыкаюцца тэатры краіны...

Настасся ПАНКРАТАВА

"Фі" на адрас афіш

Звычайна гісторыі пра знятыя ці не дапушчаныя да гледача афішы становяцца прадметам дыскусій унутры тэатральнай супольнасці, зрэдку выходзячы за яе межы, яшчэ радзей атрымліваюць розгалас ў грамадстве. Таму мала хто ведае пра тое, што сітуацыя ў Гомелі — адна з шэрагу падзей, якія стала ўзнікаюць у нашай краіне. Прыгадайце хаця б, як у свой час раптоўна са сталічных вуліц зніклі афішы Уладзіміра Цэслера да спектакля "Translations", што ішоў у Купалаўскім тэатры. У Магілёўскім абласным драматычным тэатры не дайшла да гледача афіша да спектакля пра Чырвоны Каптурык. Мастак вырашыў пайсці ад дзіцячага малюнку, стылізаваўшы пад аматарскія выявы ваўка і галоўнай гераіні, якую ён размясціў у жываце шэрага драпежніка. Забаўны малюнак, чымсьці блізкі да знакамітай ілюстрацыі Антуана дэ Сэнт-Экзюперы да "Маленькага прынца" (памятаеце, там, дзе намаляваны слон у жываце ўдава), падаўся адказным асобам празмерным для школьнай аўдыторыі.

Не так даўно ў падобную гісторыю патрапіў Беларускі дзяржаўны тэатр лялек са знакамітай ужо пастаноўкай Яўгена Карняга для дарослых "Інтэрв'ю з ведзьмамі". Праз колькі часу пасля прэм'еры хтосьці з чыноўнікаў палічыў, што афіша з жаночым партрэтам, складзеным з трох твараў, пужае жыхароў горада. Распрацаваную паліграфічную прадукцыю не сталі больш друкаваць, і прэм'ерныя праграмкі, па сутнасці, сталі рарытэтам.

У гэтай сувязі нават не хочацца казаць пра плакаты танцавальных клубаў ці рэкламу гандлёвых аб'ектаў, на якіх раз-пораз месцяцца куды больш непрыемныя выявы або па максімуме аголеныя целы… Я вяду да іншага: тэатральная афіша ствараецца мастаком — чалавекам з прафесійнай адукацыяй у сферы мастацтва, таму выказваць свае заўвагі наконт яго працы павінны мастацтвазнаўцы, але не ў якім разе не чыноўнікі! Тым больш, калі нязгода з творчым бачаннем, як у выпадку з тэатрамі, выліваецца ў канкрэтныя меры ў дачыненні да работы мастака…

У такіх выпадках старшыня Рэспубліканскай экспертнай камісіі па супрацьдзеянні прапагандзе парнаграфіі, гвалту і жорсткасці Ніна Фральцова раіць тэатрам складаць афіцыйны ліст на адрас РЭК. "Дзіўна, што прызнаны ў Еўропе Беларускі дзяржаўны тэатр лялек у роднай краіне чуе нейкія прэтэнзіі… Увогуле, калі ў якогасьці з выканкамаў узнікаюць пытанні да творчых калектываў, то лагічна было б звярнуцца да экспертаў. У выпадку, калі падаецца, што тая ці іншая афіша абуральная ці транслюе празмерную жорсткасць, лепш за ўсё звярнуцца да РЭК ці да нашых абласных камісій", — тлумачыць суразмоўца.

Ніна Ціханаўна ўпэўнена: у падобных сітуацыях РЭК зможа дапамагчы тэатрам абараніць сваё права на мастацкае самавыяўленне. Адміністрацыі калектыву неабходна напісаць ліст на афіцыйным бланку з усімі неабходнымі пячаткамі, прыкласці да ліста афішу, праграмку ці іх выявы на лічбавым носьбіце і даслаць у камісію на мастацтвазнаўчую экспертызу. Атрымаўшы афіцыйнае пацверджанне, што дадзеная паліграфічная прадукцыя не нясе разбуральнага ўплыву на чалавечую псіхіку, не змяшчае ў сабе элементаў гвалту, тэатр можа смела ісці ў мясцовыя органы ўлады. "Калі выснова нашых экспертаў выклікае ў выканкаме сумненні, патрабуйце, каб ужо яны накіравалі вашу афішу на паўторную экспертызу", — дадае суразмоўца.

На ілюстрацыях: тыя самыя спрэчныя афішы.

К

фотафакт

Хор Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі здзейсніў гастрольны тур па вузах-партнёрах. Гэта фота зроблена ў Акадэміі музыкі імя Ферэнца Ліста ў Будапешце, таксама студэнты наведалі Вільнюс і Варшаву. Падрабязна пра гэта — у наступных нумарах "К".

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 365. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 20.05.2016 у 17.30. Замова 1935. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

"#БудзьПетрусём" і стань... Далі

У некаторых музеях "Ноч музеяў" адбылася на мінулым тыдні. Але збольшага міжнародная акцыя пройдзе 20 і 21 мая. Што толькі не робяць музеі, каб прыцягнуць наведвальніка!.. Працягваем тур па музеях рэспублікі.

Вольга РОПАТ

"Мафія" і Пікаса

Нацыянальны гістарычны музей прапануе наведвальнікам інтэрактыўныя праекты: выставы 3D-карцін "Ілюзорыум" і "Эксперыментус". Арганізатары апошняга пакажуць светлавое шоу. У дворыку музея будзе працаваць арт-пляцоўка з праектам Марыны Бацюковай "Сула. Неперапыненае", прысвечаным беларускаму народнаму святу "Пахаванне стралы". Ва ўстанове адбудуцца майстар-клас па танцах, чэмпіянат па старых камп'ютарных гульнях, канцэртная праграма.

У праграме "Прыродная мазаіка" філіяла Музей прыроды і экалогіі пройдуць квэст "Птушкі каля пушкі", майстар-класы і конкурсы. Дом-музей І з'езда РСДРП правядзе праграму "POST.Ноч" на тэму посткросінгу. Упрыгожанні і аксэсуары можна будзе пабачыць на міжнароднай выставе "Фарбы душы" ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Да ўсяго — прэзентацыя дызайнерскага адзення. Гасцёўня Уладзіслава Галубка прапануе падарожжа ў свет настольных гульняў ("Джэнга", "Уно", "Эліяс" ды іншых), а Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры — "The Concert", гульню "Мафія", відэапаказ спектакля Янкі Купалы "Паўлінка" 1982 года. Таксама тут будзе працаваць інтэрактыўная частка "Сакрэты тэатральнай грымёркі".

Праграма "Музей учора + заўтра", падрыхтаваная Нацыянальным мастацкім музеем, парадуе мінчан і гасцей сталіцы разнастайнасцю мерапрыемстваў: ад тэатральных прадстаўленняў і перформансаў (тэатр псіхалагічнай імправізацыі "Момант", тэатр "Заўтра вясна", эксперыментатары з "Еуе", тэатр танца "Skyline", тэатралізаваны перформанс у японскім стылі, экскурсійны перформанс "Ідзі за чалавекам у капелюшы") да квэстаў ("Муза, выбяры мяне").

Пераўвасобіцца ў мастакоў — Марка Шагала, Сальвадора Далі, Рэнэ Магрыта, Казіміра Малевіча, Эндзі Уорхала, Пабла Пікаса — і герояў карцін можна будзе "Музейнай ноччу" ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва (пляцоўка на Някрасава, 3). На пляцоўцы ля плошчы Якуба Коласа пройдзе танцавальная вечарынка з разнастайнымі майстар-класамі.

Квэсты, лекцыі, чытанні

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча пройдзе праграма "Музейны дэтэктыў". У кожнага наведвальніка будзе магчымасць судакрануцца са знакамітым "Інтымным дзённікам" паэта, правесці фотаэкспертызу, паўдзельнічаць у квэстах. Да ўсяго, адбудзецца прэзентацыя "Нататак пра Шэрлака Холмса" Артура Конан Дойла і перакладных выданняў. Патрапіць у атмасферу пачатку XX стагоддзя дапаможа тэатр узаемадзеяння "Мусташ".

Праграма "#БудзьПетрусём", якая адбудзецца ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі" складаецца з заключнай вечарыны II сезона праекта "Чытаем сваё. Класіка", лекцыі маскоўскага спецыяліста па метадах машыннага навучання Сяргея Маркава ("Штучны інтэлект і літаратура"), турніра па хуткасным наборы на друкарках, відэаарту фатографа з Санкт-Пецярбурга Сяргея Страіцелева, сольнага праекта Андрэя Апановіча "Triangle".

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа правядзе мерапрыемства "Святло ў акне", тэма якога — падарожжа ў прасторы, часе, у свет літаратуры і мастацтва. Музей прэзентуе стацыянарную выставу "У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Якуба Коласа" (пра яе — на старонцы 7), пакажа выставу старадрукаў з асабістай бібліятэкі паэта. Гасцей чакае паэтычна-музычнае падарожжа ў язычніцкія часы, эпоху Сярэднявечча і Сярэбранае стагоддзе, музычная праграма, майстар-клас па вырабе "квілінг"-паштовак, лекцыя "Лайфхакі ў падарожжы" ад Сержука Місюкевіча, "Кватэрнік у дзядзькі Якуба" — выступленне гурта "Hurma".

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы да міжнароднай акцыі падрыхтаваў мерапрыемства да 100-годдзя вянчання Янкі Купалы і Уладзіславы Станкевіч — "Вяселле.by". А гэта — урачыстая цырымонія шлюбу ў суправаджэнні духавога аркестра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь з уручэннем пасведчанняў і памятных падарункаў для пар, якія ў 2016 годзе адзначаюць юбілей свайго вяселля, фотавыстава Джона Кундстатэра "Каб аднойчы...", акцыя "Чытаем Купалу разам" — вершы паэта з "лірыкі кахання", майстар-класы і канцэртная праграма.

Мотападарожжы ў ноч

"Скульптурная ноч" чакае наведвальнікаў у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. У праграме — майстар-класы і творчыя пляцоўкі па стварэнні арт-аб'ектаў з традыцыйных і нетрадыцыйных матэрыялаў, "жывыя скульптуры", танцавальныя гульні, музычная праграма. Арт-гасцёўня "Высокае мѣста" пакажа выставу жывапісу Уладзіслава Пятручыка "Маімі вачыма". Да ўсяго — касцюміраванае шоу, парад строяў розных эпох і народаў, рыцарскі турнір, гульні і танцы, музычныя замалёўкі…

"Класічныя музычныя замалёўкі ў вялікай гасцёўні" ад навучэнцаў Музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі можна будзе паслухаць у музеі "Лошыцкая сядзіба". Наведвальнікаў парадуюць паказальнае выступленне клуба мотападарожжаў выхаванцаў сталічнай дзіцячай студыі Цэнтральнага дома адпачынку дзяцей і моладзі, музыкі-прывіды (праект-легенда струннага аркестра "Амадэус")… На лужках і ў вялікай гасцёўні пройдзе выступленне аніматараў з "Майстэрні ўражанняў" — "Рокавы баль у Лошыцкай сядзібе". Падчас мерапрыемства будуць праходзіць конкурсы для заказаных, па выніках якіх пераможцы правядуць вечар за келіхам віна.

Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны зладзіць канцэртную праграму вакальнай студыі "Ксанта". Затым можна будзе пабачыць выставы "Сляды вайны" і "Капітуляцыя Германіі. Май 1945".

Фэнтазі і транс

У Мінскім абласным краязнаўчым музеі 20 і 21 мая можна будзе павандраваць па старадаўнім Маладзечне. Падчас мерапрыемства пакажуць кінахронікі з удзелам акцёраў абласных драматычнага тэатра і тэатра лялек "Батлейка", музыкантаў каледжа імя Міхала Клеафаса Агінскага, таксама пройдуць квэсты і віктарыны.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік прапануе праграму "Ноч рубля напярэдадні дэнамінацыі", а Гомельскі палацава-паркавы ансамбль — "Фэнтазі. Анталогія".

"Сны ў майскую ноч" пройдуць у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі: дыска ў стылі транс ад DJ Paul Framan, музейны перформанс "Бюро сюррэалістычных даследаванняў", сінемасалон, атракцыён — яшчэ не ўвесь пералік падрыхтаванага музеем.

Магілеўскі абласны краязнаўчы музей імя Еўдакіма Раманава ў розных залах правядзе майстар-класы, гульні, міні-экскурсіі і конкурсы. К

Гала ў Летнім

Учора, 20 мая, у Летнім амфітэатры Віцебска адбыўся гала-канцэрт агляду самадзейнасці Віцебскай вобласці. У мерапрыемстве паўдзельнічала каля 2 тысяч артыстаў рэгіёна.

Гала-канцэрт прайшоў пад дэвізам "Віцебшчына — калыска маёй Беларусі". Галоўная ідэя праекта — як мага больш яскрава паказаць багацце самадзейнай творчасці паўночнага рэгіёна краіны.

Так, на сцэне Летняга амфітэатра сваё майстэрства гледачам прадставілі шматлікія калектывы. Напрыклад, народны тэатр з Браслава прадэманстраваў твор, прысвечаны 75-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны, — незвычайнае прачытанне гісторыі тых страшных дзён маладым сучаснікам. Таксама адно з адкрыццяў агляду-конкурсу — Дзмітрый Сячкоў з Расонаў, у выкананні якога прагучаў твор Сяргея Рахманінава... Падрабязнасці акцыі ад Яўгена Рагіна, які ў гэты дзень знаходзіўся ў Віцебску, чытайце ў наступных нумарах.

Да слова, справаздачныя канцэрты абласных калектываў у рамках Года культуры пройдуць па ўсёй Беларусі. Ужо прадставіла свой маштабны канцэрт 16 мая Гродзенская вобласць. Міншчына прадэманструе гледачам сваю праграму 12 чэрвеня канцэртам у Палацы культуры Маладзечна — культурнай сталіцы года. Гомельская вобласць адзначыцца 30 чэрвеня канцэртам у Абласным культурным цэнтры, Брэсцкая вобласць — 28 верасня ў Брэсцкай абласной філармоніі, Магілёўшчына — у пачатку снежня ў Палацы культуры вобласці. К

Азіяцкі кінавектар

На працягу месяца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі будзе праходзіць выстава "111 гадоў кітайскаму кінематографу". "Дадзеная выстава павінна пакласці пачатак для шчыльнага супрацоўніцтва айчынных кінематаграфістаў з Музеем кітайскага кіно, тамтэйшым кінаканалам і кітайскімі кінакампаніямі", — падкрэсліла першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга.

Настасся ПАНКРАТАВА

Як зазначыла прамоўца, кітайскі кінарынак развіваецца вельмі актыўна, па колькасці стужак і гледачоў выходзіць на першыя пазіцыі ў свеце. Тамтэйшае кіно добра ведаюць у Беларусі: неаднаразова лепшыя ўзоры сучаснага кітайскага экраннага мастацтва дэманстраваліся на Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад". Выстава, што адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы, раскажа пра шлях ад зараджэння кітайскага кінематографа да яго сучаснага стану і дапаможа лепш зразумець экраннае мастацтва азіяцкай краіны.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін нагадаў, што апошнім часам ідзе дынамічнае нарошчванне усебаковага стратэгічнага партнёрства паміж нашымі дзяржавамі, у тым ліку ў культурнай галіне. Само Пасольства часта ладзіць кінапаказы для сталічных школьнікаў, а ў Кітаі дэманструюць шмат беларускіх фільмаў. "У нашага насельніцтва найбольш папулярная стужка "Брэсцкая крэпасць" Аляксандра Кота. Нам падаецца важным, што беларусы не забываюць такую гераічную гісторыю. У нашых краін вялікія магчымасці для ўзаемнага супрацоўніцтва ў галіне кінамастацтва. І мне падабаецца, што такое важнае мерапрыемства для ўмацавання сяброўства паміж нашымі краінамі мы праводзім у год, які ў вашай рэспубліцы названы Годам культуры. Упэўнены, узаемавыгаднае партнёрства будзе стала пашырацца і надалей," — зазначыў спадар Пасол.

Узначальвала кітайскую дэлегацыю першы намеснік дырэктара тамтэйшага кінаканала спадарыня Чжан Лін. Як паведамілі на выставе, гэты канал (адзіны дзяржаўны па дадзенай тэматыцы) вяшчае з 1996 года і на сённяшні дзень мае аўдыторыю ў 991 мільён чалавек. Кожны год ён інвестуе ў вытворчасць больш як ста лічбавых стужак як для ўнутранага рынку, так і для Амерыкі, Еўропы, Ціхаакіянскага рэгіёна і ўсёй Азіі. За апошнія гады кінаканал заснаваў станцыю тэлевяшчання, выкупіў некалькі часопісаў па кінамастацтве і заснаваў кампанію па стварэнні і распаўсюджванні фільмаў.

Як распавёў генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Ігар Поршнеў, кітайская дэлегацыя пазнаёмілася з багатымі складамі касцюмаў, зброі, агледзела натурную пляцоўку. "Яны на свае вочы пераканаліся, што ў нас ёсць вялікая колькасць высакакласных спецыялістаў, якія гатовы зрабіць прадукт любой ступені складанасці. Спадзяюся, гэтыя маленькія крокі стануць пачаткам вялікага шляху нашага сумеснага супрацоўніцтва. Магчыма, нават з'явіцца сумесны праект, цікавы гледачам абедзвюх краін", — дадаў спадар Поршнеў.

Зараз жа кітайскі бок прапанаваў правесці ў Музеі кітайскага кіно беларускі тыдзень. У наш час гэта культурная ўстанова, узведзеная ў 2005 годзе, з'яўляецца самым буйным у свеце дзяржаўным спецыялізаваным музеем. Яна займае плошчу ў 3,5 гектары і мае 20 павільёнаў агульнай плошчай у 38 тысяч квадратных метраў. У шасці першакласна абсталяваных дэманстрацыйных залах можна паказваць лічбавае кіно, а таксама вузка- і шыракастужкавыя фільмы. К

Скарына ў конкурсе

Да 31 жніўня Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі прымае п'есы для ўдзелу ў конкурсе па стварэнні твораў для драматычнага тэатра "Францыск Скарына і сучаснасць". Спаборніцтва пройдзе па пяці намінацыях: гістарычная п'еса, сучасная, "па матывах", інсцэніроўка, сцэнічная дзея.

Конкурс праводзіцца да 525-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны і 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Яго галоўнай мэтай заяўлена ўзбагачэнне нацыянальнага рэпертуару творамі, якія падкрэслівалі б вялікае гістарычнае значэнне асветніцкай дзейнасці першадрукара і яго навуковай спадчыны для сучаснікаў. Суарганізатарамі творчага спаборніцтва з'яўляюцца "Беларусбанк" і Нацыянальная бібліятэка рэспублікі. Прадстаўнікі апошняй паабяцалі забяспечыць удзельнікам доступ да дакументаў і матэрыялаў са сваіх кнігасховішчаў, каб кожны змог як мага больш поўна і дакладна раскрыць заяўленую тэму.

Да ўдзелу запрашаюцца паўнагадовыя асобы незалежна ад грамадзянства і месца пражывання. Не мае значэння, на беларускай ці рускай мове створана п'еса. Для тых, хто не вельмі давярае электроннай пошце, прапануюць офлайн вырыянт, але неабходна дасылаць твор у двух асобніках і не больш за 60 старонак кожны. Абавязковай умовай сталася патрабаванне, каб арыгінальны тэкст на момант пачатку дадзенага конкурсу не ўдзельнічаў у аналагічных мерапрыемствах і нідзе афіцыйна не быў апублікаваны, каб па ім не існавала пастановак у тэатрах. Аўтары маюць права вылучаць па кожнай намінацыі толькі адзін твор.

У мэтах дасягнення аб'ектыўнасці ацэнак усе творы будуць перададзены журы (ачольвае яго мастацкі кіраўнік РТБД, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксандр Гарцуеў) без указання прозвішчаў аўтараў. Агалошванне прозвішчаў адбудзецца толькі пасля падпісання пратакола аб выніках. Прызавы фонд конкурсу складае 260 мільёнаў беларускіх рублёў. У намінацыях "Гістарычная п'еса" і "Сучасная п'еса" прадугледжана па дзве заахвочвальныя прэміі па 25 і 20 мільёнаў рублёў, а для пераможцаў — па 50 мільёнаў рублёў. Найпершы ў намінацыі "П'еса па матывах" атрымае 30 мільёнаў рублёў, другі шчасліўчык у якасці заахвочвання — 15 мільёнаў рублёў. Лідар у намінацыі "Інсцэніроўка" стане ўладальнікам 15 мільёнаў рублёў, а за лепшую "Сцэнічную ідэю" абяцаюць 10 мільёнаў рублёў.

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі паабяцаў узяць лепшы твор конкурсу да пастаноўкі, а таксама выпусціць зборнік п'ес, каб і іншыя тэатры краіны змаглі знайсці новы матэрыял для ўзбагачэння рэпертуару.

"Лічбавы" падыход

Герцагіня мае рацыю

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 4.)

Як патлумачыла суразмоўца, у правядзенні фэсту чынны ўдзел возьмуць і мясцовыя арганізацыі. Так, Ашмянскія мясакамбінат і Райспажыўаб'яднанне за свой кошт пакормяць сотню ўдзельнікаў імпрэзы. "Гэта, канешне, не закрые ўсіх нашых выдаткаў на харчаванне, — кажа Вольга Кузьміцкая, — але значна нам паспрыяе. Тым больш, астатнія арганізацыйныя пытанні мы цалкам прымаем на сябе".

Як спадзяецца дырэктар Ашмянскага РЦК, імпрэза — пры добрым надвор'і — цалкам "адаб'е" ўсе выдаткі. Магчыма, што так і будзе. Так, бюджэт фестывалю, як адзначыла "К" кіраўнік раённай сферы культуры Людміла Каханоўская, перавышае 150 мільёнаў рублёў. Падлічым: калі, напрыклад, на фэст завітаюць прыкладна паўтары тысячы чалавек, з якіх, скажам, будзе пад 200-300 дзяцей, дык арганізатары заробяць 120 — 130 мільёнаў рублёў толькі ад продажу білетаў. А калі турыстаў будзе больш, дык можна спадзявацца і на самаакупнасць форуму… Пра падобную выніковую "бухгалтэрыю" іншым фэстам Беларусі, як я неаднойчы пераконваўся, можна пакуль толькі марыць…

Прыкладна ў гэты ж тэрмін — 19 — 21 мая — у Нясвіжы прайшло XXI свята мастацтваў "Музы Нясвіжа—2016". Падзея традыцыйна ладзіцца Мінаблвыканкамам, Нясвіжскім райвыканкамам і Заслужаным калектывам краіны Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам Беларусі. У праграме свята — спектакль Заслужанага аматарскага калектыву рэспублікі Тэатра імя Уршулі Радзівіл Нясвіжскага раённага цэнтра культуры і адпачынку, канцэрт "Шэдэўры беларускай музыкі для духавых інструментаў" у выкананні ансамбляў флейтыстаў, трубачоў, кларнетыстаў, гала-канцэрт беларускай музыкі ды святочны канцэрт эстраднай песні і музыкі "Узгадваем любімыя матывы" знакамітага аркестра.

Упершыню ў тутэйшым касцёле адбылося выступленне струннага аркестра і яго салістаў "Адвечная музыка пад купалам Нясвіжскай святыні", а ў тэатральнай зале Палацавага ансамбля Нясвіжа прайшоў канцэрт камерных калектываў "У гонар нясвіжскіх маэстра" (да 270-годдзя Яна Голанда і 265-годдзя Мацея Радзівіла). Як патлумачыў "К" начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Нясвіжскага райвыканкама Аляксандр Круглік, усе мерапрыемствы культурнай імпрэзы былі бясплатныя для наведвальнікаў.

Такімі ж бясплатнымі для гледачоў будуць і ўсе культурныя акцыі, запланаваныя падчас правядзення 20 — 22 мая ў Вілейцы і Маладзечна XXVI абласнога фестывалю духавой музыкі "Майскі вальс". У святочных мерапрыемствах, як паведаміла "К" начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечненскага райвыканкама Алеся Лукоўская, прымуць удзел духавыя аркестры — калектывы з Мінскай вобласці, Расіі, Украіны, Латвіі, а таксама харэаграфічныя і харавыя калектывы, ансамблі мажарэтак, вакальныя ансамблі і салісты агульнай колькасцю каля 1000 чалавек.

Фестывальныя мерапрыемствы распачаліся ўчора, 20 мая ў Вілейцы, дзе прайшлі канцэртныя выступленні ўдзельнікаў з Украіны, — дзявочага народнага духавога аркестра "Раксалана", гурта мажарэтак народнага харэаграфічнага ансамбля "Арабеск" і народнага дзявочага джаз-ансамбля "Roksi Band" Крамянчугскага педкаледжа Палтаўскай вобласці.

Сёння, 21 мая, у амфітэатры Маладзечна запланавана конкурсная праграма сярод узорных і народных духавых аркестраў, а таксама сярод ансамбляў мажарэтак. А заўтра, 22 мая, па вуліцах Культурнай сталіцы Беларусі-2016 пройдзе маршпарад духавых аркестраў, святочная дзея працягнецца на цэнтральнай плошчы горада, дзе адбудзецца выступленне зводнага духавога аркестра, паказальныя выступленні мажарэтак, гасцей і лаўрэатаў фестывалю. Там жа пройдзе і ўзнагароджанне ўдзельнікаў культурнага мерапрыемства.

А вось міжнароднага фестывалю "Беларускія фанфары", які традыцыйна ладзіўся ў маі ў Баранавічах, гледачы сёлета не ўбачаць. Як патлумачыў "К" галоўны арганізатар культурнай імпрэзы і кіраўнік мясцовага гарадскога канцэртнага аркестра Васіль Прадун, на гэта ёсць шэраг прычын. "Для ўдзелу ў мерапрыемстве ў нас заявіліся ўсяго тры замежныя калектывы, а не пяць, як мы чакалі і як было звычайна, — зазначыў Васіль Сцяпанавіч. — Да таго ж, у райвыканкаме доўга ўзгаднялася палажэнне аб фестывалі: узніклі праблемы ў фінансаванні фэсту. Таму намі было вырашана зладзіць "Беларускія фанфары" ўжо ў наступным годзе. І ў тым, што ў 2017 годзе мерапрыемства абавязкова адбудзецца, я не сумняваюся…"

Як бачна, калі з фінансаваннем некаторых рэгіянальных і міжнародных фэстаў праблем не ўзнікае (з-за бюджэтных датацый ці праз належную "раскрутку" імпрэзы сярод турыстычных кампаній ды мясцовых і замежных гасцей), дык у іншых рэгіёнах усё нашмат больш складана. Адсюль, як казала Герцагіня з кнігі "Аліса ў Краіне цудаў", мараль: зарабляць на падобных фестывалях трэба, хай сабе і на білетах, а не чакаць добрага "дзядзьку" з кішэнямі, поўнымі грошай. Што ж, Герцагіня мае рацыю: мараль навідавоку.

К

Помнік для Мінска: мара пра мора?

Меморыя ў фармаце "горадазнаўства"

Днямі ў канферэнц-зале Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна адбылося сумоўе экспертнага клуба "Горад дорог". Гэта нефармальнае аб'яднанне неабыякавых да лёсу роднага горада мінчан. Зболшага тое людзі інтэлектуальнай працы і творчых памкненняў. Мэтай дзейнасці яны бачаць асветніцтва і даследчыцкую справу ў фармаце "мінсказнаўства" , а таксама практычную дзейнасць па "навядзенні мастоў" паміж суполкай і органамі ўлады для рэалізацыі грамадскіх ініцыятыў, якія будуць на карысць гораду. Гэтым разам яны сабраліся, каб пагутарыць пра мінскія помнікі — тыя, што былі, што ёсць і якіх сталіцы не стае.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Што было, што маем

На самым пачатку размовы паўстала пытанне канцэптуальнага зместу: што ёсць помнік, што можна і варта лічыць помнікам? Пытанне гэта простае толькі на першы погляд. Маўляў, што тут думаць: чуеш "помнік" і адразу ўяўляеш бронзавую постаць на гранітным пастаменце. А насамрэч помнікам можа быць што заўгодна, калі людзі дамовіліся лічыць той ці іншы матэрыяльны або прыродны аб'ект помнікам.

Калі ж разумець пад помнікам мемарыяльны знак ці скульптурную пластыку, дык першыя аб'екты такога роду з'явіліся ў Мінску ў XIX стагоддзі. Пра гэта распавёў мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі. І хоць першыя мінскія помнікі цалкам адпавядалі ідэалогіі Расійскай імперыі, дзеля іх з'яўлення давялося пераадолець супраціў праваслаўнай царквы, для якой такая форма ўшанавання з'явы ці асобы была парушэннем канону. Людзі праваслаўныя ў гонар чагосьці вартага памяці па тым часе ставілі храм альбо капліцу. А вось скульптурная выява ці калона з надпісам трапляла пад вызначэнне "ідалапаклонства". Адсюль і непрыманне манументальнай скульптуры рускім духавенствам. Да таго, як імперская ўлада ў Мінску змянілася ўладай бальшавікоў, у ім былі пастаўлены мемарыяльныя знакі ў памяць сечы на Нямізе 1067 года, у памяць Нікейскага сабора 325 года, помнік-бюст імператару-"вызваліцелю" Аляксандру II, у перыяд царавання якога быў скасаваны прыгон. Згаданага цара ў імперыі "піярылі", бадай, так жа маштабна, як Леніна ў СССР: Аляксандру II было пастаўлена 3000 помнікаў, прычым усяго па чатырох тыпавых праектах. Мінскі помнік імператару ў час Першай сусветнай вайны з-за пагрозы нямецкага наступу быў эвакуіраваны ў Яраслаўль. А калі адбылася Лютаўская рэвалюцыя 1917 года і Расія перастала быць імперыяй, новая ўлада той помнік наогул знішчыла разам з іншымі манументамі, якія наўпрост ці ўскосна нагадвалі пра царызм. Тады ж у Яраслаўлі знеслі і помнік Аляксандру Пушкіну.

Мабыць, не ўсе ведаюць, што мемарыяльны знак у памяць ахвяр так званага Курлоўскага расстрэла 1905 года, што знаходзіцца на станцыі метро "Плошча Леніна", меў папярэдніка — валун з крыжам. Ён з'явіўся як вынік грамадскай ініцыятывы. Помнік паставілі мінчане ў тым жа 1905 годзе на Прывакзальнай плошчы. Цікава, што ўлада ўскосна прызнавала сваю віну за трагедыю і не ладзіла з гэтай прычыны перашкод рэалізацыі ініцыятывы. Праставіў той помнік да 1939 года, знікнуўшы падчас рэканструкцыі Прывакзальнай плошчы.

Кажучы пра сённяшні дзень нашай сталіцы, трэба падзяляць гарадскую скульптуру і ўласна помнікі. Прыкладам, творы Уладзіміра Жбанава, якія фактычна адкрылі новую эпоху ў фарміраванні гарадскога асяроддзя сталіцы і, бадай, усёй Беларусі, — не помнікі, не мемарыяльныя знакі, а менавіта гарадская (раней казалі, "паркавая") скульптура. Мне, аднак, падаецца, што праз пэўны час іх будуць успрымаць у новай якасці — як вобразнае ўвасабленне горада і яго жыхароў на мяжы XX і XXI стагоддзяў. Верагодна, у адлегласці часу ў вачах нашых наступнікаў скульптуры стануць уяўляцца акурат помнікамі. Нешта падобнае адбылося ў Гродне, дзе скульптура на Гараднічанцы, якая не мае ніякага прататыпу і ўвасабляе сённяшняе ўяўленне пра гарадзенцаў XVIII стагоддзя, ужо ўспрымаецца помнікам канкрэтнай асобе той эпохі. Кандыдатаў на ролю прататыпу шмат — ад архітэктараў, што будавалі ў горадзе аб'екты, якія сталі знакавымі, да адміністратара-рэфарматара, гарадзенскага старасты Антонія Тызенгаўза.

Поле эксперыментаў?

Сёння можна пачуць шкадаванні (было гэта і на згаданым сумоўі), што ў сталіцы пераважае фігуратыўная, акрэсленая тэматычна і сюжэтна скульптура, якая, маўляў, глядзіцца даволі архаічна. Што амаль няма сучаснай, абстрактнай, пластыкі. А праз адсутнасць сучасных форм вобразу горада не стае дынамізму. З гэтым у нейкай ступені можна і пагадзіцца, ды ўсё ж я не лічу, што грамадская прастора мусіць быць полем для часам сумніўных эстэтычных эксперыментаў. Так, грамадства можна і часам нават трэба выхоўваць. Але разлічваць на поспех у гэтай справе варта толькі пры ўздзеянні на грамадскую свядомасць карэктнымі сродкамі. Агрэсіўныя формы ўплыву правакуюць непрыманне. І гэта не толькі ў нашым да нядаўняга часу закрытым, кансерватыўным (у тым ліку і ў культурнай галіне) грамадстве, але і ў краінах з больш талерантнай эстэтыкай. Хоць бы ў тых жа Штатах…

Там прынята у памяць людзей, дарагіх вялікай супольнасці ці канкрэтнай сям'і, ставіць мемарыяльныя лаўкі ці садзіць мемарыяльныя дрэвы. Там увогуле вітаецца прыватная ініцыятыва на грамадскую карысць. Вядомы выпадак, калі чалавек, якому не падабалася распаўзанне гарадоў і знікненне прыродных ландшафтаў, за вялікія грошы купіў участак у цэнтры мегаполіса і зрабіў на ім… жытнёвае поле. Гэткі помнік знікаючай прыродзе. Да гэтай інсталяцыі грамадства паставілася прыхільна, бо такую ж занепакоенасць падзяляюць і іншыя, а для выяўлення апошняй знойдзена надзвычай эфектная эстэтычная форма. У гэтай сувязі можна згадаць, што і ў нас у свой час быў маштабны праект, які меў на мэце прыцягнуць увагу да праблем экалогіі. Праўда, усе разумелі, што рэалізаваны ён ніколі не будзе, за стадыю дэкларацыі не выйдзе. Прапанавана ж было развесці натуральнае балота, з хмызняком і жабамі, у цэнтры Мінска. Маўляў, уратуем балота — частку нашай нацыянальнай тоеснасці, якая знікае пад уплывам глабальных змен! Я гэту дэкларацыю запомніў. Думаю, іншыя — таксама. Значыць, сэнс быў.

Прывяду, аднак, прыклад, калі ў згаданых вышэй Штатах мемарыял, які задумваўся як нацыянальны і быў выкананы ў формах, для падобнага аб'екта нязвыклых, быў па патрабаванні грамадства дапоўнены традыцыйным, нават "кансерватыўным" элементам. Гаворка ідзе пра мемарыял у памяць вайны ў В'етнаме. Зыходна ён уяўляў сабой сцяну з адпаліраванага да люстэркавасці чорнага граніту з выбітымі на ёй імёнамі ўсіх на той вайне палеглых. Ідзе чалавек уздоўж сцяны, чытае імёны, бачыць на сцяне сваё ўласнае адлюстраванне і адчувае далучанасць да трагічнай падзеі, сваю еднасць з тымі, хто не вярнуўся. Проста і геніяльна. Але грамадства, найперш — ветэраны, палічылі, што гэтага недастаткова: патрэбен вобраз, які ўвасабляў бы канкрэтыку, рэаліі той вайны. Урэшце гранітная сцяна была дапоўнена скульптурнай групай, якая прадстаўляла трох салдат ЗША — прадстаўніка белай расы, афраамерыканца і амерыканца чырвонаскурага. Іх зброя і рыштунак выкананы з гіперрэалістычнай дакладнасцю. У такім спалучэнні — вельмі сучасная прасторавая кампазіцыя і вельмі традыцыйная круглая скульптура — помнік існуе па сённяшні дзень.

Помнікі — каму і навошта?

Удзельнікі сумоўя выказалі свае пажаданні адносна таго, якія помнікі мусяць быць у Мінску ў дадатак да наяўных. Называліся імёны літаратараў, мастакоў, артыстаў, дзяржаўных дзеячаў. Усё, нібыта, правільна, але ж мне падумалася: пачынаць варта было б не з персаналій, а з канцэпцыі.

У тых жа бальшавікоў павучыцца… Іхні "план манументальнай прапаганды", што ўяўляў сабою спіс асоб, якіх трэба ўшанаваць дзеля папулярызацыі ідэі "сусветнай рэвалюцыі", быў грунтоўна асэнсаваны з погляду ідэалогіі і падпарадкаваны задачам практычнай палітыкі. Я не супраць таго, каб у сталіцы з'явіўся помнік мастаку, праз школу якога ў дзяцінстве прайшлі многія слынныя нашы творцы; паэту — аўтару слоў вядомай кожнаму беларусу песні; князю, чыя дзейнасць яшчэ тысячу год таму прымусіла суседзяў шукаць на карце старадаўні Менск, мору, якога Мінску, па чыімсьці меркаванні, не хапае, а яшчэ — як ўвасабленне беларускай мары. Гэта, так бы мовіць, пацеркі. А пацеркам трэба нітка. У дадзеным выпадку нітка — канцэпцыя.

Перш чым разважаць пра манументальную канкрэтыку, трэба вызначыцца, дзеля якой мэты мы збіраемся аздабляць грамадскую прастору помнікамі. Дзеля таго, каб сцвердзіць сваю тоеснасць і культурна-палітычную самадастатковасць ва ўласных вачах і ў вачах суседзяў? Каб давесці свету, што наша краіна — цэнтр, а яе сталіца — сэрца Еўропы? А мо нам для самасцвярджэння дастаткова адчуваць сябе часткаю, як пісаў Купала, "сям'і нялічанай славян"? А мо проста, каб прыгожа было, а змест — другасны? Зрэшты, існуе Рэспубліканскі план манументальнай прапаганды. Дык можа варта каардынаваць грамадскую ініцыятыву з дзяржпраграмай?

А ўжо ад адказу на гэтыя пытанні залежыць і гістарычная канкрэтыка, і мастацкая стылістыка мінскіх помнікаў.

К

Як выхаваць “смак” да малюнку?

Ала КАЛАСЕНЦАВА,
мастак, выкладчык архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта

Часам чую ад людзей, нібыта дасведчаных, што мастаку сёння мастацкая адукацыя не надта і патрэбная…

Так, калі проста маляваць для сябе, дык хопіць і студыі. А вось калі працаваць прафесійна, куды ж без адпаведнай падрыхтоўкі: самавук шмат не дасягне. Не ўсё, што дае ВНУ, потым скарыстоўваем ў жыцці, але адукаваны прафесіянал заўжды будзе мець перавагу над таленавітым, але дылетантам.

Студэнты прыходзяць да нас на першы курс, здольныя маляваць хіба гіпсавую галаву. У працэсе мы іх вучым пісанню партрэта, жывой натуры, потым — аголенай. Я бачу, як новы досвед змяняе людзей. Напачатку яны могуць лічыць, што спецыяльныя дысцыпліны, якія я выкладаю, у будучай працы ім не надта і патрэбныя. Маўляў, на ўсе выпадкі жыцця ёсць камп’ютар. А на чацвёртым курсе пачынаюць адчуваць “смак” да малюнку. Ім гэта ўжо цікава, прыходзіць усведамленне, што без малюнку і жывапісу яны будуць непаўнавартаснымі спецыялістамі. Урэшце, тое, што я выкладаю, патрэбна не для таго, каб яны карціны пісалі, а каб прасякнуліся філасофіяй мастацтва, умелі працаваць з колерам, эстэтычна пісьменна пабудаваць інтэр’ер і спраектаваць гарадское асяроддзе.

Я і сама займаюся апрацоўкай здымкаў і вёрсткай, але ведаю, і студэнтаў таму вучу, што ў працы сэнс ад камп’ютара ёсць толькі тады, калі ты ведаеш, што табе ад яго патрэбна. Думаць трэба сваёй галавой. Урэшце, сама наша навучальная праграма спрыяе развіццю творчых здольнасцяў студэнтаў. Тут ёсць месца і прагматызму, і фантазіі. Скажам, студэнты мусяць прадставіць уласнае бачанне горада будучыні, разабрацца з асаблівасцямі стыляў розных эпох, а разам з тым унесці канкрэтныя прапановы па рэканструкцыі сістэмы транспартных камунікацый Мінска. Нездарма выпускнікі БНТУ, якіх я асабіста ведаю, працуюць у Нідэрландах, Германіі, Расіі. Адукацыя ў нас якасная, і мне вельмі крыўдна, калі пасля атрымання дыплома архітэктар на працы не можа скарыстаць атрыманыя ў ВНУ веды і паступова дэградуе як прафесіянал, альбо калі ён з’язджае за мяжу.

З іншага боку, да таго факту, што Беларусь — невялікая краіна ў вялікім свеце, фактычна пазбаўленым межаў, трэба ставіцца па-філасофску і прымаць як дадзенасць. Кажуць жа, што калі са студні не браць ваду, дык яна зарастае. Можа наканаванне нашай краіны — быць для навакольнага свету і гэткай студняй, крыніцай ідэй і адмыслоўцаў, здольных рэалізаваць ідэі…

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Пра вопыт культурных праектаў

Аляксей ВАРСОБА,
лідар гурта “Port Mone”

Мая патрэба ў судакрананні з публікай, а шырэй — з жыццём у месцах, далёкіх нават ад абласных цэнтраў, няхай гэта будуць мястэчкі Беларусі, Украіны ці Польшчы, звязаная з дзвюма акалічнасцямі.

Першая з іх знаёмая кожнаму, хто выязджае раз-пораз за межы горада. Усім нам хаця б аднойчы ды трапляўся забіты дошкамі (або нават згарэлы) будынак сельскага клуба. Калі я ўпершыню ўсвядоміў маштаб гэтай з’явы, рэакцыяй было наіўнае жаданне распачаць які-небудзь рух, каб вярнуць у гэтыя пабудовы жыццё, метафарычна “выдраць” цвікі з тых дошак. Мяркую, такое жаданне зразумелае любому, хто праводзіў канікулы ў вёсцы, дзе дыскатэка або кіно ў клубе былі абавязковым атрыбутам лета. Цяпер адладжаная за савецкім часам сістэма сельскіх клубаў, з кіраўніком, кінамеханікам ды народным калектывам, знікае на нашых вачах, пакідаючы па сабе мала што. А шоу-бізнес так і не наступіў сваёй пятой у гэтыя краі. Другі пункт звязаны з маім даўнім імкненнем зразумець, адчуць, хто ж такія “мы” — як край, як культурны арэал, як чалавецтва нават. І гэта немагчыма без выхаду за лакальныя рамкі, без знаёмства з дыялектамі, без пашырэння карціны свету. Такое становішча параўнальнае з целам, канечнасці якога анямелі ды атрафіраваліся. У гэтым сэнсе любы рух ратуе.

Вось таму я з вялікім задавальненнем пагаджаюся на ўдзел у праектах, звязаных з выступленнямі ўдалечыні ад абласных цэнтраў. Што можа спрацаваць для рэалізацыі культурнай ініцыятывы ў сітуацыі адсутнасці канкурэнтнага рынку культурных паслуг? Мой досвед кажа пра тое, што рэалізаваць у рэгіёнах праекты не масавага, не забаўляльнага характару здольная толькі згуртаваная каманда аднадумцаў з эфектыўным каардынацыйным цэнтрам. Проста жадання ці згоды артыста недастаткова. Спектр задач — ад тэхнічнага забеспячэння, рэкламнай кампаніі, прыцягнення фондаў і спонсараў да бясконцых матывацыйных гутарак з мясцовымі ўладамі, ад якіх трэба дамагчыся, як мінімум, дазволу на выступленне, а мо і дзейснай дапамогі.

Сёлета трыа “Port Mone” паспрабавала ажыццявіць ідэю тура па Беларусі. Падкрэслю, наша жаданне насіла не камерцыйны, а хутчэй даследчыцкі характар. Задума палягала ў пашырэнні геаграфіі канцэртаў па Беларусі ды пошуках акустычна цікавага месца для запісу наступнага альбома. Мы зрабілі шырокую рассылку сваіх кантактаў з просьбай дапамагчы ў арганізацыі на месцах. Прасілі дамовіцца з канкрэтнай кропкай, няхай гэта будзе касцёл, дом культуры, закінуты клуб або свіран, арганізаваць апаратуру ды транспарт. “Кошт пытання”, як правіла, не сягаў нават за 2 мільёны рублёў, уключаючы толькі транспартныя выдаткі ды арэнду тэхнікі. Было некалькі водгукаў, але па заканчэнні месяца вынік мінімальны. Зараз я ўжо разумею, што намі быў няўдала абраны момант, ды і стратэгія адпачаткова аказалася няслушнай. У гэтым, вядома ж, няма каго вінаваціць. І мне зразумела, што каб намі былі прыкладзеныя намаганні, параўнальныя з намаганнямі агенцтва або тур-менеджара, то ідэю рэалізавалі б. Але дзейнасць музыканта дрэнна сумяшчаецца з адміністрацыйнымі абавязкамі, а свайго адміністратара ў “Port Mone” няма…

Але ёсць і станоўчы вопыт. Сёння я прымаю ўдзел у двух праектах, якія прынцыпова задзейнічаюць рэгіёны і рэалізуюцца калектыўна. Гэта міжнародны мультыдысцыплінарны праект “Розділовы” ўкраінскага агенцтва “АртПоле” ды айчынны праект “Мова нанова” каманды пад кіраўніцтвам Глеба Лабадзенкі. “Розділовы” існуе з 2012 года і кожны тур — новы маршрут. Штораз супрацоўнікі агенцтва праводзяць падрыхтоўчую работу, канцэрты часта праходзяць на нестандартных пляцоўках, сярод якіх — музеі, планетарыі, аб’екты гісторыка-культурнага значэння... На практыцы гэта азначае ўскладненне задачы, бо трэба асобна дамаўляцца з кіраўніцтвам пляцоўкі, атрымліваць дазвол у мясцовых уладаў (тут няма наладжанай ды адпрацаванай схемы, як у клуба або канцэртнай залы). Але за кошт нетрывіяльнасці месца, атрымліваецца прыцягнуць туды новую — “сваю” — публіку. Самым важным, на мой погляд, з’яўляецца тое, што высокаматываваная каманда знаходзіць неабыякавых паплечнікаў на месцах. Гэтак намацваюцца своеасаблівыя нервовыя вузлы, сетка аднадумцаў, якія злучаюцца разам на значнай частцы тэрыторыі краіны-суседкі.

Сёлета ж наш з Ірэнай Катвіцкай дуэт “Агата” быў запрошаны да супрацоўніцтва са згаданымі моўнымі курсамі. За два месяцы выступілі ў Брэсце, Гродна, Гомелі, Астраўцы, Баранавічах, Маладзечне, Бабруйску. Вядома, такая хуткая ды лёгкая для нас рэалізацыя стала магчымай дзякуючы наяўнай сетцы курсаў, але ў першую чаргу — зладжанай працы праекта. Гарады — розныя, а заўсёды вельмі цёплая, прыязная атмасфера ды матываваныя любоўю да культуры сваёй краіны слухачы. Так што проста “выдраць” цвікі з тых дошак недастаткова. Важна выявіць людзей, якім гэта патрэбна, і аб’яднаць іх.

Занатаваў Алег КЛІМАЎ

Этніка запатрабаваная

Галіна МЯШКОВА,
дацэнт кафедры мадэлявання адзення і ткацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства

Тое, што сцвярджаецца ў якасці эталона ў прызнаных цэнтрах моды, імгненна распаўсюджваецца па свеце. Але пры гэтым у адзенні застаюцца актуальнымі нацыянальныя матывы і традыцыі. Ёсць сусветныя брэнды, але ёсць і ўласна беларуская мода.

Нават у часы матэрыяльнай нястачы і цяжкіх выпрабаванняў, людзі імкнуцца выглядаць прыгожа. Таму і не дзіўна, што ўжо праз тры гады пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі быў створаны на ўзор усесаюзнага рэспубліканскі Дом мадэляў. Напачатку ён ўяўляў сабой лабараторыю са штатам у 21 чалавек. І гэта невялікая каманда за першы год свайго існавання распрацавала 380 мадэляў вопраткі багатага асартыменту. Дадам, што спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй пачалі прыходзіць у наш Дом мадэляў толькі з 1952 года.

У 1950-х у беларускіх распрацоўках адзення пераважалі этнічныя матывы. На тканіну часта проста пераносіліся народныя арнаменты. Гэтая ж традыцыя арыентацыі на народнае мастацтва існавала і ў 1960-х, але у больш прэзентабельных формах, калі арнамент быў не столькі аздобаю вопраткі, колькі крыніцай натхнення мадэльераў. Былі калекцыі, якія спецыяльна распрацоўвалі для прэзентацый у Індыі, Японіі, Францыі... Тое сталася нашым пасылам свету. Да ўсяго, айчынны Дом мадэляў у Савецкім Саюзе ўваходзіў у тройку вядучых цэнтраў моды — Масква, Ташкент, Мінск. І першым у СССР перайшоў на метад “мадэль-канструкцыя”. Сутнасць яго ў тым, што дызайнер і канструктар працуюць разам. Адначасова ствараецца і вобраз, і канструкцыя. Мадэль можна адразу, без пераробак, запускаць ў вытворчасць, бо яна зыходна адаптаваная да наяўнай тэхналогіі. Для свайго часу гэта была навацыя.

Рэспубліканскі Дом мадэляў сабраў пад сваім дахам усіх мадэльераў Беларусі. Фактычна гэта быў інстытут моды. На фабрыках мадэльераў не было. Асабіста я падчас работы ў Доме мадэляў курыравала тры фабрыкі — выязджала, рабіла заданні. З 1970-х без візы і рэкамендацыі Дома мадэляў у рэспубліцы не выпускаўся ніводзін швейны выраб. У БРДМ (з 1988 года — Беларускі Цэнтр Моды) ладзіліся метадычныя нарады, на якія збіраліся кіраўнікі фабрык. Можна сказаць, Дом мадэляў фактычна кіраваў швейнай вытворчасцю. Гэта акалічнасць дазваляла беларускай індустрыі адзення высока трымаць планку якасці. Бо спецыялісты БРДМ/БЦМ сваю справу ведалі. Яны шчыльна супрацоўнічалі з аналагічнай маскоўскай структурай, мелі доступ да замежных друкаваных крыніц і магчымасць на свае вочы бачыць, што робіцца за мяжою. Такая цэнтралізацыя для свайго часу была з’явай, безумоўна, станоўчай. Але захаваць яе ў новых эканамічных умовах не ўяўлялася магчымым. Сёння жыццё прымушае прадпрыемствы лёгкай прамысловасці не дырэктыў з цэнтра чакаць, а самастойна дбаць і пра тое, дзе набыць тыя ж тканіны, што з іх вырабіць і як прадаць гатовую прадукцыю.

Адпаведна, сёння свае кіруючыя, каардынуючыя функцыі БЦМ у значнай ступені страціў. Штат моцна скарочаны, засталося ўсяго некалькі мастакоў-мадэльераў, а замест метадычных нарадаў у сталіцы цяпер ладзяцца фестывалі моды з выразным камерцыйным складнікам.

Нашы студэнты дасведчаныя і ў нацыянальнай традыцыі, і ў сусветных трэндах. Часта яны імкнуцца працаваць не ў нейкай установе ці на прадпрыемстве, а мець уласную справу. Пры гэтым усведамляюць, што ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі можна дасягнуць поспеху, толькі прапанаваўшы вытворцу і спажыўцу нешта асаблівае. Сталічны Тыдзень моды дае магчымасць маладым творцам праявіць сябе. Добра, што спонсарамі падобных імпрэзаў часта з’яўляюцца дзяржаўныя прадпрыемствы, кіраўніцтва якіх такім чынам дэманструе зацікаўленасць ў тым, каб была беларуская мода, беларускі стыль. Зноў актуальнай становіцца этніка. Бо апрануцца для зручнасці можна у што заўгодна, але калі хочаш, каб у табе пазналі беларуса, дык варта выпрацоўваць нацыянальны стыль. А тое, што нашы фестывалі прыцягваюць творцаў з Еўропы, сведчыць пра запатрабаванасць нашай культуры і яе канкрэтных складнікаў у глабальнай прасторы.

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Дзяжурны па нумары

“К” шмат пісала пра фотавыставы на “вясковую” тэматыку. У наступных нумарах працягнем тэму. Калі падлічыць, іх з пачатку года адкрылася ў Мінску аж 8, у тым ліку мая — “Этнавандроўкі”. Чаму ж усіх цягне на вясковую “экзотыку”? Чаму толькі ў фотажанры? Гарадскіх часопісаў, напрыклад, процьма, а тэкстаў пра вёску ў іх амаль няма.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Фота Замкаддзя

На мой погляд, фота з Замкаддзя, скажам так, ва ўласнай краіне сёння для 20-гадовага мінчаніна — амаль такая ж экзотыка, як з Афрыкі. Гадуючыся на “асфальце”, без вясковых бабуль і дзядуль, сучасны малады чалавек успрымае вясковую культуру як чужую, незразумелую, аджылую — якую заўгодна, але не сваю. Больш за тое, грамадства настолькі дыверсіфікаванае, што падлетку, які наведвае гімназію ў цэнтры, вельмі складана паразумецца з навучэнцам ПТК. Пачалося гэта з 1990-х, калі не стала хоць бы і ўяўнай роўнасці постсавецкіх гараджан, а вясковы лад жыцця разбурыўся яшчэ раней. “Цяпер не трэба нікуды ехаць, тубыльцы ў нас на суседняй вуліцы” — заўважыў пецярбургскі антраполаг Ілья Уцехін на нядаўняй сваёй лекцыі “Камера як даследчыцкі інструмент у сацыяльных навуках”.

Ну, добра, “вясковае” фота — экзотыка. Матэрыялы з народных святаў і абрадаў добра праглядаюцца на інтэрнэт-сайтах. Тады чаму няма ў апошнія гады сур’ёзных літаратурных ці аналітычных тэкстаў? Чаму урбаністыка — модны і запатрабаваны кірунак навукі, а пра “вясковыя доследы” нешта нічога не чуваць? На мой погляд, адказ просты: людзі развучыліся чытаць тэксты, яны спажываюць кантэнт, прычым мультымедыйны, з інфаграфікай ды іншымі “фішкамі”. На згаданай лекцыі ішла гаворка і пра тое, што даследчык не можа быць аб’ектыўным. Нешта ён заўважыць, другое не, іншае адмыслова прапусціць. Залежыць ад мэты: даследаванне гэта ці ўсё ж мастацкі праект? Залежыць ад бэкграўнду: ці хопіць адукацыі і досведу не выдаць свае фантазіі ці жаданні за рэальнасць?

Не так даўно апублікавалі развагі амерыканскага фатографа і пісьменніка Тэджу Коўла, дзе той параўноўвае падыходы да фатаграфавання Індыі Сцівам МакКары і Рагубірам Сінгхам. Першы — амерыканец. Індыю ён здымаў праз пастановачныя партрэты, яркія фарбы, пошукі праўдзівай даўніны. Да таго ж МакКары па магчымасці ігнаруе праявы сучаснага жыцця. Сінгх — індыец, імкнуўся паказаць сваю краіну як яна ёсць: і сучасныя тэхналогіі, і бруд на вуліцах.

Дык што нам здымаць і запісваць у беларускай вёсцы? Прасіць прыбраць з кадра абразы ці лавіць адбітак сонца на залатых зубах бабуль? Фіксаваць “правільныя” каляндарныя ды сямейна-абрадавыя песні, ці жорсткія рамансы і перапрацоўкі літаратурных твораў таксама? Раней, робячы запіс экспедыцыйных гутарак, я шукала толькі этнаграфічныя звесткі, прапускаючы “развагі пра жыццё”. А гэта ж скарб з погляду і сацыялогіі, і культуралогіі!

К

Грос без ваўкоў

Аляксей Грос нарэшце вызначыўся з кампазіцыямі, з якімі ён выступіць на Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2016", што пройдзе ў рамках фестывалю "Славянскі базар у Віцебску". Як вы памятаеце, каманда нашага ўдзельніка звярнулася да меламанаў краіны, а таксама да прафесійных аўтараў, каб тыя прапанавалі варыянты песень на беларускай мове ды кампазітара славянскай краіны (на славянскай мове), якія Аляксей мог бы праспяваць у рамках сваёй праграмы.

Алег КЛІМАЎ

Усяго паступіла 72 заяўкі з усіх абласцей Беларусі. Увогуле, прафесіяналы адгукнуліся на ініцыятыву без асаблівага запалу (хіба вядомы кампазітар і прадзюсар Яўген Алейнік прапанаваў свой варыянт). Сустракалася ж у прапанаваным матэрыяле ўсялякае, напрыклад, такі аўтарскі тэкст: "Мое сердце открыла запасными ключами. Ты мой ангел хранитель за моими плечами. Ты всё то, что мне нужно. Пред тобой безоружен. Буду я с тобой нежен и отважен к тому же. Хочешь — стану я другом. А захочешь — то мужем. В небе вороны кружат и наводят ужас…"

Нарэшце, выбар спыніўся на трэку "Ой, дожджык ідзе…" ансамбля "Песняры", дзе першапачаткова саліраваў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Дайнэка. Прапанова паступіла ад Таццяны Каваленка з Гомеля. Кампазіцыя задаволіла ўсе запыты каманды Гроса: яна не "заезджаная", на беларускай мове, словы — народныя, музыка належыць народнаму артысту Беларусі, народнаму артысту СССР Уладзіміру Мулявіну. Тым больш у год юбілея творцы будзе сімвалічна, калі яна прагучыць у паўфінале конкурсу ў віцебскім Летнім амфітэатры. Асучасніць кананічную аранжыроўку ўзяўся Максім Пугачоў з "Беларускіх песняроў", ён жа з дапамогай сесійных інструменталістаў і пад пільным кіраўніцтвам Леаніда Шырына (музычнага прадзюсара Аляксея) запісваў ды зводзіў дарожку.

Другую ж песню — "Я хачу" Пятра Ялфімава — "знайшла" педагог Гроса па вакале Людміла Куц. Над ёй таксама "чараваў" Пугачоў, ператвараючы твор з кампазіцыі з рок-адценнямі ў больш мяккі акустычны варыянт. Яна прагучыць у другі дзень конкурсу — у фінале (у які, мы ўпэўненыя, Аляксей абавязкова выйдзе), у суправаджэнні Заслужанага калектыву нашай краіны Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга. Нагадаем, Ялфімаў, што дабраславіў Гроса на выкананне, стаў уладальнікам Гран-пры гэтага конкурсу ў 2004 годзе...

Аляксей Грос.

Нечаканасцю ж з'явілася тое, што артыст замяніў сваю другую фінальную песню — джазавы стандарт "A Song For You", які ён выконваў у адборы да конкурсу і які збіраўся праспяваць у Віцебску. Прычынай стала тое, што гэтая кампазіцыя, разам з дзвюма іншымі, паказвалі Аляксея нібы з аднаго боку — як выканаўцу балад. Іншыя адценні іміджу спеваку зараз павінен надаць супершлягер "It's My Life" амерыканскага гурта "Bon Jovi", аранжыроўкай якога займаліся музыканты мінскага калектыву "Радыёхваля".

Ніякіх ваўкоў — у выглядзе жывым або галаграфічным — побач з Аляксеем на сцэне не будзе. Не будзе і стрыптызу. Дэманстраваць сваю творчую форму ён стане песнямі. Артыст жа едзе ў Віцебск перамагаць, ці не так?

К

Ансамбль Баранавіцкага музычнага каледжа і саліст Раман Чыжык. / Фота Аляксандра НІКІЦІНА

Гран-пры VI Міжнароднага конкурсу джазавай і эстраднай музыкі ў Салігорску "Jazz-time-2016" здабыў выканаўца на трамбоне 10-гадовы Ілья Кісялёў з гарпасёлка Чырвоная Слабада Салігорскага раёна (педагог Сяргей Дубовік). Іншыя вынікі — на сайце Jazz-time.by. Ну а каманда арганізатараў на чале з дырэктарам мясцовай Дзіцячай школы мастацтваў Алегам ШЧЭРБАВЫМ правяла гіганцкую працу. Пра тое, што засталося амаль нябачным для канкурсантаў і гледачоў, мы і пагутарылі, не абмінаючы праблемныя пытанні.

Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ, Мінск — Салігорск — Мінск

Джаз-фэст у ДШМ

Тэхналогія ад канала да фінала

— Сёлета мы не рабілі рассылак з запрашэннямі на ўдзел па Беларусі. Людзі ўжо самі цікавіліся, што і як будзе. Раней да нас прыязджала ад 200 да 300 чалавек. Але сёлета ў Салігорск прыехала каля 700 удзельнікаў. З адной толькі маскоўскай школы імя Гайдна прынялі 50 асоб.

— Але такое ўражанне, што пра конкурс у Беларусі ведаюць далёка не ўсе…

— Згодны. Гэтым годам былі свае нюансы: мы заснавалі новую намінацыю — джазавы вакал. І таму вымушаны былі пралічыць, колькі нам чакаць удзельнікаў у гэтай намінацыі, разумеючы, што адзін дзень цалкам будзе аддадзены вакалу. І конкурс працягваўся не тры, як звычайна, а ўжо чатыры дні. Праграму астатніх конкурсных дзён склалі выступленні прадстаўнікоў музычных школ і сярэдніх спецыяльных устаноў. Таму, зразумела, канкурсантаў нам хапае. Іншая справа, што геаграфічна не ўсе рэгіёны Беларусі былі прадстаўлены роўна: Віцебская вобласць была слаба заяўлена, Магілёўская, толькі часткова Гомельская.

— А як раптам усе ахвочыя пажадаюць прыехаць да вас? Што дапаможа вам не захлынуцца ў колькасці заявак?

— Выйсцем можа быць дадатковая зала. Але гэта будзе вымагаць і большага фінансавання. Вялікая ж колькасць заявак запатрабуе папярэдняга праслухоўвання для адбору паводле ўзроўню падрыхтоўкі.

— Пакуль у конкурсе ўдзельнічаюць тры краіны: Беларусь, Украіна, Расія. Ці мяркуецца пашырэнне геаграфіі і што таму замінае?

— Тыя спробы, якія ўжо рабіліся, нібыта і атрымлівалі падтрымку з краін, з якімі мы звязваліся. Гэта Латвія, Літва, Польшча, маем кантакты з Францыяй, Германіяй і Казахстанам. Але адным далёка ехаць, іншым замінаюць візавыя праблемы, хоць апошняе і можна вырашыць у рамках культурнага абмену. Многія збіраюцца прыехаць, але ж у апошні момант нешта іх спыняе.

— Сёлета, як вы згадалі, з'явілася намінацыя "джазавы вакал". Дзеля чаго? Ці апраўдала яна сябе?

— Сам конкурс быў задуманы не для паказальных выступленняў, а для развіцця напрамку джазавага выканальніцтва. А гэта — своеасаблівы род музычнага мыслення, здольнасць самім ствараць музыку і імправізаваць. І вакалісты ў гэтым сэнсе — не выключэнне. Дзякуючы конкурсу "Jazz-time" толькі ў Мінскай вобласці адкрыліся 11 джазавых аддзяленняў у ДШМ. Але ў іх, як мы заўважылі, практычна не існуюць класы джазавага вакала. Вучаць проста эстрадным спевам, але не джазавым. І калі некалькі гадоў таму "белай плямай" былі дзіцячыя эстрадныя аркестры, ансамблі, дык сёння яны ўжо зрабіліся фактам. Ёсць каго паслухаць. Таму нам падалося, што цяпер джазавы вакал выглядае як тая "белая пляма", і з гэтым таксама трэба пачынаць працаваць, актывізаваць працу на пачатковым этапе. Я ўпэўнены, што праз некаторы час мы пачуем тых вакалістаў, якія выраслі дзякуючы "Jazz-time". І першы для іх конкурс паказаў, што праблемы ў гэтай галіне ёсць. Існуюць асобныя цэнтры, дзе нешта спрабуюць рабіць, аднак прафесійных джазавых школ па вакале няма.

Уладальнік Гран-пры Ілья Кісялёў. / Фота Пятра ПЕЧКУРОВА

— Памятаю першыя конкурсы, калі ці не палову прызоў бралі прадстаўнікі Салігорска. Цяпер усё інакш. Канкурэнцыя для вас як гаспадароў — плюс ці мінус?

— Апошнім часам навучэнцаў і педагогаў я скіроўваю на тое, каб паказваць годны ўзровень падрыхтоўкі, тым больш мы гаспадары. Як гаспадары, мы рыхтуемся загадзя, а таму і вынік павінен атрымлівацца як мага больш якасны. Маем залу, інструменты, дасведчаных музыкантаў, якія могуць выступаць як рытм-секцыя. І таму магчымасці перамагаць ёсць пры ўмове добрай падрыхтоўкі. Што да канкурэнцыі, дык да нас прыязджаюць прадстаўнікі джазавых школ Кіева, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Растова-на-Доне, Яраслаўля. А таму нашы канкурсанты павінны быць гатовыя да таго, што сустрэнуцца з моцнымі канкурэнтамі, і неабходна імкнуцца да таго, каб на роўных з імі спаборнічаць. Нагадаю, што толькі на самым першым конкурсе ў 2006 годзе Гран-пры застаўся ў Салігорску. І больш такога не было, хоць сёлета мы і наблізіліся да высокага месца. Да Гран-пры не хапіла дробязяў.

— Сёлета ўсе канцэрты трансляваліся ў "Youtube". Гэта даніна модзе ці яшчэ адзін спосаб прасоўвання?

— Мы даем магчымасць тым людзям, якія не здолелі трапіць на канцэрты, усё ж быць з намі ў рэжыме рэальнага часу. А тыя, хто глядзеў канцэрты, маглі аналізаваць узровень выканання. Другі момант: гэта стымулюе сяброў журы, каб не падцягнуць кагосьці на больш высокае месца. Максімальная аб'ектыўнасць спрыяе якасці. Да ўсяго, кіяўляне казалі, што за выступленнямі іх піяніста сачылі ці не ўсе навучэнцы школы, якую ён наведвае. І хлопчык, канешне ж, адчуваў падтрымку. Тое ж і з адэсітамі, якіх віншавалі праз мэйлы і допісы ў сацсетках.

— Выказвалася ідэя на базе вашай ДШМ ладзіць летнія джазавыя майстэрні. Замінае адсутнасць фінансавання?

— Грошы можна адшукаць. Але найперш неабходна правесці маніторынг, для каго гэту джазавую школу адкрываць. Высветліць, колькі дзяцей і якога ўзроўню падрыхтоўкі змогуць прыехаць. Бо займацца ў такой школе азамі джазу сэнсу няма. Выкладаць жа павінны педагогі з бездакорным аўтарытэтам. А слухаць іх — людзі з дастатковай падрыхтоўкай. Таму я планую распачаць абмеркаванне гэтай ідэі на сайце Jazz-time.by. Скажам, сёлета з'явіліся прапановы выдання нотнай літаратуры па матывах конкурсу. Гучыць шмат аўтарскай музыкі, выконваюцца розныя аранжаванні класічных мелодый. Гэта і творы з рэпертуару "Apple Tea", аркестра Аляксандра Ліпніцкага, музыка Уладзіміра Ткачэнкі, Алены Атрашкевіч. Але аказалася, што ўвасобіць нават такую рэч няпроста з розных прычын...

— А чаму ў вас, дырэктара, здавалася б, звычайнай ДШМ, усё гэтак атрымліваецца?

— Кажу за ўвесь калектыў, з якім рыхтавалі і праводзілі конкурс "Jazz-time". Мы не ходзім на працу, мы ёй жывём, як бы гучна ні было тое сказана. Мы служым, як кажуць у тэатры.

— Цікава, а якую музыку вы асабіста слухаеце ў тыя моманты, калі можна з палёгкай уздыхнуць ды расслабіцца?

— Баха. Менавіта ягоная музыка дае мне магчымасць для разваг, асэнсавання зробленага. Канешне ж, маю запісы ўлюбёных джазавых музыкантаў, якія пераслухоўваю. Але ў такія моманты — усё ж Бах.

Каментарыі ад журы

Уладзімір ТКАЧЭНКА, старшыня журы, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь:

— Што мы хочам ад гэтага конкурсу? Найперш — павышэння прафесійнага ўзроўню. І калі на першых конкурсах выканаўцы на інструментах практычна не імправізавалі, за рэдкім выключэннем, дык цяпер гэта амаль норма. Як і павінна быць. Джаз і пачынаецца з умення імправізаваць. І сёлета я пачуў тых, каго ўжо можна называць прафесійнымі выканаўцамі. З гэтага для іх і пачынаецца сапраўднае джазавае мастацтва, што самае істотнае. І калі раней у многіх навучальных установах джазам наогул не займаліся, дык цяпер мы маем шмат джазавых калектываў. Для дзяцей маецца стымул: пры ўмове сур'ёзнага навучання яны могуць прыехаць на "Jazz-time" і тут паказацца. І бачна, што яны ў Салігорску выступаюць з радасцю.

Ёні Эрнст ЯНГТУН, сустаршыня журы, прэзідэнт міжнароднага джаз-фестывалю ў Крыстыянстадзе (Швецыя), прэзідэнт юнацкага музычнага таварыства Паўднёвай акругі Швецыі:

— Не магу сцвярджаць, што маецца нейкая істотная розніца паміж беларускімі і шведскімі дзецьмі, якія займаюцца музыкай, у прыватнасці — джазавай. Яны ўсе адораныя. Могуць быць адно нюансы ў методыках навучання. Я не ўпершыню прыязджаю на "Jazz-time" і бачу, што ўзровень падрыхтоўкі маладых джазавых выканаўцаў у Беларусі няспынна расце. Гэта проста кідаецца ў вочы. І вызначаць лепшых з кожным разам усё больш складана. Мяне гэта толькі радуе.

Валерый ГРАХОЎСКІ, сябра журы, прафесар, загадчык кафедры інструментальнага джазавага выканальніцтва Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных.

— Чакаў, што гэты конкурс будзе куды больш сціплы. І для мяне было вялікай нечаканасцю, што ён такі разгорнуты, хутка развіваецца, што тут прысутнічае столькі таленавітых людзей. І калі гэта надалей будзе развівацца, думаю, што "Jazz-time" чакае вялікая будучыня, што людзі, якія жывуць на гэтай зямлі, зробяцца прафесіяналамі. Я проста здзіўляюся, колькі талентаў вырасла тут! Прыкладам, у Італіі ўсе людзі спяваюць, а тут — такое ўражанне — усе на нечым іграюць.

Дачная атмасфера

Дом Быкава: музейнасць асабістага / асабістасць музейнага

Унікальны падарунак, зроблены ўдавой Васіля Быкава Ірынай Міхайлаўнай дзяржаве, па сутнасці, адкрыў новы кірунак у музейнай справе Беларусі. Гаворка пра лецішча, што знаходзіцца ў аграгарадку Ждановічы-6, дзе з 1985 па 1998 гады бавіла вольны час сям'я пісьменніка. Нагадаем, перадача ўласнасці адбылася ў 2012-м годзе, і ўжо да 90-годдзя Васіля Быкава, з дапамогай былога міністра культуры Рэспублікі Беларусь Паўла Латушкі музей-дача быў адкрыты для наведвальнікаў. Але хутка ўстанова ўзяла паўзу, каб у другі раз адчыніць свае дзверы 4 мая 2016 года.

Аліна САЎЧАНКА

Лепшая інфраструктура

Сёння музей-дача Васіля Быкава — цалкам гатовая для работы прастора, якая адпавядае свайму статусу як мемарыяльна, гістарычна (бо супрацоўнікі імкнуліся перадаць дэталі загараднага жыцця пісьменніка), так і тэхнічна: музей выконвае ўсе нормы эксплуатацыі для ўстаноў свайго кшталту. Дарэчы, для паўнавартаснага ажыццяўлення апошніх ён і прыпыняў сваю працу.

Дабрацца да музея можна наступным чынам: на рэдкіх аўтобусах з Мінска ды на аўтамабілі. Як варыянт, даехаць на ровары (гэта з уласнага, праўда, пешага вопыту: атрымалася паўтары гадзіны ад чыгуначнай станцыі "Ждановічы"). Людзі, што жывуць у сталічных мікрараёнах "Вяснянка", "Каменная горка", "Сухарава" і нават "Малінаўка" маглі б хутка дакалясіць да пасёлка. Ёсць толькі адна праблема: не хапае ўказальнікаў на музей у радыўсе 2 — 4 км ад самой кропкі. Затое ўсе санаторыі і базы адпачынку спраўна прапісаныя. Выявілася, што лепшай інфраструктурай Беларусі з'яўляюцца мясцовыя бабулі, як і стагоддзі таму, яны табе і маршрут дапамогуць пракласці, і шклянку вады вынесуць.

Абсалютная адпаведнасць

Музей-лецішча патрабуе ўкладання ўдвая большага, чым гарадскі музей. Па-першае, сезон у такой установы карацейшы: зразумела, зімой дача працаваць не будзе. Па-другое, складанасці з дарогай павінны перакрывацца задавальненнем ад пабачанага, інакш людзі папросту перастануць туды ездзіць.

Як сцвярджаюць супрацоўнікі філіяла Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, адметнасць доміка ў Ждановічах — яго абсалютная адпаведнасць быкаўскай прысутнасці там: будынак, інтэр'ер дачы, яго тэрыторыя, унутранае ўбранне. Узнавілі абстаноўку дзякуючы ўспамінам і карэктывам з боку ўдавы Быкава, а таксама архіўным пошукам. У выніку, падаецца, атрымалася не толькі атмасфера загараднага жыцця пісьменніка, але і ўсёй беларускай інтэлігенцыі апошняй трэці XX стагоддзя.

Лецішча — цагляны двухпавярховік. На першым размешчана гасцёўня з вялікім сталом на 12 асоб, камінам, крэслам-качалкай, а таксама кухня, распісаная рукамі народнага пісьменніка. Дарэчы, жывапіс і графіка (арыгіналы і копіі) сустракаюцца па ўсёй дачнай прасторы: гэта і работы самога творцы, і падарункі яго сяброў. З першага паверха можна прайсці ў гараж Васіля Быкава. Аўтамабіль, які шмат год там "начаваў", знаходзіцца зараз у сямейным карыстанні, але памяшканне ўсё роўна не пустуе. Там стаіць трохкалёсны дарослы ровар (мяркуецца, што ён быў зроблены спецыяльна для Ірыны Міхайлаўны). На белых сцянах гаража вісяць цікавыя аб'екты: карта пад назвай "Дарогі Васіля Быкава", а таксама копіі замалёвак алоўкам, якія рабіў Васіль Уладзіміравіч, натхнёны пэўнымі жыццёвымі сітуацыямі.

Лесвіца з гасцёўні вядзе на другі паверх, дзе знаходзіцца кабінет Быкава. Перад акном стаіць стол, на ім друкарка, кубачак для кавы, паперы з фрагментамі тэксту. На крэсле вісіць пісьменніцкі світар, непадалёк — кіёк, прыхілены да сцяны, насупраць — сціплая канапа. Па суседстве — пакой жонкі, такі ж мінімалістычны, але па-жаноцку ўтульны. Праз некалькі гадоў жыцця на дачы сям'я Быкавых вырашыла прыбудаваць на другім паверсе закрытую веранду: яна атрымалася вельмі сонечнай і светлай. Менавіта там Васіль Быкаў нібы пакінуў на час свой набор для жывапісу: алей, пэндзаль, эскіз будучага малюнка. Дакладна вядома, што ў гэтым пакоі Васіль Уладзіміравіч і Ірына Міхайлаўна прымалі самых блізкіх і чаканых гасцей, напрыклад, Алеся Адамовіча, з якім Быкавы вельмі сябравалі. Карацей, дом не выглядае музейнай бутафорыяй: ён, падобна да любой беларускай дачы, абшыты знутры вагонкай і поўны кніг ды пацешных дробязей. Афармленнем, дарэчы, гаспадар займаўся асабіста.

Дачны двор Быкава значна адрозніваецца ад суседскіх: ён ніколі не служыў гародам. Пісьменнік змог захаваць на ўчастку бярозы, у іх атачэнні пабудаваў альтанку. Раней кампазіцыя дапаўнялася сотняй кусцістых ружаў і вінаградзінай лазой.

Пра ўсё гэта вам ласкава раскажа малады супрацоўнік Настасся Смірнова ў экскурсіі па лецішчы. Бліжэйшай жа імпрэзай установы, наколькі вядома, стануць чэрвеньскія мерапрыемствы (19-га пісьменнік нарадзіўся, а 22-га, у гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны, памёр). Але падаецца, праграма такой незвычайнай установы павінна і можа быць больш насычанай і багатай на дзеі. У прыклад прывяду знакаміты сярод прасунутых мінчан Літаратурны музей Петруся Броўкі, у якім што ні дзень, то культурнае адкрыццё.

А што Пастарнак?

Для таго, каб не выступіць пустаслоўным крытыкам, вырашыла падабраць некалькі прыкладаў з практыкі падобных устаноў. Дом-музей Барыса Пастарнака ў Перадзелкіне — адзін з самых адметных аб'ектаў у падмаскоўным пісьменніцкім гарадку. Акрамя экскурсійнай праграмы (дарэчы, калі трэба, на англійскай ці нямецкай мове), прысвечанай загараднаму дому і пэўнаму ладу жыцця тут, творам, якія былі напісаныя ў Перадзелкіне, людзям, што сюды завітвалі, музей мае ў запасе і альтэрнатыўныя прапановы для наведвальнікаў. Гэта лекцыі, якія ўсебакова ахопліваюць асобу Барыса Пастарнака, цыклы сустрэч. Кожную нядзелю дом-музей праводзіць пяцігадзінны пастарнакаўскі пленэр для дзяцей і дарослых (вядома, што пісьменнік нарадзіўся ў сям'і мастака Леаніда Пастарнака, больш за тое — у свой час падаваў надзеі не толькі ў жывапісе, але і ў музыцы). Такая задума дапамагае не столькі прыцягненню ўвагі да лёсу і творчасці Барыса Леанідавіча, колькі заработку грошай на падтрымку культурнага праекта.

Па суседстве — дом-музей Карнея Чукоўскага, знакамітага публіцыста, крытыка, перакладчыка, але найперш — дзіцячага пісьменніка. Лецішча заўсёды поўнілася дзецьмі, якія прыходзілі ў госці да класіка. Таму і супрацоўнікі музея зрабілі акцэнт на публіцы малодшага веку і арганізавалі для яе, акрамя лекцый і экскурсій, распальванне вогнішча, што адбываецца восенню і ўвесну. Дарэчы, музей працуе і ўзімку.

Музей-дача Уладзіміра Маякоўскага ў горадзе Пушкіне сёння знаходзіцца пад кіраўніцтвам і патранатам моладзі. Ідэі, якія ажыццяўляюцца там, безумоўна, глядзеліся б дарэчнымі зусім не ў кожным загарадным літаратурным музеі. Перад домам паэта стаіць дзіцячая футурыстычная пляцоўка. А ў спісе мерапрыемстваў я знайшла "Halloween" і "Birthday Party" Маякоўскага. Не магу назваць сябе прыхільнікам гэтых задум, але амаль упэўнена: Маякоўскі іх зацвердзіў бы. З умовай якаснага і сумленнага падыходу да перформансаў, аматарам якіх ён быў і сам.

Наколькі вядома, лецішча Ахматавай у Камарове так і не стала паўнавартасным музеем. Прычын на тое, магчыма, шмат: і бюракратычныя, і фінансавыя. Але ў першую чаргу, як падаецца, справа ў памерах дачы, якую сама паэтэса называла "будкай". Выхад заўсёды маецца, калі ёсць ініцыятывы: ужо 10 гадоў у чэрвені на паляне ля дома праводзяцца літаратурна-музычныя імпрэзы, прымеркаваныя да дня народзінаў Ганны Андрэеўны.

Хто ў дапамогу?

Паўтаруся, наша краіна не мае вопыту ў стварэнні музеяў такога тыпу. Таму трэба лічыцца з гэтай сітуацыяй, падтрымліваць першапраходцаў, але і матываваць іх да новых істотных вынікаў. Бо патэнцыял музей мае вялікі. Калі вогнішчы і вечарыны з пераапрананнямі, безумоўна, музею памяці Васіля Быкава сэнсава не пасуюць (праз гэтыя прыклады хацелася, хутчэй, паказаць, як калегі працуюць з біяграфіяй знакамітай асобы), то пленэры, лекцыі, чытанні, сустрэчы, настольныя інтэлектуальныя гульні і нават выставы — іншая справа. А першыя, з кім можна спрабаваць супрацоўнічаць, — Віцебскае мастацкае вучылішча, у якім Быкаў адвучыўся да вайны, і лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святлана Алексіевіч, якая на кожнай сваёй публічнай сустрэчы падкрэслівае, што Васіль Быкаў, разам з яго блізкім сябрам Алесем Адамовічам, сталі для яе літаратурнымі настаўнікамі. Няўжо хтосьці адмовіць?

К



Так выглядае гасцёўня Васіля Быкава.

Друкарка пісьменніка.

Альтанка, пабудаваная гаспадаром дома.

Фотафакт

18 мая Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ўрачыста адкрыў экспазіцыю "У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа", якая заняла нестандартную плошчу — адзін з гаражоў у сядзібе народнага паэта. Праз рэальныя аўтамабілі Якуба Коласа музейшчыкі імкнуліся паказаць паўсядзённае жыццё літаратара. "К" яшчэ распавядзе пра гэту цудоўную экспазіцыю.

Фота Аліны САЎЧАНКА

Тактыка культурнага развіцця

Як маяк калегіум

Аршанская гарадская мастацкая галерэя Віктара Грамыкі стала месцам дыялогу маладых жывапісцаў з Беларусі і Смаленска. Сумесныя выставы ў будынку былога калегіума езуітаў сталі традыцыяй. Цяпер, да прыкладу, тут прэзентуюцца габелены мастакоў-дыпломнікаў са Смаленскага мастацкага вучылішча.

А ў красавіку музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны, галерэя Віктара Грамыкі, Смаленская арганізацыя Саюза мастакоў Расіі наладзілі выставу, дзе было прэзентавана каля шасцідзесяці графічных і жывапісных работ васямнаццаці маладых мастакоў дзвюх краін. Класіку і авангард аб'яднала свежасць погляду на свет.

У творчай прасторы няма межаў паміж народамі і культурамі, балазе пачаткоўцам заўтра наканавана працягнуць справу мэтраў. Таму двум пакаленням ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго.

Сёння маладых і перспектыўных апякуе смаленскі мастак Генадзь Русецкі. Ён згадвае, як некалькі гадоў таму на пленэры ў Вязьме пазнаёміўся з аршанцамі Мікалаем Тарандам і Анатолем Жураўлёвым. Так нарадзіўся рэгіянальны праект сумесных і абменных выстаў "Калегіум". У аршанскай галерэі ён рэалізоўваецца сёмы раз. Старшыня Беларускага саюза мастакоў, прэзідэнт Міжнароднай канфедэрацыі мастакоў краін СНД Рыгор Сітніца перакананы, што ідэя такая — надзвычай перспектыўная. "Знаёмства са смаленскімі калегамі, якія завіталі ў Оршу, — кажа ён, — абавязкова перарасце ў новыя праекты. Мастацтва — найлепшая дыпламатыя. Мы, мастакі, добра разумеем адзін аднаго".

"Калегіум-2016" аб'яднаў 32 мастакі, сярод якіх асобныя маюць званні заслужаных і народных. Адбор работ і фарміраванне экспазіцыі леглі на куратараў праекту — Мікалая Таранду і Анатоля Жураўлёва.

Карацей кажучы, «Калегіум» паспеў стаць творчым брэндам Аршаншчыны. Галоўная яго задача — паказаць шматграннасць мастацкага свету. Галерэя Віктара Грамыкі нібы пашырыла плошчы. У вялізным "аркестры" прафесійных мастакоў з Беларусі, Украіны, Расіі, Малдовы, Балгарыі, Арменіі не губляецца голас маладых, якія толькі спрабуюць станавіцца на мастакоўскае крыло.

І "Калегіум" дапамагае ў гэтым. Ці ёсць штосьці падобнае ў іншых рэгіёнах Беларусі?

Марына СЯМАШКА
Орша

"Адкрытымі вачыма"

Кадр з фільма "Канцэрт для мамы".

Паміж вёскай і горадам: пошукі і штудыі студэнцкага кіно

На мінулым тыдні ў рамках рэспубліканскай акцыі "Новы погляд: маладое беларускае кіно" адбылася прэм'ера кінаальманаха "Адкрытымі вачыма". Аўтары кароткаметражных стужак, уключаных у зборнік — студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Урэшце, акцыя, мэта якой — папулярызацыя маладога айчыннага кіно, дала магчымасць ацаніць работы рэжысёраў незалежна ад іх прыналежнасці да пэўнага статусу.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Кадр з фільма "Гульні са смерцю".

Прызнацца, фільмы студэнтаў Акадэміі мастацтваў неяк выпалі з поля ўвагі на фоне гучных перамог і заявак незалежнага кіно, якое, нарэшце, праявіла сабе. Але навучальны працэс у дзяржаўнай установе не супыніўся з прыходам незалежных кінематаграфістаў, і на суд гледача ў мінулы чацвер былі прадстаўлены работы студэнтаў майстэрні Рэнаты Грыцковай.

Гэта далёка не першы "выхад" на вялікую аўдыторыю кароткаметражных стужак навучэнцаў курса. Прынамсі, у Нацыянальным конкурсе "Лістапада-2015" прымаў удзел фільм "Кактус" Андрэя Кашперскага, ды і работы Нэлі Васілеўскай траплялі ў спаборніцтвы разнастайных форумаў — гаворка ў дадзеным выпадку пра "Заплюшчы вочы", які заяўлены ў кінаальманаху. Таксама пэўны фестывальны лёс маюць і "Гульні са смерцю" Алеся Камякова, і "Канцэрт для мамы" Ягора Бякава. Выключэнне — апошняя работа спадарыні Васілеўскай "Мой брат", зробленая сёлета, прэм'ера якой адбылася на кінапаказе. Словам, у кінаальманаху былі сабраныя стужкі, скажам так, не дэбютныя. Тэматычнай лініяй для зборніку стала тэма дзяцінства.

Што ж выявіў "Адкрытымі вачыма"? Безумоўнай яго вартасцю можна назваць тэматычны фокус — асабістыя стасункі, свет дзіцяці, сям'я як пэўная мадэль грамадства. Усё гэта прастора, вартая даследавання, рэфлексій і багатая на адкрыцці. Тым больш цікава, якім чынам апошнія адбываюцца ў маладога пакалення і што, уласна, выяўляюць.

У гэтым сэнсе чымсьці блізкімі па ўзнятых пытаннях мне падаліся стужкі "Кактус" Андрэя Кашперскага і "Заплюшчы вочы" Нэлі Васілеўскай. "Кактус" — гісторыя дзіцяці, якому давялося перажыць знаёмства са сваім сапраўдным бацькам. На святкаванне 6 гадоў сына апошні ўпершыню прыйшоў пазнаёміцца з хлопчыкам. Прастора сельскага дома ля чыгункі — месца дзеяння драмы, што адбываецца, шум цягнікоў — тое, да чаго з цягам часу прывыкаеш. Кактус — гэты падарунак бацькі сыну, — "вожык у гаршчочку", — нечаканы боль, які напаткае галоўных асоб дзеяння.

У фільме шмат цікавых дэталяў, мізансцэнаў, якія дадаюць дадатковых нюансаў асяроддзю, у якім расце шасцігадовы хлопчык. Дастаткова пераканаўчай атрымалася роля небаракі-бацькі, які прынёс сыну не толькі калючую расліну, але і планшэт, паспрабаваўшы наладзіць кантакт з хлопчыкам. Аднак сапраўднага знаёмства так і не адбываецца: бацьку выстаўляюць з двара дому, дзе ладзяцца святкаванні. Услед яму ляціць і кактус — як боль, што наўрад ці калі-небудзь загоіцца. Бацька так і не зойдзе ў дом, так і не вернецца ў сям'ю.

У нечым падобная прастора дзеяння — у стужцы Нэлі Васілеўскай "Заплюшчы вочы". Таксама — сельскі дом, але ўжо не ля дарогі, а недзе ў глушы; там сям'я — маці і дзяўчынка. Дзяўчынка чакае маці (у яе ролі Наталля Лявванава) з працы, а тая, прыйшоўшы дадому, пачынае прыхарошвацца для свайго кавалера. Для дачкі каханак маці — чужы. З-за яго пэўны час дзяўчынку не пускаюць у дом. Гэта той, хто адбірае ўвагу, любоў дарагога чалавека. І дзяўчынка адгукаецца на гэту нястачу ўвагі сваёй дзіцячай жорсткай рэакцыяй, міжволі дэманструючы маці яе заганы. Цікава, што ў гэтай карціне сітуацыя супрацьлеглая першай — у сям'і няма ладу, таму што мужчына нават і не прэтэндуе на бацькоўства, а маці да канца — праз мужчыну — не належыць дзіцяці. Але дачцэ і матулі ўсё ж такі ўдаецца паразумецца — "расплюшчыць вочы" адна на другую, хоць у гэтай гісторыі, па шчырасці, матывацыя герояў пазначана пункцірам.

Адметна, што ў стужках асаблівую ролю адыгрываюць і жывёлы. Яны — частка асяроддзя, дзе жывуць дзеці, яны — такія ж удзельнікі драм. У "Заплюшчы вочы" коткі, сабака, каза, гусі дапаўняюць прастору, насычаную гукамі, шумамі сельскага жыцця. Нават апошняя сцэна фільма, дзе маці і дачка не маюць патрэбы ў трэцім, — адбываецца ў садзе, што квітнее, дасылаючы да метафары выраю. Цікава, што ў абедзвюх стужках людзі, якія прыязджаюць з гораду — гэта чужынцы: і бацька-небарака з планшэтам ды кактусам, і каханак. Першы — ужо не патрэбны, другі — яшчэ не, няглядзячы на тое, што дорыць дзяўчынцы хамячка. Але для яе, раззлаванай, пушысты гадаванец — усяго толькі "грызун", месца якому — у мышалоўцы. Дзіўная рэч, але патрыярхальны лад жыцця перамагае ў гэтых стужках, пакідаючы гораду і яго каштоўнасцям месца чужыны. Цалкам дарэчы тут згадаць словы кінакрытыка Максіма Карпіцкага, які звяртае ўвагу на дамінанту сельскай тэмы ў беларускім кіно — працуючы з ёй як з асяроддзем, маладыя кінематаграфісты цікава адкрываюць яе сацыяльнае вымярэнне.

Кадр з фільма "Заплюшчы вочы".

Кадр з фільма "Мой брат".

Кадр з фільма "Кактус".

Горад трохі выяўляецца ў іншых дзвюх работах: "Гульні са смерцю" Алеся Камякова і "Канцэрт для мамы" Ягора Бякава. Бясспрэчнай вартасцю першай карціны з'яўляецца акцёрская работа Вячаслава Паўлюця, што бліскуча ўвасобіў вобраз Смерці. Другая кароткаметражка трапляе ў фармат змястоўна распаведзенай гісторыі, але пры ўсёй шчырасці не выходзіць за межы добра зробленага практыкавання. Гэта прыклады акадэмічных студэнцкіх прац, але ў іх цяжка гаварыць пра аўтарскі почырк, персанальны стыль, які хочацца адзначаць разам з працай гукаапаратара ці аператара. І ў гэтым сэнсе гораду як сацыяльнай фармацыі так і не ўдаецца нарадзіцца.

Акурат добрым прыкладам у плане аўтарскай спробы становіцца свежая стужка "Мой брат" той жа Нэлі Васілеўскай. Пры ўсіх адсылках да творчасці Андрэя Таркоўскага Нэлі ў гэтым кіно адважна спрабуе выйсці на тэрыторыю падсвядомага, сноў, не вельмі абжытую, мякка скажам, беларускімі кінематаграфістамі. Выдатная работа аператара Яўгена Вярэнева, які, здаецца, прадэманстраваў усе прафесійныя магчымасці ў 32-хвіліннай працы, прымушае паставіцца да высілкаў аўтараў з павагай. Цікава працягнуць вышэйпазначаную лінію сельскіх матываў у стужцы: тут таксама бачым дом у аддаленым месцы, сельскі двор, але "Мой брат" выкарыстоўвае мову аўтарскага кіно, іншы рытм і святлоперадачу. Адпаведна, у гэту прастору змяшчаюцца і стасункі больш незразумелыя: страты, пошуку любові, прыцягнення, рэўнасці, помсты… Трохкутнік адносін разыгрываецца паміж сынам, маці (актрыса Святлана Кажамякіна) і стрыечным братам — задача, якая вымагае пэўнай смеласці і культуры. Стужка маладой рэжысёркі, хоць і не пазбегла залішняй зацягнутасці, пэўнага самазахаплення, але яна фіксуе крок маладога кіно ў бок аўтарскага, калі важна распавесці не адно яўную гісторыю, а сказаць штосьці невідавочнае, але вартае візуальнага тэксту і вобразу. Вясковы дом на прыкладзе гэтай працы ператвараецца ў свет асабістага дзяцінства, "куфар успамінаў і страхаў". Перад намі ўжо культура гарадскога чалавека, які будуе дом не толькі як асяроддзе, дзе адбываецца дзеянне, а як самога сябе.

У гэтым сэнсе можна павіншаваць кіраўніка курса з поспехамі вучняў, які рэалізуюць падобнага кшталту пошукі побач з муштрой прафесіі. Але наколькі часта атрымліваецца спалучаць апошнюю з раскрыццём творчага пачатку маладога аўтара — пытанне, якое напаткае адразу пасля завяршэння сеансу. Што першаснае — школа ці індывідуальнасць? І як захаваць другое, каб у выніку выйграла першае? У кантэксце "свежага подыху" незалежнага кіно гэтыя пытанні становяцца яшчэ больш актуальнымі. **К**

З каго "Партрэт"?

У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі звярнуліся да Гогаля — па-беларуску. Ва ўсіх адносінах. Пераклалі ягоны "Партрэт" на беларускую мову — і на беларускую рэжысёрскую мову ў тым ліку.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Да абедзвюх "беларускіх моў" спрычыніўся мастацкі кіраўнік тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Аляксандр Гарцуеў, інсцэніроўку зрабіла Святлана Навуменка. Праз прыём стоп-кадра ў спектаклі, жанрава азначаным як трагіфарс, сплятаюцца мінуўшчына і сучаснасць, рэчаіснасць і фантастыка, сцэнічнае выкладанне і аўтарскія каментары. У цяперашнім выглядзе аповесць класіка набыла папраўдзе тэатральны выгляд, разлічаны, да ўсяго, на самую розную публіку — па ўзросце (ад падлеткаў да бабуль), па сваіх эстэтычных густах (ад прыхільнікаў модных тэлешоу да строгіх тэатральных крытыкаў), а таксама паводле ступені знаёмства з гогалеўскім першавытокам.

Апошняе важна таму, што акрамя ўласна герояў аповесці, у спектаклі з'явіўся яшчэ таямніча-"прыкольны" Чалавек у чорным (Мікалай Стонька) — сучаснае ўвасабленне Мефістофеля пад аблiччам вядучага прэзентацыі. Усюдыісны, ён належыць адначасова розным эпохам: капялюш-"кацялок" — з XIX стагоддзя, мікрафон — з сучаснасці. А замест чырвонага падкладу ў чорным плашчы-сурдуцефраку — чырвоныя шкарпэткі і такога ж колеру… "вока" мікрафона (мастак па касцюмах — Марына Алекна). Яшчэ больш размаітыя стылёвыя сумесі — у сцэнічных строях паненак, "квартэт" якіх выклікае асацыяцыі з трыма шэкспіраўскімі ведзьмаркамі.

Вельмі простая сцэнаграфія (мастак — Юрый Саламонаў) дазваляе рабіць такія ж простыя тэатральныя "цуды": праз нацягнутыя стужкі "ралетаў-жалюзі" героі быццам "праходзяць праз сцяну". Два тыповыя для гістарычных пастановак крэслы з высокімі спінкамі ператвараюцца ў кафедру на лекцыі, у ложак, вязніцу.

Увасабляць гэты сюжэт, куды больш містычна закручаны за нашмат пазнейшы "Партрэт Дарыяна Грэя" Аскара Уайльда, можна толькі тады, калі прыдуманы нейкі тэатральны ход для ўсіх партрэтных пераўвасабленняў на жывапісных палотнах. У спектаклі многае робіцца светлавымі эфектамі, накладаннем выяў, праз якія вельмі паступова праступаюць дзе намаляваныя, а дзе і жывыя рысы (мастак па святле — Сямён Давыдзенка, відэаэфекты — Лізаветы Пінігінай). Не меншае ўражанне пакідае злавесная ўсмешка Андрэя Дабравольскага ў ролі Партрэта — прызнацца, нечаканай для гэтай медыйнай асобы.

Сцэна са спектакля "Партрэт".

Сапраўдныя дзівосы адбываюцца і з галоўным героем. Андрэй Новік у ролі мастака Чарткова за час спектакля старэе на нашых вачах — без усялякага дадатковага грыму, адно праз свой акцёрскі талент: змяняецца постаць, хада, тэмбр голасу, размоўная манера, выраз твару, бляск у вачах. Нядаўні выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, ён яшчэ на студэнцкай сцэне ўдала іграў людзей сталага веку. Але яго цяперашні ансамбль з заўсёды вельмі яркім, каларытным Сяргеем Шымко (Мікіта) — вышэй за ўсялякія чаканні, прычым ва ўсе моманты, уключаючы нечаканае мужчынскае танга (дарэчы, паходжанне гэтага танца было сапраўды выключна мужчынскім — у адрозненне ад вальса, які Чарткоў танцуе з выдаўцом).

Ва ўбачаным мной складзе (а ўсяго іх два) кожны заняты артыст, нават у неазначаных ролях кшталту "ў спектаклі ўдзельнічаюць", паўстае зоркай. Чаго каштуюць адны толькі позіркі Веранікі Буслаевай, якая іграе дачку Lise, што прыйшла пазіраваць, каб з яе напісалі партрэт.

…Пасля прагляду дзве бабулечкі, вельмі ўзрадаваныя, што замест корпання на лецішчы "зрабілі сабе маленькае свята", дзяліліся ўражаннямі: "Не, не ўмее моладзь распараджацца грашыма. Так бяздарна змарнаваў такія вялікія грошы! Аддаў бы іх старым — яны збераглі б". Зразумела, кожны ўбачыць у спектаклі штосьці сваё: хтосьці — знешні антураж, блізкі масавай культуры, хтосьці — філасофскі змест. Але ж ёсць там і сэнс, надзвычай актуальны сёння не толькі для творчых асоб, але і для ўсёй нацыянальнай культуры ўвогуле. Бы той Чарткоў, нашы тэатры вымушаны стаяць перад спакусай: зарабляць грошы (пра шалёныя, як у героя-мастака, і размовы ніхто не вядзе) ці дбаць пра сапраўднае развіццё культуры, укладаючы туды ўсе сілы і не дбаючы пра прыбытак. Дык які шлях абяром?.. **К**

Сцэна са спектакля "Трысняговая шапка".

Ад яблычка да Цмока

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Умоўнасць у сцэнаграфіі і алегарычнасць лялек "Зялёнага-зялёнага яблычка" дапамагла выйсці на новыя ўзроўні асэнсавання драматургічнага матэрыялу, у якім чытаецца і неабходнасць удзячнасці ў сяброўстве, і самаадданасць матчынай любові, і чуллівае стаўленне адзін да аднаго. У літоўскім варыянце няма і пастка хэпі-энду, але раскрываецца радасць спасціжэння і ўсведамленне шчасця ў адчуванні побач блізкай асобы.

Адступленне другое. Адукацыйнае

Дарэчы, гэты спектакль (як, урэшце, і ізраільскі) пастаўлены лялечнікамі не па адукацыі: рэжысёр і мастак прыйшлі са сферы мастацтва драмы. І гэта неадназначная для тэатра лялек тэндэнцыя відавочная для кожнай з краін удзельнікаў… Больш падрабязна пра яе — у наступных нумарах.

Польскі тэатр "Baj" прывёз на фестываль кранальны дзіцячы спектакль "Гуска, смерць і цюльпан" паводле кнігі Вольфа Эрльбруха. Адштурхнуўшыся ад малюнкаў нямецкага ілюстратара, польскі рэжысёр і сцэнограф Марцін Ярнушкевіч стварыў падставу для шчырай сямейнай размовы, каб пазбавіць малечу страху смерці. Шкада, што ў Новым драматычным тэатры абстрагавацца ад памераў залы (і таму неўтульнасці яе для гэтай тэмы), ад субтытраў, якія патрабавалі засяроджанасці, змаглі хутчэй дарослыя, чым дзеці. Камернасць наблізіла б дзяцей да лялек, дапамагла б разглядзець дробязі (можа, тады ўсе пабачылі б і цюльпан, пазначаны ў афішы, але яго многія так і не заўважылі, бо здалёк ён зліўся з дэкарацыямі).

Сцэна са спектакля "Ваня. Казка пра Ваню і загадкавую рускую душу".

Сцэна са спектакля "Партрэт з лятаючым гадзіннікам. Марк Шагал "Маё жыццё — ілюстрацыі"".

Як слушна было потым зазначана ў "Сакрэтным пакоі", пастаноўкі на тэмы, ад якіх чамусьці прынята дзяцей абараняць, вельмі патрэбныя і айчынным калектывам.

Слова ці форма?

Большасць з прадстаўленых тэатраў выйшлі да гледача з планшэтнымі лялькамі. У гэтым шэрагу Пензенскі абласны тэатр "Лялечны дом" выдзяляўся ўжо тым, што да пастаноўкі знакамітай п'есы Славаміра Мрожака "Забіць Караля" абраў марыянетак. І як з імі працавалі акцёры! Бездакорна, філігранна, дэманструючы найлепшы ўзор лялечнага рамяства. Па-майстэрску прыгатаваны, пабудаваны на інтанацыйных нюансах, вырашаны ў звышрэалістычных дэкарацыях тэатр абсурду пранізліва паказаў, як хапае аднаго нават бессэнсоўнага дотыку, каб асоба сама сябе дашчэнту знішчыла…

Сцэна са спектакля "Вялікі змей". / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Гомельскі дзяржаўны тэатр лялек, наадварот, прывёз пастаноўку "Fable", вырашаную збольшага ў "жывым" плане. "Гармонію ўсеагульнага вар'яцтва" (так у праграмцы) рэжысёр Юрка Дзівакоў вырашыў перадаць праз фармальны тэатр, у якім амаль не мае значэння прамоўлены тэкст. Існасць чалавека раскрываецца праз вобразны шэраг, праз пэўныя тэатральныя прыёмы. Далася ў знакі народная пляцоўка, але ўсё ж у цікава прыдуманым спектаклі быў добра бачны патэнцыял.

Адступленне трэцяе. Музычнае

Пяцідзёнку форуму тактоўна прыправілі канцэртам групы "Нагуаль" пад інтрыгуючай назвай "Puppet rok-n-roll". Зрэшты, знакаміты канадскі "Cirque du Soleil" раз-пораз выпускае дыскі з паўнавартаснымі трэкамі кампазіцый са сваіх цыркавых выступленняў. Чаму б і нам не даць другое жыццё музыцы, якая дапамагае рэжысёру раскрыць драматургічныя вобразы? Балазе, кампазітар і музыкант Леанід Паўлёнак "абкатаў" праграму на фестывальнай грамадзе і сапраўды задумаўся пра адпаведны рэліз. Адзначу, "музычнае шаленства" было сустрэтае "на ўра" нават тымі, хто не бачыў спектакляў-першакрыніц.

Загадкавасць душы

Не буду паўтарацца пра спакуслівую "Мандрагору" Мікалая Андрэева з Мінскага абласнога тэатра лялек "Батлейка", бязлітаснае і аскомістае, як віно з кроўю, "Інтэрв'ю з ведзьмамі" Яўгена Карняга, карцінны ў прамым сэнсе гэтага слова "Партрэт з лятаючым гадзіннікам. Марк Шагал "Маё жыццё — ілюстрацыі" Палтаўскага акадэмічнага абласнога тэатра лялек (які ўжо неаднойчы бываў у Беларусі), а таксама пра шыкоўную правакацыйна-апакаліптычную пастаноўку Ігара Казакова "На дне" Магілёўскага абласнога тэатра лялек і вытанчаную лірычна-наіўную "Фро" Руслана Кудашова ад Брэсцкага тэатра лялек, пра якія "К" падрабязна распавяла раней. Дадам толькі, што два апошнія спектаклі можна будзе паглядзець у сталіцы яшчэ раз увосень — яны запрошаны ў праграму "Belarus Open" міжнароднага форуму "ТэАРТ".

Асаблівыя чаканні фестывальнай публікі былі звязаныя са спектаклем прыватнага тэатра "Karlsson Haus" з Санкт-Пецярбургу "Ваня. Казка пра Ваню і загадкавую рускую душу" — "свежаспечаным" лаўрэатам прэстыжных прэмій "Залатая маска" і "Залаты сафіт" за лепшую працу рэжысёра і акцёра. На абодвух паказах арганізатары, паддаўшыся на ўгаворы тэатральнай суполкі, нават пагадзіліся на ўзнікненне "ніжняга шэрагу": на падлозе размясціліся акцёры, славутыя рэжысёры і вядомыя крытыкі.

І жарсці з праходам у залу былі вартыя таго: Міхаіл Шаломенцаў расклаў па паліцах архетыпы рускай душы. Рэжысёр Аляксей Ляляўскі (які выступіў да таго ж у рэдкай для сябе ролі драматурга), прапанаваў паразважаць пра вечнае памкненне да бедавання ад якой-небудзь нячыстай сілы (часам прыдуманай самім пакутнікам), пра гераічныя ўсплёскі ў барацьбе за лепшую долю асобных волатаў, якіх пасля перамогі свае ж гатовыя зжэрці… Таму толькі на першы погляд падаецца дзіўным, што ў вантробе Цмока з'едзеныя людзі… жывуць так, быццам нічога з імі і не здарылася. Вельмі зручна падманваць сябе, уяўляючы ў цемры парыжы, каб толькі не рабіць залішніх рухаў: шлях да святла патрабуе намаганняў, куды прасцей адседзецца…

To be continued?

Праграма сёлетняга фестывалю атрымалася сапраўды адборнай. І хоць дырэкцыі ў няпросты эканамічны час давялося дзейнічаць у абмежаваных умовах, яна змагла выжаць з наяўнага максімум, стварыўшы пяць дзён непарыўнага свята. Па словах выканаўчага дырэктара форуму Яўгена Клімакова, замежныя калектывы пагадзіліся выступіць у Беларусі задарма. Як бачым, мінскі фестываль мае аўтарытэт у калег. Хочацца спадзявацца, лялькі, што днямі разляцеліся па свеце, змогуць беспраблемна сабрацца ў Мінску праз два гады. Тым больш, юбілейны X Міжнародны фестываль супадзе з 80-годдзем яго гаспадара — Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. **К**

На аднаго цыркавога больш

У чацвер у Беларускім дзяржаўным цырку прайшла генеральная рэпетыцыя прадстаўлення "Я працую чараўніком", а ўчора першыя гледачы змаглі пабачыць новую праграму, дзе разам з нашымі майстрамі манежа занятыя і артысты Нацыянальнага цырка Украіны.

Алег КЛІМАЎ / Фота аўтара

Новае прадстаўленне Белдзяржцырку.

Сёе-тое пра ўбачанае распавяду. Прыемнае ўражанне, нягледзячы на некаторае хваляванне цыркавых (якое з наступнымі прадстаўленнямі, упэўнены, сыдзе). Многімі нумарамі я прасякнуўся. Скажам, назіраючы, як ішлі па арэне вярблюды пасля дрэсуры Барысам і Таццянай Лазаравымі. Як жывёлы выпісвалі плаўныя танцавальныя рухі ды схіляліся ў велічных паклонах! Успамін пра фрагмент з кінафільма "Джэнтльмены поспеху", што раздзіраў мяне спачатку, знік ужо праз пару хвілінак — вярблюды аказаліся вельмі выхаванымі! Замілаванне выклікалі гадаванцы Марыны Навасёлавай і Таццяны Пелех — бардоскія догі, такія грозныя з выгляду, але паводзілі яны сябе часам нібы шчаняты. Што адразу ж ацаніла публіка, якая выбухнула бурнымі апладысментамі ды іскрыстым смехам: паглядзець "генеральку" адміністрацыя цырка паклікала выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў, у тым ліку для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця. Ужо не першы год іх запрашаюць на падобныя прагоны, спецыяльна адпраўляючы па іх цыркавы аўтобус. Прычым з гэтага года акцыя пашырылася не толькі на адпаведныя мінскія ўстановы, але і на іншыя рэгіёны Беларусі. Больш за тое, цяпер хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць трапіць не толькі на рэпетыцыю: пры наяўнасці месцаў у зале запросяць і на само прадстаўленне.

У другім аддзяленні правіў баль Яўген Навасёлаў з атракцыёнам "Ілюзія сучаснасці", поўным светлавых ды лазерных спецэфектаў. Уразіла, як з голых далоняў штукара раптам узляцелі галубы. Быў і мой унёсак у прадстаўленні: я стаў удзельнікам рэпрызы клоўнаў і ўліўся ў імправізаваны музычны ансамбль з гледачоў. Сыграў з дапамогай вялікай металічнай лыжкі на пральнай дошцы: Рынга Стар ад зайздрасці, каб пачуў маю перкусійную партыю, кінуўся б у роспачныя слёзы. Так што на аднаго цыркавога ў нашай краіне стала больш: і прадстаўлення, і артыста!..

P.S. *Вялікі матэрыял пра зрэз беларускага цыркавога мастацтва чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў «Культуры».* **К**

Онлайн-канферэнцыя "К": клубныя нюансы

Калі ўстанову культуры ігнаруюць наведвальнікі, яе неабходна зачыняць. Не думаю, што хтосьці аспрэчыць гэту выснову. Бібліятэкары, напрыклад, яшчэ да пачатку аптымізацыі зразумелі, што варта "варушыцца", "выкручвацца". Найбольш прасунутыя з іх займелі ў прафесійным лексіконе крыху іншае слова: "рушыць". Куды? Неаспрэчна, наперад — да чытача. У выніку з'явіліся бібліятэчныя "прыцемкі", "бібліяночы", буккросінг, чытальныя залы ў скверах, кніжныя "рэстараны" з разнажанравым літаратурным меню, агучаны вершамі грамадскі транспарт... Нават самы апантаны бібліятэчны кансерватар дацяміў, што пазбегнуць аптымізацыі дапаможа нестандартны падыход да працы. У пэўных выпадках гэтае разуменне прыйшло, на жаль, недаравальна позна.

Яўген РАГІН

А дакажыце, што ў вашай

Спець, станцаваць, рассмяшыць і напісаць кулінарную кнігу...

Што ж клубнікі? Ці засталіся яны ў ценю бібліятэчнага крэатыву? Прынамсі, ліставанне ад бібліятэкараў у нашу рэдакцыю значна большае, чым ад клубнікаў. Каб ліквідаваць прабел і высветліць сённяшні стан клубнай справы, "К" вырашыла запрасіць да ўдзелу ў онлайн-канферэнцыі загадчыка сельскага клуба вёскі Жукоўшчына (Шаркаўшчынскі раён) Надзею КІРЫЕНКА, дырэктара раённага Цэнтра культуры Хоцімска і Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Хоцімскага раёна Алену ПРОШКІНУ, кіраўніка Спораўскага (Бярозаўскі раён) цэнтра культуры і вольнага часу Ніну ПАШКЕВІЧ; дырэктара Людвіноўскага СДК з Вілейшчыны Лілію ПРАТАСАВУ.

Яўген Рагін:

— Надзея Пятроўна, а дакажыце, што ў вашай вёсцы клуб патрэбны.

Надзея Кірыенка:

— А тут усё проста. Бібліятэку нашу зачынілі летась. Школа знікла ў 2011-м. Адна толькі крама засталася, а побач — клуб. Вакол гэтых будынін жыццё і віруе. Ёсць трохі моладзі: дзесяць студэнтаў, столькі ж — школьнікаў, якіх возяць вучыцца ў суседнюю, пакуль перспектыўную, вёску. А ў нашай куды народу выйсці? Толькі ў клуб. Вось і стараемся. Штомесяц ладзім буйныя святочныя мерапрыемствы. На пачатку месяца, напрыклад, і майскія адзначылі, і Вялікдзень. Паказалі, да прыкладу, валачобны абрад, абышлі ці не ўсе вясковыя сем'і. І паверце, чакалі нас не толькі пенсіянеры.

Надзея Кірыенка: "Змяншаецца **колькасць вясковага насельніцтва**. Няўжо прыватніка не знойдзецца, каб справу на жывёлагадоўчым комплексе адрадзіць?"

А для дзяцей дыскатэкі рыхтуем, бывае, што і платныя. Знікне клуб — згасне і вясковае жыццё. Я ў гэтым пераканана.

Яўген Рагін:

— Наколькі я ведаю, вы настаўнік па адукацыі?

Надзея Кірыенка:

— Каб патлумачыць усё, варта здалёк пачаць. Я — перасяленка, жыла да Чарнобыльскай катастрофы ў Краснапольскім раёне. Пераехала з сям'ёй у Жукоўшчыну, бо даведалася, што тут ёсць настаўніцкая вакансія. Выкладала фізіку і матэматыку. А калі школу зачынілі, пачала працаваць у клубе.

Яўген Рагін:

— Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынскага райвыканкама Людміла Стома вас вельмі хваліць за самастойнасць, удумлівасць і стараннасць. І ў сваю дзейнасць вы ўключаеце ўсю мясцовую грамадскасць. Дарэчы, Жукоўшчына адметная яшчэ і тым, што жыве тут этнограф, краязнаўца і паэт Іосіф Квач. З ім супрацоўнічаеце?

Надзея Кірыенка:

— Іосіф Леанідавіч якраз у нашу валачобную групу і ўваходзіць. Былы настаўнік інфарматыкі валодае гармонікам, таму пастаянны ўдзельнік самых розных клубных мерапрыемстваў.

Яўген Рагін:

— З выкананнем плана па аказанні платных паслуг праблем няма?

Надзея Кірыенка:

— Спраўляемся. Сёлета, да прыкладу, запланавалі вялікае мерапрыемства, прысвечанае 80-годдзю нашай школы. Будынак яе паціху развальваецца, але выпускнікі збіраюцца штогод. На юбілей абяцаюць з'ехацца ўсе. Паспрабуем усіх здзівіць рэтра-вечарынкай. Яна будзе платнай. Людзі да гэтага прызвычаіліся. Таму гадавы план — шэсць мільёнаў рублёў — выканаем.

Яўген Рагін:

— А вось цікава, Надзея Пятроўна, на Краснапольшчыне вы цікавіліся песнямі, танцамі? Сваю традыцыю прывезлі ў Жукоўшчыну?

Надзея Кірыенка:

— Слухала, бачыла і любіла. Але ж нічога не запісвала. Шкадую цяпер страшэнна. Толькі цяпер разумею, што згубіла. На новай радзіме прызвычаілася да новых песень.

Яўген Рагін:

— Кажуць у вас гурток ёсць драматычны?

Надзея Кірыенка:

— Мы назвалі яго "Іскроўцы", бо колішні калгас меў найменне "Іскра". Калгас займеў іншую цэнтральную сядзібу, а добрая памяць пра яго засталася. Да слова, і ў "Іскроўцах", дзе большасць падлеткаў, не абышлося без Іосіфа Квача. Таленавітыя людзі — ва ўсім таленавітыя... Кожны год у нас — прэм'ера. Пачыналі з "Паўлінкі" Янкі Купалы, "Збянтэжанага Саўкі" Леапольда Родзевіча. Сёлета ставім таксама ягоную п'есу "Конскі партрэт". Заўважце, усё — на беларускай мове. Сцэнаграфіяй самі займаемся. Са старых рэчаў пашылі сцэнічныя касцюмы для харавой групы, што складаецца з мясцовай інтэлігенцыі.

Яўген Рагін:

— Імкнецеся быць самадастатковымі? Тым не менш пэўныя праблемы вас турбуюць?

Надзея Кірыенка:

— Праблема адзіная: змяншаецца колькасць вясковага насельніцтва. Душа баліць...

Ніна Пашкевіч: "Наш тэатр шмат гастралюе, а **касцюмаў добрых не мае**. Самі выдумляем з таго, што ёсць па хатах. Тая ж праблема і ў фальклорнага калектыву".

Яўген Рагін:

— А што б вы зрабілі для таго, каб спыніць ад'езд моладзі з сяла, каб не вымірала вёска? Усё ж матэматыка логіку развівае.

Надзея Кірыенка:

— Я таксама пра гэта неаднойчы думала. Калі толькі пераехала, вельмі радавалася, што буйны дзяржаўны жывёлагадоўчы комплекс пад бокам. Падавалася, што ўсё перспектыўнае... Няўжо прыватніка-фермера не знойдзецца, каб справу адрадзіць? Гэта ж колькі рабочых месцаў з'явіцца. Чыстая зямля наўкола, а людзі ўсё роўна ў гарады імкнуцца. І яшчэ. Непадалёк тарфяное балота, і здабыча тут была наладжана. Усё закінута, а попыт на паліва застаўся. Ці ж па-гаспадарску гэта? Вось два гэтыя рэзервы і можна выкарыстаць.

Яўген Рагін:

— Адразу бачна, што добры работнік культуры — яшчэ і гаспадар. Пойдзем далей. Давайце ад сельскага клуба перабярэмся ў раённую ўстанову, а дакладней — у Хоцімскі цэнтр культуры. Чым пахваліцца можаце, Алена Віктараўна?

Алена Прошкіна:

— Тым, напрыклад, што здолелі сабраць і выдаць кнігу нашых традыцыйных рэцэптаў. Над гэтым працавала ці не ўся наша Цэнтралізаваная клубная сістэма. Стравы ўнікальныя. У вёсцы Клін, да прыкладу, гатуюць лапуны — аладкі з варанай і талчонай бульбы ў мундзірах. Смаката! Атрымаўся ладны зборнік, змест якога нашы метадысты запісалі ад бабуль. Кніга карыстаецца попытам на метадычных днях нашых клубнікаў, ёсць яна і ў бібліятэках.

Яўген Рагін:

— У рабоце РЦК якія прыярытэты?

Алена Прошкіна:

— Праца з дзецьмі і моладдзю. Для першых летам задзейнічаем адкрытыя пляцоўкі для конкурсаў, танцавальных праграм, узімку — упор на кіналекторыі, гульнявыя акцыі. Гадоў сем як ладзім дзіцячы фестываль "Зоркі над Бесяддзю". Таленты праяўляюцца ў самых розных жанрах: у тэатральным мастацтве, харэаграфіі, вакале... Моладзь упадабала аматарскія аб'яднанні. Сярод іх — і дыскаклуб "Шанц". Сцэнарны матэрыял, усе музычныя рэміксы юнакі і дзяўчаты рыхтуюць самі. Стаў традыцыйным конкурс дзі-джэяў.

Яўген Рагін:

— Ваш Цэнтр культуры месціцца ў колішнім кінатэатры. Сам аднойчы пераканаўся, што плошчаў там хранічна не стае. Як выкручваецеся?

Алена Прошкіна:

— Так, для кавярні ці більярднай не стае месца. Гэта, безумоўна, праблема. Для моладзі хацелася б лепшых умоў. Дапамагае тое, што з мая мы адкрываем адкрытую танцавальную пляцоўку ў парку, што насупраць РЦК.

Аглядавая пляцоўка

Гарадок / Майстры з "Вытокаў"

У выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працуе выстава народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў "Вытокі" Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору.

Кіраўнік "Вытокаў" — Жана Гусейнава. Клуб адзін з першых на Беларусі (1989 год) атрымаў званне "народны" і кожныя тры гады пацвярджае яго. Дзейнасць фармавання накіравана на адраджэнне, развіццё і папулярызацыю традыцыйных рамёстваў, падтрымку майстроў — носьбітаў аўтэнтычных традыцый.

У экспазіцыі — работы каля 50 майстроў Гарадоцкага раёна. Можна пазнаёміцца ці не з усімі напрамкамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці: вышыўкай, ткацтвам, жывапісам, ганчарствам, лоза- і саломапляценнем, цацкамі-свістулькамі, лялькамі ў традыцыйным адзенні, строямі.

Марына Гушча, Васіль Сіманковіч, Ірына Шалаева, Вольга Рэут, Людміла Гаравая, Таццяна Міснікава, Наталля Юшкова з'яўляюцца членамі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Майстар па ткацтве Ніна Міхайлаўна Каралько адзначыла 92-годдзе, з'яўляецца народным майстрам Рэспублікі Беларусь, яе творы знаходзяцца ў фондах раённага Дома рамёстваў і фальклору і ў абласным краязнаўчым музеі. Вучаніца Ніны Міхайлаўны Наталля Юшкова стала пераможцай абласнога свята-конкурсу "Палатняныя пераплёты" (у рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску") у намінацыі "Ткацтва паясоў".

На выставе прэзентавана адметная калекцыя вырабаў у тэхніцы традыцыйнага спіральнага пляцення ў выкананні сучасных майстроў. Аднаўляць згаданую тэхніку пляцення з выкарыстаннем лазовага прута ці кораня сасны адна з першых пачала на Гарадоччыне Людміла Гаравая. Цягам пяці гадоў яна навучае гэтаму дзетак. Цяпер Людміла імкнецца надаць гэтай тэхніцы статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Падчас адкрыцця выставы быў паказаны прэм'ерны батлеечны спектакль "Два браты" ў выкананні майстроў клуба, сюжэт да якога быў знойдзены падчас экспедыцыі па раёне. А Ірына Шалаева дала майстар-клас па вырабе глінянай свістулькі.

Ала ЛЯЛЬКІНА, вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці

Батлеечны спектакль у выкананні майстроў з "Вытокаў".

Полацк / Пяць тыдняў на тэатр

Ля кінатэатра "Радзіма" ў Полацку стартаваў праект "Тэатральны перапынак". Такім чынам быў пачаты сезон вулічных тэатраў.

Выпадковага мінака абавязкова закрануць выступленні ўзорнага юнацкага тэатра-студыі "Гармонія" Полацкага гарадскога палаца культуры, лялечнага тэатра "Вясёлка" Багатырскай бібліятэкі-філіяла № 48 Полацкай ЦБС і юных аматараў сцэнічнага мастацтва з Полацкага каледжа. Арганізатар праекта — Полацкі гарадскі палац культуры.

Тэатр-студыя, да прыкладу, прадэманструе багаты арсенал акцёрскіх сродкаў: не толькі рух і пластыку, а нават манеру нашэння сцэнічнага касцюма. На адкрытай пляцоўцы будуць ладзіцца пластычныя эксперыменты, спектаклі для сямейнага прагляду. Глядач вокамгненна можа стаць акцёрам.

"Гармонія" прапануе спектаклі на тэмы экалогіі, здаровага ладу жыцця, выхавання. Маленькія гледачы будуць задаволеныя. Навучэнцы каледжа далучаць таксама палачан і гасцей горада да беларускай літаратурнай спадчыны. Яны падрыхтавалі пастаноўку паводле п'есы Уладзіміра

вёсцы клуб патрэбны

Яўген Рагін:
— Як справы з апаратурай у клубных установах раёна?
Алена Прошкіна:
— Ёсць, але ж яна — не вечная. Сёе-тое патроху набываем.
Яўген Рагін:
— У вашым раёне засталося васямнаццаць клубных устаноў. У тым ліку — у пяці аграгарадках. Плануеце скарачаць штосьці яшчэ?
Алена Прошкіна:
— Ні ў якім выпадку. Нерэнтабельных клубаў ужо няма. У тых вёсках, дзе адбылося скарачэнне, практычна не засталося насельніцтва. Для абслугоўвання тых, хто застаўся, хапае магчымасцяў аўтаклуба. У астатніх паселішчах хапае жыхароў, таму зачыняць установы культуры не будзем. Яны, у тым ліку дом фальклору, карыстаюцца попытам.
Яўген Рагін:
— Што за дом фальклору?
Алена Прошкіна:
— Знаходзіцца ён у згаданай ужо вёсцы Клін. Там у нас адзін са старэйшых самадзейных фальклорных калектываў "Медуніца". Іхнія вясельныя песні — у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных нематэрыяльных каштоўнасцяў. Так што ў Кліна ёсць перспектыва.
Яўген Рагін:
— А ў астатніх дзесяці клубаў, што знаходзяцца не ў аграгарадках?
Алена Прошкіна:
— Перспектыва застаецца, пакуль мы запатрабаваныя народам. Стараемся, каб установы нашы заставаліся яркімі і цікавымі. Натуральна, акцэнт тут — на работу з пажылымі людзьмі.
Яўген Рагін:
— Якія яшчэ праблемы?
Алена Прошкіна:
— Кваліфікаваных кадраў хапае. Замінае толькі адно. Калектывы, якія атрымліваюць званне «народны», не могуць займець паўнавартасных кіраўніка і акампаніятара. Усё робяць добраахвотнікі без аніякай аплаты. Тыя ансамблі, якім па дваццаць гадоў, мелі калісьці і адпаведныя стаўкі. А ў нас у клубнай сістэме дванаццаць народных калектываў.
Яўген Рагін:
— Цяпер — пра развіццё Спораўскага цэнтра культуры і вольнага часу. Ніна Іванаўна, у вас камп'ютар ёсць ва ўстанове?
Ніна Пашкевіч:
— Цэлых тры! Адзін атрымалі, калі вёска была пераўтворана ў аграгарадок, другі (ноўтбук) — па выніках працы за 2013 год, калі ўстанова стала лепшай у вобласці, яшчэ адзін ноўтбук атрымалі летась па Дзяржпраграме "Культура Беларусі". Штат у нас немаленькі. Камп'ютарная тэхніка пастаянна патрэбна ці харэографу на рэпетыцыях, ці кіраўнікам самадзейных калектываў.
Яўген Рагін:
— А які паказчык сваёй працы лічыце самым галоўным?
Ніна Пашкевіч:
— План па аказанні платных паслуг выконваем практычна на дзвесце працэнтаў. У тым ліку і за кошт маштабнай канцэртнай дзейнасці. У Цэнтры — тры народныя калектывы. Для СДК — гэта добры паказчык.

■ Алена Прошкіна: "Калектывы, якія атрымліваюць званне "народны", **не могуць займець паўнавартасных** кіраўніка і акампаніятара. Усё робяць добраахвотнікі".

Яўген Рагін:
— У ліпені вы ладзіце ўжо шосты па ліку абласны фестываль гумару "Спораўскія жарты". Брэнд для раёна і вобласці — вельмі важкі. Колькі ўдзельнікаў сёлета чакаеце?
Ніна Пашкевіч:
— Больш за дзвесце. А яшчэ ж і госці будуць.
Яўген Рагін:
— Мерапрыемства — не танае…
Ніна Пашкевіч:
— Неяк выкручваемся. Штосьці вобласць выдаткоўвае, штосьці раён. Так што сродкаў і на прызы хопіць.
Яўген Рагін:
— Нездарма вас у аддзеле "іскаркай" называюць… Вы кіруеце адным з народных калектываў "Спораўскі акалот". Што такое акалот, дарэчы?
Ніна Пашкевіч:
— Салома пасля абмалоту. "Спораўскі акалот" — гэта народны тэатр народнага гумару. Гумару вельмі добрага, надзённага, заснаванага на тым матэрыяле, які кранае кожнага з нас.
Яўген Рагін:
— Атрымліваецца, у вас і праблем няма?
Ніна Пашкевіч:
— Наш тэатр і па вобласці гастралюе, і за мяжой, а вось касцюмаў добрых не мае. Самі выдумляем з таго, што ёсць па хатніх гардэробах. Тая ж праблема і ў фальклорнага калектыву.
Яўген Рагін:
— Пытанне, відаць, уласцівае для клубных устаноў усёй рэспублікі. А як яно вырашаецца ў СДК вёскі Людвінова, што на шматлюднай Міншчыне?
Лілія Пратасава:
— А для нас гэта таксама праблема. І мы таксама збіраем касцюмы з уласнага матэрыялу. А касцюмы — справа важная: мы ж тэатралізацыі пастаянна робім.
Яўген Рагін:
— Лілія Іванаўна, вы па прафесіі — рэжысёр. Гэта, напэўна, дапамагае ў кіраванні СДК?
Лілія Пратасава:
— Гарадскі і сельскі дом культуры нельга на адзін узровень паставіць. У вёсцы мы (чатыры спецыялісты) усё разам робім, вузкай спецыяльнасці, як у ГДК з вялікім штатам, няма. І ніякая адукацыя тут не дапаможа, калі не знойдзеш агульнай мовы з людзьмі. Наша задача якая? Працаваць сумесна з усімі ўстановамі, якія ёсць у вёсцы, знаходзіць кропкі судакранання і з маладым гледачом, і са сталым… Адукацыю я атрымала завочна ва Універсітэце культуры. Натуральна, яна дапамагае пры падрыхтоўцы нашых тэатралізацый.
Яўген Рагін:
— Я так разумею, вам штотыднёва даводзіцца здзіўляць сваіх вяскоўцаў.

■ Лілія Пратасава: "Гарадскі і сельскі дом культуры **нельга на адзін узровень паставіць.** У вёсцы мы ўсё разам робім, вузкай спецыяльнасці, як у ГДК, няма".

Лілія Пратасава:
— Так. І гэта няпростая справа. У вёсцы — восемсот жыхароў. І ў нас вельмі добры глядач. Выхаваны і ўдзячны. Таму і аб'ядноўваем намаганні, каб не расчараваць сяльчан. Калі мы не будзем ім патрэбныя, нас закрыюць. А сёння да нас пастаянна прыходзяць, а хтосьці паступова з рэгулярнага наведвальніка пераўтвараецца ў актыўнага ўдзельніка імпрэз.
Яўген Рагін:
— Вялікая сіла мастацтва!.. Ваш канёк, наколькі я зразумеў, — тэатралізацыі. Назавіце некалькі прыкладаў удалых рэжысёрскіх хадоў.
Лілія Пратасава:
— На адным з выпускных вечароў пераўтварылі клубную сцэну ў… аэрапорт. Маўляў, былыя школьнікі адлятаюць па розных маршрутах у дарослае жыццё. Ці на яшчэ адным выпускным мы зрабілі на сцэне вялізны карабель (іншым разам ў такіх відовішчах занята да трыццаці чалавек). І ў гэты момант да нас завіталі ўдзельнікі абласнога семінара. Вельмі здзіўляліся.
Яўген Рагін:
— Добрыя супрацоўнікі СДК зрабілі добрага гледача. Наколькі проста гэта было?
Лілія Пратасава:
— Нам дапамагаюць і пенсіянеры, і сямігадовыя дзеці, інтэлігенцыя і рабочыя. А наколькі гэта цяжка ці проста? Я дваццаць гадоў таму прыйшла ў гэты СДК. Традыцыі ўжо былі закладзеныя. Усе, да прыкладу, пад Новы год ішлі глядзець абавязковую казку для дарослых. Мы пастараліся не перарваць гэтыя тонкія повязі, умацавалі іх, як маглі. Гэта цяжка патлумачыць нават. Але, бывае, прыезджыя здзіўляюцца: у СДК на апошнім нумары ніхто не рвецца ў гардэроб, падчас мерапрыемства, калі эмоцыі б'юць праз край, устаюць, як у сталічным тэатры… І гэта не толькі мая заслуга. Мне шанцуе на таленавітых і добрых людзей.
Яўген Рагін:
— Ваша дачка таксама па вашых слядах пайшла.
Лілія Пратасава:
— Працуе ў Барысаве намеснікам дырэктара метадычнага цэнтра. Інакш, напэўна, і быць не магло, бо яна ў клубе вырасла. Часта раіцца са мною.
Яўген Рагін:
— Лілія Іванаўна, якія праблемы сёння вас хвалююць?
Лілія Пратасава:
— Не ўсе разумеюць значнасці ролі работніка культуры. Мы пастаянна кажам, што павінны ведаць свае вытокі, сваю нацыянальную культуру, і ў той жа час вельмі мала для гэтага робім. Неадкладная патрэба ў нас з'яўляецца, калі неабходна правесці нейкае мерапрыемства. А вось калі штосьці неадкладна трэба нам… Я пра тыя ж касцюмы, пра годную музычную апаратуру.
Яўген Рагін:
— Але ж штосьці і акрыляе?
Лілія Пратасава:
— Тое, у першую чаргу, што я іду на працу, і са мной павітаецца не адзін і не два чалавекі, столькі ж спыніць і завядзе размову. Я — навідавоку і адчуваю ўвесь цяжар адказнасці. Таму я павінна быць прыкладам, пастаянна даводзіць, што праца маіх калег — патрэбная ўсім. Вось гэта і акрыляе.

Ад рэдакцыі

Яны не скардзяцца на лёс, аб'ядноўваюць вакол сябе грамаду, у складаных фінансавых варунках выкручваюцца як могуць, робяць са старых рэчаў сцэнічныя касцюмы, імкнуцца выканаць план пазабюджэтных даходаў, ладзяць знакавыя фестывалі, кіруюць самадзейнымі калектывамі, не губляюць з поля зроку гаспадарчыя пытанні, валодаюць не рахункамі ў банках, а чалавечымі душамі, хвалююцца не толькі за свой лёс, але і за лёс Бацькаўшчыны. Што тут яшчэ дадаць?

К

Падчас канцэрту ўзорнага ансамбля танца "Чабарок".

Свята кнігі ў раённай дзіцячай бібліятэцы Ашмянаў.

Караткевіча "Калыска чатырох чараўніц". Тэма твора — пошук нацыянальнага характару і нацыянальнага героя — цяпер адна з самых надзённых.

Вулічнае тэатральнае свята ў Полацку будзе доўжыцца цягам пяці тыдняў. А потым нас чакае карнавальнае шэсце і тэатральны гала-канцэрт. Будзем спадзявацца, што мы прысутнічаем пры нараджэнні чарговага полацкага брэнда!

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

Ашмяны / Што чытала мама?

Раённая дзіцячая бібліятэка Ашмянаў падвяла вынікі рэспубліканскай акцыі "Сямейнае чытанне". Падчас яе бібліятэкары імкнуліся ўмацаваць сямейныя традыцыі, а таксама — імідж чытання і кнігі. Юныя чытачы прысутнічалі ў бібліятэцы разам з бацькамі. Для іх былі падрыхтаваны тэматычныя кніжныя падборкі.

І ўвогуле, літаратурныя гасцёўні сталі ў нас традыцыйнымі. Гэтым разам сярод кніжных паліц сустрэліся прадстаўнікі ці не дзясятка сем'яў, дзе кніга стала сапраўдным сябрам. Бабулі, таты, мамы, іх сыны, дочкі і ўнукі выканалі ўмовы акцыі: падрыхтавалі малюнкі на тэму "Улюбёная дзіцячая кніга сям'і" і зрабілі фотаздымкі "Чытаем усёй сям'ёй".

Падчас свята вядучыя Марыя Свірская і Святлана Красоўская казалі пра ролю паўнавартасных сямейных стасункаў, а дзеці чыталі вершы, прысвечаныя бацькам. Былі яшчэ тэатралізацыя, бяспройгрышная латарэя, літаратурны конкурс-віктарына. Гучалі музычныя нумары ў выкананні чытачоў. Закончылася свята аглядам літаратуры "Любімыя кнігі ў дзяцінстве тат і мам".

Гелена ГАРДЗЕЙ,
загадчык Ашмянскай раённай дзіцячай бібліятэкі

Бабруйск / Басанож па лужынах

У канцэртнай зале Палаца мастацтваў Бабруйска прайшоў штогадовы справаздачны канцэрт узорнага ансамбля танца "Чабарок". Такія мерапрыемствы ў горадзе прыцягваюць увагу.

Можна было пабачыць лепшыя, праверaныя часам, нумары, а таксама — новыя харэаграфічныя пастаноўкі. Танцы "Ластаўка", "Бульбачкі", "Крутуха", "Полька-Янка", "Басанож па лужынах" і многія іншыя падвялі вынік працы кіраўніка калектыву Лізаветы Калпаковай.

"Чабарок" на свае творчыя справаздачы традыцыйна запрашае іншыя калектывы Палаца мастацтваў. Гэтым разам сумесныя нумары былі пастаўлены з Заслужаным аматарскім калектывам Рэспублікі Беларусь Тэатрам песні "Шына-най".

Наталля ЧОРНАЯ,
загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела Палаца мастацтваў Бабруйска
Фота Сяргея ГРАБНЕВІЧА

Тактыка культурнага развіцця

Абноўлены "Прарыў"

З Васілём Дукам пазнаёміўся ў 2007-м. Я ехаў ва Ушачы, а ён вяртаўся на радзіму пасля чарговай рэабілітацыі ў вайсковым шпіталі. Васьмідзесяцігадовы барадач партызаніў на роднай зямлі і ў ахвоту распавёў пра знакаміты прарыў фашысцкай блакады, калі супраць 16 партызанскіх брыгад агульнай колькасцю ў 17 тысяч чалавек былі сцягнуты ў Полацка-Лепельскай зоне 60 тысяч карнікаў, авіяцыйная дывізія ды танкавы полк. Было тое 5 мая 1944 года.

Яўген РАГІН

Тады партызаны вырваліся з акружэння і ўпарта змагаліся да прыходу Савецкай арміі. Многія загінулі. Але астатнія перамаглі, здолелі выратаваць і 15 тысяч мірных жыхароў, бо брыгады збольшага былі сямейнымі. Кіраваў партызанамі будучы Герой Савецкага Саюза Уладзімір Лабанок. Цяпер яго імем названы Ушацкі музей народнай славы і адна са сталічных вуліц. А за сем кіламетраў ад райцэнтра на Віцебшчыне, там дзе прарываліся і гінулі партызаны, 30 чэрвеня 1974 года адкрыўся мемарыяльны комплекс "Прарыў". Ягоныя аўтары — скульптар Анатоль Анікейчык, архітэктары Юрый Градаў і Леанід Левін. "Лятучая" выява партызана, "схопленая" ў апагеі бою і змешчаная ў сімвалічных варотах з пагрозлівых каменных пліт, нагадвае пра той дзень, калі акружэнне было ўрэшце прарвана, і ў гэта спачатку "ігольнае вушка" рванулі самыя адважныя. Як Васіль Сцяпанавіч казаў, гарэла нават зямля, набрынялая балотам.

Тады, у 1974-м, у гонар шаснаццаці нязломных брыгад ля "Прарыву" было высаджана шаснаццаць дубкоў. Цяпер гэта 42-гадовыя магутныя дрэвы. Але расці ім яшчэ ды расці…

Мемарыяльны комплекс, як і Сядзіба-музей Васіля Быкава ў Бычках, — лагічны працяг ушацкага музея. З леташняй восені "Прарыў" пачалі аднаўляць віцебскія спецыялісты. Пра тры этапы гэтых работ распавяла галоўны захавальнік музейных фондаў установы Дар'я Мілая. Спачатку замянілі тарцовыя глыбы сімвалічных варот. Потым былі заменены ўнутраная арматура помніка і яго афар-



Падчас адкрыцця "Прарыву" пасля рэканструкцыі.

боўка: цяпер выява партызана — "бронзавая". Трэці этап — добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі.

Неўзабаве адбудзецца ўрачыстае адкрыццё абноўленага "Прарыву". Па словах Дар'і Мілай, выкананы і пазапраектныя работы. Замест балотца ўзнік вадаём, а побач — зона адпачынку з альтанкамі. А ў парку, разбітым у гонар 40-годдзя беларускага партызанскага руху, з'явілася адноўленая вёска народных змагароў. Тут рэканструяваны зямлянкі: жылая, штабная і для друкарні. Зроблены лясная школа і летняя кухня. Заменена і асвятленне мемарыялу. Кажуць, калі яно будзе канчаткова даведзена да ладу, выразнасць бронзавай выявы партызана і архітэктурных складнікаў комплексу набудзе ў вечаровым і начным антуражы завершаную акрэсленасць.

А Васіль Сцяпанавіч памёр тры гады таму. Тады, у 2007-м, я быў у яго ў гасцях, трымаў у руках важкія баявыя ўзнагароды, зрабіў фотапартрэт гаспадара вялікай, як аказалася, сям'і ды са здзіўленнем даведаўся, што былы партызан трыццаць гадоў запар спявае без стомы ў ветэранскім хоры...

Няма Васіля Сцяпанавіча, а песня яго ўсё гучыць у галінах 42-гадовых дубоў над палітаю крывёю ўшацкай зямлёй. І песню тую варта паслухаць.

К

Са статусам і без

Па колькасці элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, узятых пад ахову дзяржавы як гісторыка-культурная каштоўнасць, Лельчыцкі раён саступае толькі Гродзенскаму. У Лельчыцкім раёне ахоўваюцца тры элементы, у Гродзенскім — пяць.

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
Мінск — Лельчыччына — Мінск

Акрамя згаданай тройкі, гаворка пра якую пойдзе найперш, у раёне шмат фальклорных гуртоў і майстроў, творчасць якіх таксама магла б прэтэндаваць на статус каштоўнасці, аднак гэта патрабуе афармлення пакета дакументаў, што не заўсёды проста. Багацце традыцыйнай культуры раёна можна было б паспрабаваць "спісаць" на тое, што ён найбольшы ў краіне па плошчы, але хутчэй справа ў тым, што тут — унікальны рэгіён, на мяжы беларускага Усходняга ды Заходняга Палесся і Украіны. Не спыняюцца абрады, не сціхаюць песні, нягледзячы на тое, што раён — у зоне з правам на адсяленне: тры вёскі спазналі гэткі лёс адразу пасля чарнобыльскай катастрофы.

Абрад гукання вясны "Чырачка" на Масленіцу ў Тонежы. 2014 г.

Ушанаванне "каменнай дзевачкі" на Вялікдзень у Данілевічах.

Новапалескія спевы

У Новым Палессі спачатку хацелі падаць на статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці абрад "Грамніцы". Ён складаецца з карагоду, падчас якога жанчыны-ўдзельніцы гукаюць вясну, трымаючы ў руках асвечаныя ў царкве свечкі. Пасля на санках вязуць да прыдарожнага крыжа ўпрыгожаную ёлку. Звычайна да моманту, калі прыходзяць удзельніцы гурта "Палескія напевы", на крыжы ўжо вісіць адна ёлка. У Новым Палессі вераць, што спраўдзіцца жаданне таго, хто павесіць дрэўца на крыж першым — гэта своеасаблівы аброк. Таму людзі імкнуцца зрабіць тое яшчэ да ўзыходу сонца. Хаця новапалескія Грамніцы і не былі ўзятыя пад ахову, свята застаецца ў вёсцы самым папулярным. Менавіта на Стрэчанне сюды едуць госці. Між тым, у Новым Палессі святкуюць яшчэ Каляды. Гурт "Палескія напевы" звычайна адкрывае раённае каляднае свята ў Лельчыцах. Гэта не замінае ім калядаваць у роднай вёсцы: па Новым Палессі гурт ходзіць увечары 6 студзеня, а раённае свята звычайна ладзіцца 7-га ці 14-га. Яшчэ ў Новым Палессі святкуюць Дабравешчанне, Юр'я, водзяць Маю на першы дзень Троіцы, робяць Засеўкі, Зажынкі, Дажынкі. Адноўлены па расповедах старажылаў вясельны абрад. Летась нават у сапраўдным вяселлі паўдзельнічалі, усё зрабілі, як належыць. Гурт запрасіла на вяселле ўнукаў былая культработніца. Спадзяемся, традыцыйныя вяселлі набудуць папулярнасць і сярод не звязаных з культурай.

Дакументы на абрад "Грамніцы" не прайшлі экспертызу навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, таму было вырашана засяродзіцца не на свяце, а на стылі выканання традыцыйных песень. "Палескія напевы" не маюць дзіцячага гурта-спадарожніка, таму паўстае пытанне пераемнасці элемента НКС. Арганізоўваюцца паездкі спявачак у школу вёскі Ударнае (з'яўляецца цэнтрам сельсавета і знаходзіцца за 10 км), дзе яны выступаюць, расказваюць дзецям пра традыцыі, удзельнічаюць у сумесных мерапрыемствах. Дзеці часам наведваюць бабуль: школа выдзяляе аўтобус.

Тонежская Чырка

Падобная да новапалескай сітуацыя і ў Тонежы: шмат людзей наведвае вёску на Масленіцу, калі адбываецца абрад гукання вясны "Чырачка" (кажуць таксама "Чырка"). Мала хто ведае, што гурт "Таняжанка" — таксама носьбіт мясцовага стылю выканання. Гурты Лельчыцкага раёна выступаюць у Мінску, Маскве, Любліне. "Таняжанку" неяк віталі авацыямі некалькі хвілін на польскай сцэне. Тады бабулі нават выступілі ў начным клубе з танцавальнай праграмай.

"Таняжанка" мае дзіцячы гурт-спадарожнік, які ўдзельнічае ва ўсіх святах і абрадах. У Тонежы святкуюць Каляды, Засеўкі, Троіцу (завіваюць бярозкі, водзяць карагоды), Зажынкі, Дажынкі. Калядуюць 7 студзеня, бо 6-га падчас вайны вёска была спалена. Лёс Тонежа лёг у аснову сюжэта фільма "Ідзі і глядзі". Загінуўшым аднавяскоўцам быў пастаўлены помнік, пасля вайны на 9 мая жанчыны збіраліся ля яго і галасілі. Традыцыя затухала са смерцю жанчын, чые родныя тады загінулі, і зусім спынілася са смерцю Ганны Вянгуры, выдатнай песенніцы. Фактычна гэта традыцыя аднаго пасляваеннага пакалення. Так, галашэнні сыходзяць з побыту. Тым не менш, у вёсцы Дзяржынск Лельчычыны дасюль галосяць на пахаваннях.

"Каменныя дзевачкі"

Шанаванне "каменных дзевачак" у Баравым і Данілевічах аб'яднана ў адну гісторыка-культурную каштоўнасць. Між тым, традыцыі ў гэтых вёсках розняцца. Падобная сітуацыя назіраецца з мясцовым стылем выканання традыцыйных песень у Любанскім раёне, прадстаўленым гуртамі "Журавушка" (Ямінск), "Глыбокія крыніцы" (Закальное), "Павалякі" (Обчын). Па-першае, манера выканання ў кожным гурце адметная. Падругое, у раёне дзейнічае яшчэ 8 аўтэнтычных гуртоў, якія спяваюць не горш за тыя, што "са статусам". Таму, падаецца, ці браць пад ахову ўсіх разам, ці выбіраць па адным. Але па якім прынцыпе? Кожны элемент нематэрыяльнай спадчыны каштоўны.

Разам з "каменнымі дзевачкамі" на Вялікдзень мяняюць ці дадаюць новы тэкстыль на драўляныя прыдарожныя крыжы. Акрамя Данілевічаў і Баравога каменныя і драўляныя крыжы "апранаюць" у вёсках Тонеж, Іванава Слабада, Ліпляны, Мілашэвічы таго ж Лельчыцкага раёна.

У Баравым святкуюць Саракі з карагодамі і песнямі. За славай "дзевачак" гэты абрад губляецца. Узяцце пад ахову паўплывала на большую інфармаванасць пра лельчыцкіх "дзевачак" і ў межах раёна, і па ўсёй Беларусі, і ў іншых краінах. Праўда, крыж у Баравым апынуўся трохі "ў ценю" данілевіцкага. Гэта і праз большую наведвальнасць "дзевачкі" ў Данілевічах, і з-за таго, што распаўсюджваюцца практыкі, раней нехарактэрныя для Баравога. Некаторыя мясцовыя жыхары кажуць, што раней, прыкладна да 1970-х, "дзевачку" ў Баравым увогуле не апраналі. Не звалі яе Еўкай, як у Данілевічах. Імя з'явілася толькі апошнім часам. Не палілі старыя "аброкі", а павязвалі на дрэва побач. Пасля ўзяцця элемента пад ахову вакол камяня ў Баравым з'явіліся плот і драўляны крыж з абразом унутры агароджы.

У Данілевічах галоўнымі захавальніцамі абраду з'яўляюцца жанчыны, якія раней спявалі ў фальклорным гурце пры клубе. Яны сёлета палілі старыя аброкі з "дзевачкі" і драўляных крыжоў у Красную суботу. Цяпер клуб ператвораны ў Дом сацыяльных паслуг (па графіку адчыняецца раз на месяц), але жанчыны працягваюць збірацца, спяваць. Як і ў Галавенчыцах Чавускага раёна, наяўнасць у вёсцы гісторыка-культурнай каштоўнасці не ўратавала клуб ад аптымізацыі: установа зачыняецца, калі ў населеным пункце менш за 100 жыхароў…

■■■

Аптымізавалі і ўстановы культуры ў саміх Лельчыцах: цяпер адной структурай (Раённым цэнтрам культуры і народнай творчасці) сталі ранейшыя раённы метадычны цэнтр, гарадскі цэнтр культуры і аўтаклуб. Дырэктар установы, Тамара Некрашэвіч адзначае, што нагрузка ўзрасла. Сярод станоўчых момантаў аптымізацыі кажа пра магчымасць захаваць вопытныя кадры, якія займаюцца ў тым ліку аховай і папулярызацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Дырэктар Лельчыцкага раённага краязнаўчага музея Тацяна Мазур распавяла, што папулярызацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны займаецца і яе ўстанова. Распрацавана праграма для дзяцей, сярод іншых мерапрыемстваў запланаваны выезды ў Новае Палессе, Тонеж.

Наогул, усе гурты раёна сутыкаюцца з прыкладна аднолькавымі складанасцямі. Хочацца больш выступаць, паказваць сябе. Арганізатары замежных фестываляў не могуць высылаць запрашэнні за год, калі складаецца фінансавы план аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Таму аддзел дапамагае гуртам па меры наяўнасці сродкаў, скажам, дае транспарт. У раёне захоўваецца ў жывым бытаванні культура бортніцтва: борці можна пабачыць і ля сядзіб, і ў лесе, і на могілках. У адным Баравым тры бортнікі. Аднак промысел паступова занепадае ці замяшчаецца прысядзібным пчалярствам.

Багацце і жывасць традыцый Лельчыцкага краю ўражвае. Пакуль афіцыйны статус прынёс нематэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям вядомасць, некаторую спарадкаванасць. Застаецца спадзявацца, што "нястатусныя" элементы не застануцца без увагі.

К

ф о т а ф а к т

Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея краіны Алег Рыжкоў распавёў, што дворык музея выкарыстоўваецца ўжо два гады для арт-праектаў і самых розных імпрэз. Гэтым разам упершыню арт-аб'екты ўпісаныя ў архітэктурную прастору. Пакуль праект арт-пляцоўкі плануецца як сезонны, у цёплую пару году дворык будзе адчынены круглыя суткі, уваход туды вольны. Магчыма, калі зіма будзе марозная, з'явяцца іншыя цікавосткі. А пра выставы Марыны Бацюковай і Наталлі Дораш з пункту погляду мастацтва фатаграфіі і з гледзішча этнографа чытайце ў наступных нумарах "К".

Фота Алены ЛЯШКЕВІЧ

Паміж ідэнтычнасцю і вялікім бізнесам

Юсі Аалта: “Што значыць быць чалавекам?”

На гэтым тыдні ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва адкрылася выстава Юсі ААЛТА — класіка фінскай фатаграфіі. Партрэты фінскіх прэзідэнтаў, серыі абстрактных работ, назіранні, эксперыменты, стрыт-фота — экспазіцыю можна смела назваць рэтраспектыўнай, бо яна ахоплівае 50 гадоў кар’еры спадара Аалта. Класік, мадэрніст і рамантык — менавіта так пазіцыяніруе сябе наш герой, які стаў адным з першых выкладчыкаў гісторыі фатаграфіі ў сваёй краіне ў 1970-я. Напярэдадні выставы майстар пагадзіўся даць эксклюзіўнае інтэрв’ю карэспандэнту “К”.

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

— Па шчырасці, мне не вельмі падабаецца, кал фатаграфія мае патрэбу ў тэксце. А канцэптуальнае фота часта гэтым грашыць. Складана сказаць, як я сябе пачуваю ў гэтым кантэксце, але, здаецца, нармальна. Я прыхільнік класічнай фатаграфіі, мае героі — Анры Карцье-Брэсон, немец Аўгуст Сандар, аўтары 1920 — 1930-х. Мне падаецца, камплексаваць з той нагоды, што сёння большасць фатографаў хочуць стаць мастакамі ці канцэптуалістамі, не варта. Свет, як і рынак, дастаткова вялікі, каб прыняць самыя розныя жанры і формы фатаграфіі. У ім дастаткова галерэй і музеяў, зацікаўленых у класічных здымках.

— Наколькі Ваша пазіцыя адрозніваецца ад меркаванняў фінскіх фатографаў наогул?

— Вядома, сёння Хельсінкская школа фатаграфіі прызнаная ва ўсім свеце — і нагадаю, што, у першую чаргу, гэта акурат канцэптуальная фатаграфія. Але я пачынаў напрыканцы 1950-х. Тое быў час, калі ў маю краіну прыйшла класічная фатаграфія, фотажурналістыка ў сваім лепшым разуменні, і выдатныя прыклады якой вядомыя кожнаму адмыслоўцу. У фінскай плыні з’явіліся моцныя Кай Брэмер, Сепо Савес, КалеУлтала, Олаві Каскісуо ды іншыя, якія стварылі суполку “Finnseven”, таксама ў той час заявіла пра сябе згуртаванне “Імага 6”… Я сфарміраваўся дзякуючы ім. Вы ведаеце, працую ўжо так даўно, што часам людзі, якія ведаюць мае работы і раптам сустракаюць мяне дзесьці, кажуць: “Юсі, ты яшчэ жывы?” Вяду да таго, што як фатограф я сфарміраваўся даўно. Мне ўдалося знайсці ўласны стыль, заняць сваю пазіцыю, а калі хтосьці робіць іншую фатаграфію — гэта яго выбар.

У маёй біяграфіі ёсць розныя перыяды — працаваў не толькі як фотажурналіст, а ў фэшн-фатаграфіі, у рэкламнай, быў асістэнтам рэдактара ў профільным часопісе… У 1970-х пачаў выкладаць гісторыю фатаграфіі і партрэт ва Універсітэце прамысловых мастацтваў: можна сказаць, стаў адным з першых выкладчыкаў, заклаўшы аснову для новага пакалення фатографаў Фінляндыі. Потым яны ўсе, дарэчы, захацелі стаць фотамастакамі.

З серыі "Прэзідэнты Фінляндыі".

Юсі Аалта.

— Што для вас фатаграфія?

— Гэта ўражанні — ад жыцця, людзей, уражанні шчасця. Вы пыталі пра рамантычнасць, і для мяне істотна паказваць радасць жыцця, прыгажосць людзей. Так, адна з задач фатаграфіі — выкрываць, што значыць быць чалавекам у яго адмоўных і станоўчых рысах, але маё захапленне — прыгажосць чалавека і жыцця. Я не хачу паказваць людзей лепшымі, чым яны ёсць насамрэч, але і не хачу прыніжаць іх. Прызнацца, палова маіх выстаў — партрэтныя.

— Над чым зараз працуеце?

— Над серыяй партрэтаў звычайных людзей. Я згадваў Аўгуста Сандара, які стаў вядомы праз сваю кнігу “Твары часу” — у ёй ён сабраў партрэты людзей часоў Веймарскай рэспублікі. Вялізная праца, якая ўключала тысячы выяў ужо напрыканцы 1940-х. Ягоны прыклад мяне моцна ўразіў, і мне хацелася б зрабіць нешта падобнае, але, вядома, у сваёй манеры. Зрабіць партрэт сучаснага грамадства Фінляндыі, карацей.

З серыі "Назіранні". Хельсінкі. 2009 г.

— Дарэчы, можна сказаць, што вы ўжо паклалі пачатак гэтаму даследаванню: партрэты фінскіх прэзідэнтаў — серыя, якая зрабіла вам славу ў краіне…

— Бадай, партрэт прэзідэнта Урхо Кеканена 1976 года — адзін з самых вядомых маіх здымкаў. Але, на жаль, ён не прызнаецца Фінскім музеем фатаграфіі. Так, мне хацелася б працягнуць працу ў гэтым кірунку — сабраць такі каталог твараў сучаснікаў. Знакамітых — палітыкаў, пісьменнікаў, мастакоў, а таксама, паўтаруся, звычайных людзей… Здзейсніць такое вялікае даследаванне. І мне падаецца, што ніхто гэта не зробіць акрамя мяне. Бо большасць хоча быць канцэптуалістамі (усміхаецца).

— Цікава, зараз вы прыгадалі тут Аўгуста Сандара, але яго падыход калекцыі, множнасці — калі партрэтаў тысячы — гэта ўжо цалкам канцэптуальны праект…

— Згодзен, сёння складана вызначыць мяжу паміж формамі, жанрамі. Але я не думаю, што калі Сандар фатаграфаваў людзей, ён разумеў, што гэта — канцэптуалістыка. Ён проста крочыў за сваёй ідэяй. Я ўбачыў у яго серыі штосьці сваё, і потым развіў думку. Навошта, як кажуць, паўтарацца? Ды ўсё ж мой праект складана назваць канцэптуальным, і не лічу яго нават арт-фатаграфіяй. Хоць, магчыма, кагосьці гэта засмуціць. Трэба разумець, што сёння мастацкая фатаграфія ў Заходняй Еўропе і Амерыцы — вялікі бізнес. Аўкцыёны, крытыкі, галерэі фармуюць кошты на пэўныя работы, стылі, аўтараў, моду на іх. Кожны мастак, фатограф, які хоча прасоўваць сябе, мусіць улічваць рух у буйных мастацкіх цэнтрах, вывучаць сучасныя механізмы дзеяння рынку. Але калі вашы работы не трапляюць у прыбытковую плынь, гэта не значыць, што яны дрэнныя. Магчыма, вашы кадры не выклікаюць такога захаплення на сучасным арт-рынку як, да прыкладу, фатаграфіі Гурскі, ці Кевіна Эбоша, які сфатаграфаваў бульбу і прадаў гэту працу за мільён еўра. Але можна знайсці сваё месца і сваю аўдыторыю. Класічная фатаграфія таксама запатрабаваная. Праблема, мабыць, у тым, што вельмі часта крытыкі добра ведаюць гісторыю канцэптуальнага мастацтва, а вось гісторыю фатаграфіі прапускаюць.

— Тым не менш, Хельсінкская школа фатаграфіі — гэта ўжо брэнд, вядомы на міжнароднай арэне. Ён і адкрыў фінскую фатаграфію свету…

— Так, яе значэнне складана недаацаніць. Сёння Хельсінкская школа мае сваю галерэю ў Берліне, яе аўтары прадстаўлены на арт-кірмашах па ўсёй Еўропе. Цімаці Пэрсанс, які зрабіў гэты праект, — вельмі дасведчаны чалавек у плане прасоўвання прадукту на сусветную арт-сцэну.

— А што адносна нацыянальнай ідэнтычнасці? Можна гаварыць пра тое, што развіццё і поспех фінскай фатаграфіі садзейнічаў станаўленню фінскай самасвядомасці?

— Напэўна. Фінляндыя стала незалежнай дзяржавай амаль 100 гадоў таму. У Беларусі і Фінляндыі шмат падобнага ў гісторыі набыцця незалежнасці. Вялікі нацыянальны ўздым мая радзіма перажыла на мяжы XIX і XX стагоддзяў, і значную ролю ў гэтым руху адыграў фінскі фатограф Інха. Ён здымаў пейзажы, Карэлію, якая была крыніцай народнага эпасу. Можна сказаць, мастакі таго часу заклалі трывалы падмурак для фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці.

Другі момант, калі фатаграфія адыграла сваю значную ролю — тыя ж 1970-я, калі быў заснаваны згаданы ўніверсітэт. Мы зрабілі курс фатаграфіі, пачалі вывучаць яе гісторыю, потым фатаграфія як спецыяльнасць з’явілася і ў Мастацкім універсітэце ў Лахці. Удалося выйсці на падтрымку дзяржавай гэтага кірунку, і ўжо ў 1970 годзе фатографы пачалі атрымліваць гранты і стыпендыі. Пазней фатаграфія атрымала свой Дзяржаўны камітэт. Усё гэта, вядома, садзейнічала атрыманню міжнароднай вядомасці, якая напаткала нас у 1990-я. Ды, натуральна, падтрымка фатографаў вылілася ў колькасць работ, публікацый і кніг, якія адлюстроўвалі тое, чым жыве Фінляндыя. Напісанне гісторыі фінскай фатаграфіі, якая злучана з гісторыяй краіны, — таксама працэс, які складана недаацаніць.

— А што можна сказаць пра Фінляндыю сёння?

— Мы сёння знаходзімся ў Еўрапейскім Саюзе, але многія людзі не адчуваюць сабе шчаслівымі, бо Фінляндыя — маленькая краіна, а рэй вядуць у палітыцы гэтага аб’яднання вялікія дзяржавы. Магчыма, так і запаліўся праект з простымі людзьмі, бо гэта магчымасць разабрацца, што, у выніку, сёння з намі адбываецца, што перажывае Фінляндыя… І калі яго скончу, вам не спатрэбіцца задаваць гэта пытанне.

К

“Прывіды” старога тэатра

Гледачоў, калег, карыфеяў сцэны і… прывідаў запрасіў на свята свайго 128-годдзя Магілёўскі абласны драматычны тэатр. Галоўны рэжысёр Саулюс Варнас, вядомы сваёй прыхільнасцю да метафізікі і містыцызму, натхняўся для гэтай пастаноўкі прыгожай тэатральнай легендай: маўляў, у мурах тэатра жывуць душы творцаў — анёлы-ахоўнікі будынку.

Падчас спектакля-канцэрта.

Ролі гасцей з мінулага на спектаклі-канцэрце пад назвай “З днём нараджэння, тэатр!”, які ладзіўся 15 мая, сыгралі акцёры Дзмітрый Дудкевіч, Іван Трус, Аляксандр Палішчук і Аляксей Цыбін. Здані з цікавасцю назіралі за выступленнем сваіх паслядоўнікаў — сённяшніх зорак гэтай сцэны і маладых акцёраў, якія падрыхтавалі яскравыя музычныя і пластычныя нумары, мастацкае чытанне вершаў і прозы. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Васіль Галец некалькі разоў зрываў апладысменты, памайстэрску выканаўшы песні Аляксандра Вярцінскага, а чароўныя Галіна Лабанок і Анжаліка Барчан праспявалі рамансы па-французску. Моцнае ўражанне пакінулі выступленні маладых актрыс Юліі Ладзік і Настассі Іваненка з лірычнымі маналогамі — фрагментам “Аповесці пра Сонечку” Марыны Цвятаевай і мініяцюрай Леаніда Енгібарава “Парасон”. Не толькі проза, але і паэзія гучала ў гэты вечар са сцэны драматычнага тэатра — творы Барыса Пастарнака, Уладзіміра Маякоўскага, Амара Хаяма ў выкананні народнага артыста Беларусі Рыгора Белацаркоўскага і артыста, рэжысёра Уладзіміра Пятровіча, Васіля Гальца, маладых акцёраў Азіза Азімава і Сяргея Васіленкі. Упрыгожаннем імпрэзы стала жывая музыка ў бліскучым выкананні ансамбля “Экспромт-класіка”, што дзейнічае пры тэатры. Галоўны ж рэжысёр, лаўрэат Нацыянальнай тэатральнай прэміі Саулюс Варнас нагадаў, што менавіта тэатр натхняе людзей ісці шляхам духоўнага пошуку.

Дарэчы, спектакль-канцэрт хоць і рыхтаваўся да дня нараджэння тэатра, увойдзе ў сталы рэпертуар — ужо пад іншай назвай. Апроч таго, гледачам прэзентавалі яшчэ адзін прыемны сюрпрыз — невялікую выставу архіўных фатаграфій у арт-фае тэатра. На чорна-белых кадрах — сцэны са спектакляў мінулых гадоў, пачынаючы з 1950-х, а таксама знакамітыя акцёры, якія некалі здабывалі славу тэатру. Сярод іх — Вера Кабатнікава, Юдзіф Гальперына, Сяргей Бульчык, Ніна Фядзяева...

Між іншым, будынак, адкрыты ў далёкім 1888-м годзе, можа па праву лічыцца самым старым у Беларусі, узведзены адмыслова для акцёрскай трупы: сталічны гмах купалаўцаў на два гады маладзейшы. Праўда, уласную трупу Магілёўскі тэатр займеў толькі ў 1928 годзе, праз яго сцэну прайшло некалькі калектываў. Тут ззялі зоркі Фёдара Шаляпіна, Аляксея Рахманінава і Веры Камісаржэўскай. Нават грошы на будаўніцтва збіраліся талакой: гараджане ахвяравалі — хто сціплыя капейчыны, а хто — сотні рублёў.

Вольга СЕМЧАНКА, літаратурны рэдактар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра

Музейны праект-1919

Хто ўпарадкаваў першую экспазіцыю Савецкай Беларусі

Сярод імёнаў музейных дзеячаў Беларусі ёсць адно, якое сёння мала што кажа нават вузкім спецыялістам. Размова ідзе пра мастацтвазнаўцу Усевалада Дзмітрыева, які ў 1919 годзе стварыў Мінскі абласны музей. Гэта менавіта тая ўстанова, адкуль вядзе свой радавод Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

Усевалад Дзмітрыеў. 1910-я.

Дзмітрыеў нарадзіўся ў 1888 годзе ў Санкт-Пецярбургу ў сям'і стацкага саветніка. Вучыўся ў Першай сталічнай гімназіі, дзе праявіліся яго творчыя здольнасці. Іх прызнаннем стала прызначэнне будучага мастацтвазнаўцы дэкаратарам спектакля, які паставілі гімназісты выпускнога курса паводле "Балаганчыка" Аляксандра Блока. Пасля заканчэння гімназіі ён паступіў на юрыдычнае аддзяленне Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, але смерць бацькі ў 1909-м вымусіла праз недахоп грошай спыніць навучанне. Некалькі гадоў былы студэнт зарабляў на хлеб, служачы ад выпадку да выпадку ў дробных канторах.

У гэты ж час Усевалад Дзмітрыеў знаёміцца з яскравымі прадстаўнікамі таго часу — ідэолагам аб'яднання "Свет мастацтва" Аляксандрам Бенуа, а таксама паэтам Міхаілам Кузьміным. Але "адкрыў" дваццацітрохгадовага крытыка ў 1912 годзе галоўны рэдактар "Апалона" Сяргей Макоўскі. За пяць перадрэвалюцыйных гадоў Усевалад Аляксандравіч надрукаваў у часопісе больш за трыццаць артыкулаў, рэцэнзій і нататак па рускім мастацтве, у тым ліку пра Канстанціна Сомава, Мікалая Ге, Валянціна Сярова, Паўла Фядотава і іншых творцаў. Адна з гэтых работ (пра таго самага Сярова) паспела выйсці асобнай кніжкай. Што да тэарэтычных задач, якія крытык ставіў і спрабаваў вырашаць, дык яны многіх раздражнялі: Дзмітрыеў пісаў пра Пятрова-Водкіна, пра Барыса Грыгор'ева, дазваляў сабе пярэчыць мэтрам "Света мастацтва", у першую чаргу — самому Бенуа. Творцы Сярэбранага века, як і таленты іншых эпох, часта аддаваліся ўзаемным крыўдам і групавым канфліктам, адмаўляючыся ад шчырай дыскусіі і абмеркавання праблем. "Мастацкія звады" — так назваў Дзмітрыеў адзін са сваіх артыкулаў на гэту тэму.

У разгар Першай сусветнай вайны Усевалад Дзмітрыеў паспрабаваў пайсці дабраахвотнікам на фронт, але яго забракавала медыцынская камісія. "Як тое ні сумна, але здаецца, пяро — гэта адзіная зброя, якой мне наканавана бразгаць да скону ў славу Радзімы" — іранічна піша ён у лісце да аднаго з сяброў. У 1917-м мастацтвазнаўца, як і многія іншыя футурысты, вітаў спачатку Лютаўскую, а потым Кастрычніцкую рэвалюцыі. Агіда да нядаўняга мінулага ў іх была мацнейшай за боязь магчымых будучых страт.

Узімку 1918 года Усевалад Дзмітрыеў адправіў жонку і малую дачку з паміраючага ад голаду і холаду Петраграда да сваякоў на поўдзень. Сам жа распачаў работу ў наноў створаным аддзеле выяўленчых мастацтваў Народнага камісарыята асветы ў якасці эмісара па справах музеяў і аховы помнікаў. Такая праца вымагала выездаў у камандзіроўкі ў правінцыю — ратаваць нацыяналізаваныя творы мастацтва ў спустошаных сядзібах, а таксама афармляць рэвалюцыйныя святы на месцах. Яго начальнікам быў вядомы мастацкі крытык Мікалай Пунін, у той час — камісар Рускага музея і Эрмітажа. Пад рэдакцыяй Пуніна пры петраградскім аддзяленні Наркамасветы РСФСР выходзіла газета "Мастацтва камуны", якая лічылася "гняздом футурызма". У ёй друкаваліся Уладзімір Маякоўскі, Марк Шагал, Віктар Шклоўскі і іншыя. Прыход Усевалада Дзмітрыева ў іх шэрагі быў адзначаны Мікалаем Пуніным як велізарная перамога. Ён заклікаў маладога калегу адмовіцца ад несвоечасовай тэарэтычнай навуковай працы, бо "натоўп шукае новага, рэзка новага", а гэтае новае могуць даць толькі футурысты, якія імкнуцца ўсталяваць "цэнтралізаваную дыктатуру мастацка-рэвалюцыйнай меншасці". Але Усевалад Аляксандравіч, які да гэтага ўжо паспеў пабываць членам саюза пецярбургскіх мастакоў-футурыстаў і выйсці з яго, меў уласнае бачанне шляхоў развіцця тагачаснага мастацтва.

Першыя камандзіроўкі ў правінцыйныя гарады, дзе пачаліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні, расчаравалі эмісара з Петраграда. Ён быў шакіраваны дрэнным мастацкім густам і непісьменнасцю рускай глыбінкі. Для мастацкай адукацыі мас Дзмітрыеў прапанаваў выкарыстаць традыцыі старажытнарускага мастацтва. Ён, у прыватнасці, згадваў, што старажытныя правінцыйныя майстры ў сваіх храмавых размалёўках падпарадкоўваліся адзінаму канону, іх справа абмяжоўвалася тыражаваннем кананічных сюжэтаў. Падобным чынам, роспіс Палаца працы ў Петраградзе (зроблены, напрыклад, Татлінным) павінен быў, згодна яго прапанове, стаць канонам для аздаблення інтэр'ераў грамадскіх будынкаў правінцыйных гарадоў.





Інтэр'еры і экстэр'ер Абласнога музея ў Мінску. 1919 год.

Па выніках наступных паездак, на пачатку 1919 года ён друкуе ў "Мастацтве камуны" артыкул, які выводзіць яго ў шэраг піянераў савецкага дызайну і прыкладнога мастацтва, якія дасягнулі значных поспехаў на працягу наступнага дзесяцігоддзя. У прыватнасці, Дзмітрыеў піша: "Станковы жывапіс памёр ці, ва ўсякім разе, не важны і не патрэбны... Памёр і футурызм, як апошні прытулак змізарнелага дарэшты індывідуалізму… Мастацтва, жывапіс у тым сэнсе, як яны разумеліся раней, саступаюць месца рамяству. Рамёствы — выраб мэблі, посуду, адзення [...] як сапраўдная жыццёвая творчасць — становіцца падмуркам для новага натхнення, становіцца асновай і сэнсам майстэрства, — а станковы жывапіс і наогул "высокае мастацтва" — становяцца прыкладным, прыдаткам да першага, чэрпаюць у рамястве ўвесь свой вопыт і жыватворны пачатак... Гэта жорсткі, ачышчальны горан, у якім трэба перагарэць сучаснаму мастацтву".

Калі ў лютым 1919-га Усевалад Дзмітрыеў быў накіраваны ў камандзіроўку ў сталіцу БССР з мэтай арганізацыі ў складзе Наркамасветы рэспублікі мастацка-археалагічнага пададдзела і музея, тут ужо дзейнічала ўрадавая пастанова аб нацыяналізацыі рухомай і нерухомай спадчыны. Яна з'явілася юрыдычным падмуркам для дзейнасці новай структуры, куды акрамя камандзіраванага з Петраграда мастацтвазнаўцы, увайшлі восем мінчан, у тым ліку антыквар Замкоў і выкладчык гісторыі мастацтваў Сыркін. За кароткі тэрмін яны ўзялі пад ахову помнікі мастацтва і старасвеччыны, якія знаходзіліся ў памяшканнях урадавых устаноў. Распачалі нацыяналізацыю і вываз у сховішча Наркамасветы каштоўных прадметаў з кватэр заможных гараджан, а таксама сядзіб шляхты. Зрабілі захады па ўзяцці пад ахову і пераўтварэнні ў музей Нясвіжскага замка.

Прыкладна ў той жа час Наркамасветы БССР прыняў рашэнне аб утварэнні на аснове канфіскаваных рэчаў Абласнога музея ў Мінску. Для яго быў адведзены будынак былога Дваранскага схода, скляпенні якога пераабсталявалі пад сховішчы. Загадчыкам музея прызначылі Дзмітрыева, які адначасова выконваў функцыі загадчыка мастацка-археалагічнага пададдзела, захавальнікам — Замкова. Менавіта Дзмітрыеў упершыню сфармуляваў асноўныя погляды новай бальшавіцкай улады Беларусі на музейную справу. Сярод іх трэба падкрэсліць некалькі пазіцый: адносіны да музейных каштоўнасцей як да агульнага набытку, адмаўленне ў праве валодання імі прыватным асобам, утылітарны погляд на гісторыка-культурныя помнікі, чыя эстэтычная каштоўнасць — другасная. Апошняя, "пралеткультаўская", пазіцыя адносна культурнай спадчыны была выкладзена аўтарам у артыкуле, надрукаваным у газеце "Звязда": "… нам зразумела адно: не можа быць ганебнага гандлю і спрэчак з-за гэтых вельмі сумніўных "скарбаў", нельга ўпрыгожваць гэтымі "скарбамі" нашыя палацы, залы і школы, гэтыя "скарбы" трэба абясшкодзіць — сабраць і замкнуць у вязніцы-музеі".

Тое, як выглядаў "вязніца-музей", створаны Усеваладам Дзмітрыевым у Мінску, нам сёння дапамагаюць уявіць фотаздымкі яго экспазіцыі. З іх бачна, што мастацтвазнаўца падчас праектавання прасторы сумяшчаў інтэр'ерны і калекцыйны спосабы паказу жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прадметаў матэрыяльнай культуры. Далейшае развіццё Абласнога музея прыпынілася з перамяшчэннем Наркамасветы ў Вільню пасля абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР. Падчас польскай акупацыі Мінска шмат каштоўных прадметаў з экспазіцыі было вывезена ў Варшаву, а сам музей спыніў працу. Стваральніку ж Абласнога музея пра лёс свайго праекта ў Мінску не было наканавана даведацца ўжо ніколі.

Неўзабаве пасля заканчэння мінскай камандзіроўкі, увесну таго ж 1919 года, Дзмітрыева накіравалі на пасаду супрацоўніка губернскага аддзела народнай асветы ў Пскоў. Праз некалькі дзён пасля яго прыбыцця на месца прызначэння, горад быў захоплены адным з атрадаў Булак-Булаховіча. Пачалася расправа з камуністамі і камісарамі, падчас якой мастацкі крытык (які, дарэчы, не адносіўся ні да першых, ні да другіх) быў расстраляны. Усевалад Дзмітрыеў не дажыў да футурыстычнага ўзлёту, які ўзняў яго паплечнікаў па "Мастацтву камуны" да сусветнага прызнання. Не дажыў ён таксама да бязлітаснай барацьбы з фармалізмам у савецкім мастацтве ў сталінскія часы. А яго тэарэтычныя і практычныя здабыткі ў галіне актуалізацыі мастацкай спадчыны аказаліся надоўга забытыя.

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,
прафесар, доктар гістарычных навук

ф о т а ф а к т

Карты з гісторыяй

У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры напярэдадні Міжнароднага дня музеяў адбылося адкрыццё выставы "Беларускія землі на гістарычных картах XVI — пачатку XXI стагоддзяў".

У Мінску гэтыя прадметы экспануюцца ўпершыню. Усяго прадстаўлена 32 асобнікі з прыватных калекцый, сярод якіх асабліва вылучаюцца: карта Вялікага княства Літоўскага 1595 года, складзеная вядомым еўрапейскім картографам Герардам Меркатарам, "Радзівілаўская карта" 1613 года, карты Польшчы XVI — XVIII стагоддзяў, на якіх зафіксаваны падзелы Рэчы Паспалітай, карты еўрапейскіх частак Расійскай імперыі і іншыя. На кожнай з іх можна пабачыць беларускія землі ў пэўны гістарычны перыяд.

Багата дэкараваныя рамкамі, картушамі, у адпаведнасці з мастацкімі стылямі, што панавалі на час іх складання, карты і атласы можна разглядаць як мастацкія творы, а іх стваральнікаў як мастакоў. Нават колеры фарбаў выкарыстоўваліся ў адпаведнасці з павевамі часу.

Мар'я ОВЭРЧУК,
навуковы супрацоўнік Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры

Фрагмент экспазіцыі.

Як гідрасамалёт ратаваў "Несцерку"

18 мая — 75-я ўгодкі першага паказу "Несцеркі" па творы Віталя Вольскага. Сёння на вялікай сцэне Коласаўскага тэатра адбудзецца юбілейнае прадстаўленне. Перад гледачамі з'явяцца не толькі сучасныя выканаўцы роляў у класічнай пастаноўцы, але і артысты, чый творчы лёс непасрэдна звязаны са спектаклем.

Першы акцёрскі склад спектакля "Несцерка", у цэнтры — рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Навум Лойтар, злева — аўтар п'есы Віталь Вольскі.

Упершыню — у Петразаводску

Май 1941 года. БДТ-2 (цяперашні Коласаўскі тэатр) выпраўляецца на гастролі ў Карэла-Фінскую аўтаномную рэспубліку. Апроч "Лекара мімаволі" Жана-Батыста Мальера, "Ірынкі" Кузьмы Чорнага, "Нашых дзён" Сяргея Герасімава, "Хлопца з нашага горада" Канстанціна Сіманава запланавалі паказаць у Петразаводску і "Несцерку", прэм'ера якога ў Віцебску яшчэ нават не адбылася.

125, 115, 110...

На гэты год прыпадае яшчэ некалькі юбілеяў асоб, якія маюць наўпростае дачыненне да першай версіі спектакля: 125-годдзе з дня нараджэння рэжысёра-пастаноўшчыка "Несцеркі", заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, з 1941 па 1944 гады мастацкага кіраўніка БДТ-2 Навума Лойтара, 115-годдзе з дня нараджэння аўтара п'есы Віталя Вольскага і 110-годдзе аўтара музыкі, кампазітара Ісака Любана.

Што ў "Несцерцы" ад Меерхольда?

Лойтар пачынаў творчую дзейнасць у 1919-м як акцёр і рэжысёр у кіеўскім тэатры-студыі пры яўрэйскай арганізацыі "Культур-ліга". Пасля пераезду ў Маскву ён паступае на вучобу ў вышэйшыя рэжысёрскія майстэрні да Усевалада Меерхольда. З часам іх узаемаадносіны пераходзяць у сяброўства, Лойтар становіцца найбліжэйшым паплечнікам майстра па кіраўніцтве тэатрам. Ад Меерхольда Навум Барысавіч пераймае прынцып кампазіцыі спектакля, яго афармлення, сцэнічную выразнасць, экспрэсіўнасць, манеру кампанаваць масавыя сцэны. Разам з тым, Лойтар імкнецца да рэалістычнага вытлумачэння твора, змагаючыся з умоўным абагульненнем характараў, уласцівым Меерхольду і яго паслядоўнікам той пары. Урэшце праз шэраг разыходжанняў Лойтар пакідае майстра і ў 1930 годзе ўзначальвае Дзяржаўны яўрэйскі тэатр у Харкаве. У 1937-м ён становіцца галоўным рэжысёрам Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра Украінскай ССР у Кіеве, дзе бліскуча ставіць спектакль "Стэмпеню" паводле Шалом-Алейхема. А ў 1940-м Навум Барысавіч пераходзіць у БДТ-2, з якім і звязана ягоная далейшая творчасць. Найвядомыя спектаклі Лойтара ў "віцебскі перыяд" — "Ягор Булычоў і іншыя" Максіма Горкага і "Рэвізор" Мікалая Гогаля.

Першы акцёрскі склад разам з аўтарам п'есы.

Сцэна з сучаснай рэдакцыі "Несцеркі".

А пасля — "Машэка"

Віталь Вольскі, скончыўшы Камуністычны універсітэт імя Леніна, апынуўся ў Віцебску ў якасці дырэктара мастацкага тэхнікума, а пазней — БДТ-2. Праўда, неўзабаве ён зноў вярнуўся ў Мінск. Вольскі — аўтар яшчэ адной п'есы, пастаўленай на коласаўскай сцэне ў 1950-я, — "Машэка".

Сталінская прэмія за музыку

Найбольш кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ісак Любан вядомы слухачу песняй "Бывайце здаровы!" — у свой час яго адзначалі як кампазітара-песенніка, аўтара рамансаў. А ён жа напісаў музыку да шматлікіх спектакляў і кінастужак, скажам, "Гадзіннік спыніўся апоўначы", "Шчасце трэба берагчы", "Палеская легенда" і іншых. За музыку да "Несцеркі" поруч з рэжысёрам Навумам Лойтарам, выканаўцамі цэнтральных роляў Аляксандрам Ільінскім і Цімохам Сяргейчыкам, мастацкім кіраўніком БДТ-2 Паўлам Малчанавым быў узнагароджаны Сталінскай прэміяй II ступені.

Выпадкова атрымалася... опера

Музыказнаўца Дзмітрый Жураўлёў, аўтар кнігі пра Ісака Любана, пісаў: "За даволі кароткі тэрмін ён скончыў у клавіры музыку да п'есы. Здавалася б, музычных нумароў не так ужо і многа, і кожны з іх абсалютна неабходны ў спектаклі. Але калі Ісак Ісакавіч прыняўся за партытуру, то міжволі звярнуў увагу на тое, што добрая траціна п'есы суправаджаецца музыкай. І спектакль, уласна кажучы, вырашаны ім як музычны. Зрэшты, гэта акалічнасць не бянтэжыла ні рэжысёра, ні выканаўцаў галоўных роляў, і толькі некаторыя акцёры жартам скардзіліся, што на сцэну драматычнага тэатра "выпадкова" трапіла "сапраўдная опера". Музыка да спектакля і сапраўды сталася адным з ключавых складнікаў яго поспеху.

Артысты мелі рацыю

Успаміны пра 18 мая 1941 года, дзень першага паказу "Несцеркі" ў Петразаводску, пакінула адна з актрыс тэатра Таццяна Бандарчык. Акурат напярэдадні вагон з касцюмамі знік у дарозе. "Абарвалі" тэлефоны і высветлілі: недзе на далёкай станцыі адбылося крушэнне, і вагон пашкоджаны. Перагрузіць і даставіць касцюмы цягніком можна толькі на трэці дзень. Тады тэатру вылучылі гідрасамалёт. Наступным вечарам у тэатры зноў сабралася публіка, а касцюмаў усё няма. Прапануюць іграць у іншых, але артысты не ўяўляюць, як тое магчыма. Нарэшце, тэлефанаванне: гідрасамалёт прывадніўся нарэшце на Анежскім возеры. Усіх мабілізавалі прасаваць і сушыць касцюмы, звязаныя ў клункі, пакамечаныя, падмоклыя. Неўзабаве спектакль пачаўся. Прыём быў надзвычайны: гледачы не разыходзіліся, віншавалі, казалі, што спектакль уявіць у іншых касцюмах немагчыма.

Калінін паспрыяў?

Пазней "Несцерку" паказвалі ва Уральску, дзе тэатр знаходзіўся ў эвакуацыі. Петразаводскія чыгуначнікі ў знак падзякі за выдатны спектакль пераправілі туды вагон з дэкарацыямі і касцюмамі (гэтым разам без надзвычайных здарэнняў). А ў падмаскоўным Арэхава-Зуеве "Несцерку" пабачыў усесаюзны стараста Міхаіл Калінін. І... быў у захапленні ад пастаноўкі. Магчыма, гэты факт і паспрыяў таму, што ў 1946 годзе яго стваральнікі былі ўзнагароджаны Сталінскай прэміяй.

Малавядомае пра найвядомы спектакль коласаўцаў

Несцерка — Фёдар Шмакаў.

Першы склад — на чвэрць стагоддзя

Першы склад артыстаў трымаўся пад чвэрць стагоддзя. У ім — карыфеі беларускага тэатра: згаданыя вышэй Аляксандр Ільінскі, Цімох Сяргейчык, а таксама Яніна Глебаўская, Анатоль Шэлег і Зінаіда Канапелька.

Пяць "Несцерак"...

Прыкладна з сярэдзіны 1960-х у цэнтральнай ролі ці не да апошніх дзён жыцця выступаў народны артыст СССР Фёдар Шмакаў. Калі ў першым выпадку перад гледачом паўставаў мудры і вельмі абаяльны, дасціпны і пачалавечы прыцягальны народны герой (сама асоба інтэлігентнага і, разам з тым, віртуознага Аляксандра Ільінскага ўзбуйняла гэты вобраз), то ў другога выканаўцы Несцерка быў хутчэй прасцяк, кемлівы, цікаўны, гатовы прыйсці на дапамогу хаця б таму, што ведае, як гэта зрабіць. У народнага артыста Беларусі Яўгена Шыпілы персанаж стаў надзвычай мяккім, пяшчотным, добразычлівым, але ў ім адчуваўся сапраўдны селянін, як кажуць, "ад сахі". У заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Валянціна Салаўёва Несцерка атрымаўся настойлівым, упартым, "сабе на розуме". Цяперашні выканаўца ролі Пятро Ламан іграе вострага на язык, вясёлага, свойскага хлопца.

...пяць Настачак...

Галоўная гераіня Наста ў выкананні народнай артысткі Беларусі Зінаіды Канапелька была сапраўднай лірычнай гераіняй, пяшчотнай, тонкай. У яе наступніцы Людмілы Заграбельнай атрымалася бойкае, здольнае пастаяць за сябе дзяўчо. У Святланы Жукоўскай Наста — вясёлая гарэза, у Наталлі Аладка — сумная і задуменная. Сёння ролю грае маладая актрыса Юлія Цвікі, якая падкрэслівае ўпарты характар Насты, цэльнасць яе натуры.

...тры Юрасі...

Першым выканаўцам ролі яе каханага Юрася быў народны артыст Беларусі Анатоль Шэлег. Ён паказваў зухаватага вясковага прыгажуна. У Пятро Ламана, зацверджанага на гэтую ролю ў 1970-я, атрымаўся менш рашучы і больш меланхалічны герой. Ролю ўнутрана цэльнага, моцнага і мэтанакіраванага хлопца выконвае сёння Арцём Блахін.

...чатыры Мальвіны

Мальвіна ў народнай артысткі Беларусі Яніны Глебаўскай здавалася ўладарнай і сквапнай да бязмежнасці. Больш за ўсё яна хацела патрапіць у асяроддзе панства. Мальвіна Зінаіды Канапелька — паважная, самавітая кабета, што пільна сачыла за ўсімі падзеямі і іх змяненнямі. Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Пісарава грала сялянку, у якой яе паходжанне выдавала і ўнутраную сутнасць. Цяперашняя выканаўца ролі Раіса Грыбовіч падкрэслівае шляхетнасць персанажа. Ейная Мальвіна клапоціцца пра дабрабыт сваёй дачкі, і гэтым тлумачацца многія яе ўчынкі.

Ну і шкаляр...

Жаданым і цікавым для акцёраў быў вобраз шкаляра Самахвальскага. Спярша яго граў народны артыст Беларусі Цімох Сяргейчык. Ён вельмі дакладна прамаляваў партрэт свайго персанажа, які, на думку акцёра, павінен быў адштурхоўваць гледача. У нечым ён нагадваў сатырычных мальераўскіх герояў. У заслужанага артыста БССР Мікалая Цішачкіна шкаляр атрымаўся больш мяккім і смешным: гэтаму спрыялі адметная пластыка, жэсты, рухі акцёра. Міхась Краснабаеў настойваў на заганнасці свайго героя, а Максім Фралоў не быў пазбаўлены вытанчанасці і кранальнасці.

Рэканструкцыя

У 2006 годзе колішнім мастацкім кіраўніком тэатра Віталём Баркоўскім і галоўным мастаком Пятром Анашчанкам была зроблена капітальная рэканструкцыя спектакля. Пад гэта быў вылучаны грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У тым жа годзе спектакль быў паказаны на Міжнародным тэатральным фестывалі ў Яраслаўлі, дзе атрымаў вельмі цёплыя водгукі гледачоў і прэсы.

Падрыхтаваў Юрый ІВАНОЎСКІ, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.
Выставы:
■ **"Героіка і лірыка мінулага стагоддзя"** — рускі жывапіс са збору музея — да 25 мая.
■ Выставачны праект **"Vita–Ludi–Veritas"**, у якім прымаюць удзел тры беларускія мастакі: Уладзімір Тоўсцік, Алена Шлегель і Уладзімір Ганчарук — да 26 мая.
■ Выстава адной карціны. Уладзімір Кожух. **"Белае на чорным. Чорнае на белым"** — да 23 мая.
■ Выстава **"Рэальнасць без падабенства"** да 90-годдзя з дня нараджэння майстра абстрактнага жывапісу, сцэнографа Аляксандра Салаўёва — да 30 мая.
■ Выстава **"Сацыялістычны "сюррэалізм". Нонканфармісцкае мастацтва з калекцыі Андрэя Плясанава"** — з 21 да 31 мая.
■ **"Ноч музеяў-2016"** — 21 мая з 19.00 да 00.00 пройдзе акцыя "Музей учора + заўтра".

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.
■ 21 мая з 18.00 музей запрашае гледачоў на **"Чароўную ноч"**, напоўненую гукамі, фарбамі і эмоцыямі з дзяцінства.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выставы:
■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шляхах гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.
■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — экспазіцыя незвычайных прыбораў і прылад — да 3 ліпеня.
■ Выстава плакатаў часоў Вялікай Айчынная вайны — да 26 мая.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня у дворыку музея.
■ Фотавыстава Наталлі Дораш **"Палешукі"** — да 29 мая.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ПОСТ.Ноч"** у рамках "Ночы музеяў-2016" — 21 мая.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.
Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава твораў Алісы Папунідзі **"Чароўныя сны Алісы"** — да 28 чэрвеня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён – **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Беларускія землі на геаграфічных картах XVI — пач. XXI ст.".**

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
Выставы:
■ **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава прыватнай калекцыі Вікторыі Катарне **"Магія свечак"** — да 27 мая.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Міжнародная выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Фарбы душы"** (унікальныя ўпрыгажэнні, аксэсуары і адзенне ручной работы) — да 29 мая.
■ Выстава **"Таямніцы часу XVIII-XIX стст."** (гадзіннікі ў інтэр'еры) — да 5 чэрвеня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Сляды вайны..."** (збор прадметаў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі з фондавых калекцый музея і ўзоры рарытэтнай тэхнікі з унікальнай калекцыі Аляксея Цікунова) — да 18 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Гарады і мястэчкі Беларусі на паштоўках пачатку XX ст."** — да 12 чэрвеня.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.
■ Выстава **"Скарбы князёў Радзівілаў у скарбніцы Мірскага замка"** — да 28 мая.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Выстава **"Ісці супольна праз усё жыццё"** (да 100-гадовага юбілею вянчання Янкі Купалы і Уладзіславы Станкевіч) — да 18 чэрвеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава твораў Віктара Шматава, Уладзіміра Кожуха, Віктара Барабанцава **"Зямля адчужэння"**, прымеркаваная да 30-й гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, — да 22 мая.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін.Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ Выстава **"Год скульптуры"** Беларускага саюза мастакоў — да 5 чэрвеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX - пачатку XX ст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МѢСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава твораў Уладзіслава Пятручыка **"Маімі вачыма"** — да 29 мая.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
Выставы:
■ Інтэрактыўная выстава з Рыміні (Італія) **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 6 чэрвеня.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 29 мая.
■ Выстава **"Скрыня Пандоры. Фантастычны свет Сяргея Парцянкова"** — да 17 ліпеня.
Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы".**
Выставы:
■ Выстава **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры (фонд мініяцюр) другой паловы XX ст. — да 29 мая.
■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.
Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.
■ Выстава **"Зброя для моцных духам".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
г. Іўе, вул. 17 верасня, 9
тэл. 801595- 2-68-96
■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Яўрэйскі квартал"**, **"Доўгія вёрсты вайны"**.
■ Персанальная выстава ікон Ядзвігі Сянько.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка", паслуга "Дні нараджэння ў музеі".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава твораў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Мінска **"Палітра талентаў"** — з 27 мая да 15 чэрвеня.
■ Выстава **"Мітрапаліт Антоній Суражскі. Жыццё для мяне — Хрыстос"** — з 26 да 28 мая.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выстава **"Таму што..."** (арт-аб'екты і інсталяцыі, створаныя беларускімі мастакамі, дызайнерамі, архітэктарамі) — да 8 чэрвеня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
■ **22 — "Спартак"** (балет у 3-х дзеях) А.Хачатурана.
■ **23 — "Князь Ігар"**(опера ў 2-х дзеях) А.Барадзіна.
■ **24 — "Рамэа і Джульета"** (балет у 3-х дзеях) С.Пракоф'ева.
■ **24 —** вечар памяці народнага артыста СССР Аркадзя Саўчанкі.
■ **25 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
■ **26 — "Вітаўт"** (балет у 2-х дзеях) В.Кузняцова.
■ **27 — "Паяцы"** (опера у 2-х дзеях) Р.Леанкавала.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **21 — "Французскія канікулы"** (тэатральны канцэрт).
■ **23 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **24 — "Адамавы жарты"** (камедыя паводле твораў Ф. Аляхновіча і Л. Родзевіча) С.Навуменка.
■ **25 — "Гульня без правілаў і з невядомай мэтай"** (прэм'ера) А.Андрэева.
■ **26 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.
■ **27 — "Містар Розыгрыш"** (гульні дарослых) С.Кандрашова.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **22 — "Бураціна.BY"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **22 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **23 — "Таемны шлюб. Граф Люксембург"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара.
■ **24 — "Соф'я Гальшанская"** (мюзікл у 2-х дзеях) У.Кандрусевіча.
■ **25 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музыкальная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава.
■ **26 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі.
■ **27 — "Мая цудоўная лэдзі"** (мюзікл у 2-х дзеях) Ф.Лоу.
■ **28 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **21 — "Умка"** Ю.Якаўлева. Пачатак аб 11-й.
■ **22 — "Горад клоўна Піка"** М.Барценева. Пачатак аб 11-й.
■ **28 — "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** Ш.Пяро. Пачатак аб 11-й.